ARCHE Зьмест № 12’06

1. Зьмест / Уводзіны
2. ARCHE :: Галоўная
3. Газавая вайна як спосаб стратэгічнага партнэрства.
4. Мікола Рабчук. «Апошняя дыктатура ў Эўропе» — гэта Захад сур’ёзна?
5. Этан С. Бэргер. Злучаным Штатам патрэбная новая палітыка ў дачыненьні да Беларусі
6. Андрэй Казакевіч. Ідэалягічная інфраструктура беларускае палітыкі
7. Андрэй Хадановіч. Гедройць думае пра Беларусь, альбо Запіскі кантрабандыста
8. Пятрушка Шустрава. Прадажная Беларусь
9. Павал Абрамовіч. Хадановіч і «Люфтганза».
10. Уільям Гібсан. Нэўрамантык
11. Джон Ронсан. Жыцьцё — казка
12. Юры Чавусаў. Раяль у кустах культурнай дыпляматыі

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 12 (52) - 2006**
[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
[image]
12[image]-[image]**2006**
аналітыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі
[image] [image] [image]
[image]

Зьмест

Contents

АНАЛІТЫКА

Круглы стол. Газавая вайна як спосаб стратэгічнага партнэрства
МІКОЛА РАБЧУК «Апошняя дыктатура ў Эўропе» — гэта Захад сур'ёзна?
ЭТАН С. БЭРГЕР Злучаным Штатам патрэбная новая палітыка ў дачыненьні да Беларусі
АНДРЭЙ КАЗАКЕВІЧ Ідэалягічная інфраструктура беларускае палітыкі

ЭСЭІСТЫКА

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ Гедройць думае пра Беларусь, альбо Запіскі кантрабандыста
ПЯТРУШКА ШУСТРАВА Прадажная Беларусь
ПАВАЛ АБРАМОВІЧ Хадановіч і «Люфтганза»

ЛІТАРАТУРА

УІЛЬЯМ ГІБСАН Нэўрамантык
ДЖОН РОНСАН Жыцьцё — казка

РЭЦЭНЗІІ

ЮРЫ ЧАВУСАЎ Раяль у кустах культурнай дыпляматыі

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне на старонцы: 2007/03/03
[image]

[redacted]anwhoknows

Powered by phpBB © 2001, 2005 phpBB Group

Круглы стол Газавая вайна як спосаб стратэгічнага партнэрства

У круглым стале, які адбыўся 18 лістапада, узялі ўдзел палітолаг, выкладчык ЕГУ **Дзяніс Мельянцоў**, эканаміст даследчага цэнтру ІПМ **Аляксандр Чубрык**, эканаміст, намеснік старшыні партыі БНФ **Аляксей Янукевіч**, палітолагі **Юры Чавусаў** і **Зміцер Волкаў** і сябра Бюро Цэнтральнага камітэта Партыі камуністаў Беларускай, галоўны рэдактар газеты «Товарищ» **Сяргей Вазняк**.

Дзяніс Мельянцоў: Паважаныя калегі, прапаную вам абмеркаваць тры блокі пытанняў датычна газавай тэматыкі. Першы: якім чынам эканамічныя наступствы ад магчымага падвышэння коштаў на газ будуць уплываць на палітычную сітуацыю ў Беларусі і ці стварае газавы крызіс новыя магчымасці для змены ўлады. Другі: як газавы крызіс можа адбіцца на вонкавапалітычнай сітуацыі і ці могуць у выніку адбыцца сур'ёзныя геапалітычныя пераўтварэнні ў рэгіёне. І трэці: якія захады могуць зрабіць дэмакратычныя сілы ў новых варунках, каб падвысіць свой уплыў сярод насельніцтва.

Аляксандр Чубрык: Перш за ўсё наконт газавага крызісу і магчымасці ўзяць уладу. Скажам так, што дэмакратычныя палітычныя сілы ўжо даволі доўга чакаюць, што адбудзецца

нейкі крызіс. Я думаю, што гэта чаканне пачалося яшчэ да 2001 года. І што мы бачым? Першы крызіс — гэта 1998—1999 гады. У 1999 годзе нават за афіцыйнай рысай галечы жыло каля 50 % насельніцтва. Я лічу, што большага крызісу сабе цяжка ўявіць. Што тады было зроблена? Нічога не было зроблена. У 2002 годзе, калі амаль палова прадпрыемстваў былі закрытыя, пачала павялічвацца галеча, заробкі не павялічваліся, і была вялікая запазычанасць заработнай платы, калі вельмі хуткімі тэмпамі раслі тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі, рэйтынг А. Лукашэнкі быў самы малы за ўсю гісторыю — менш за 40 % паводле звестак незалежных сацыялагічных інстытутаў. Ізноў нічога не было зроблена.

Я думаю, што чакаць цуда, нейкага крызісу, што ўлада сама прыйдзе ў рукі — не правільна. Трэба шукаць нейкія магчымасці для сябе, для таго, каб зноў большасць насельніцтва пачала лепей ставіцца да сучасных дэмакратычных рухаў. Трэба пачынаць з тых праблемаў, якім не надаецца ўвагі афіцыйнай прапагандай.

Кожны з нас лічыць, што ведае тыя праблемы, якія ёсць у насельніцтва, у розных сацыяльных групаў. Ён ведае, што трэба рабіць так або інакш, каб знайсці выйсце і вырашыць гэтыя праблемы. Але ж, на мой погляд, гэтае веданне не грунтуецца на нармальных сацыялагічных даследаваннях. Гэта першае, з чаго трэба пачынаць. Трэба зразумець, якія ж насамрэч існуюць праблемы. Трэба вызначыць галоўныя сацыяльныя группы, з якімі працаваць, высветліць менавіта іх праблемы. Шляхам апытанняў, фокус-групаў і г. д. Што абыходзіць афіцыйная прапаганда? Гэта пытанне пенсій. Цяпер у афіцыйных структурах востра стаіць пытанне пенсійнай рэформы, але ж нідзе пра гэта не гаворыцца. Гэтая тэма вельмі актуальная для Беларусі ў бліжэйшыя пяць гадоў. Другая праблема — дэмаграфічная, сацыяльная. Ідзе гаворка пра тое, як дзяржава дапамагае шматдзетным сем'ям. Але ж, калі мы паглядзім і параўнуем сацыяльную палітыку, якая праводзіцца ў дачыненні гэтых групаў, мы знойдзем шмат чаго цікавага. Менавіта гэта цікавае павінна адказваць на тыя пытанні, якія задаюць сабе простыя людзі.

Я не лічу, што газавая праблема і цяпер, і праз год-два будзе галоўнай праблемай для простых людзей. Таму што чалавеку непартыйнаму, які не заняты аналізам становішча ў краіне, заўсёды можна сказаць, што газавая праблема — гэта праблема не беларускай эканомікі або палітыкі, а праблема братняй Расіі, якая раптам перастала быць братняй, або праблема нейкіх нашых ворагаў, якія жадаюць нам нашкодзіць. Такія думкі сярод насельніцтва пацвярджаюцца нашымі і не толькі нашымі апытаннямі. Гэта паказвае, што прапаганда дзейнічае. Я лічу, што на гэтым полі апазіцыя не мае шанцу на перамогу, таму што яна не валодае сродкамі, праз якія яна можа пераканаць людзей у сваёй праўдзе. Яна вельмі добра можа граць на іншым полі, на якім афіцыйная прапаганда не можа.

Вось на гэтым полі можна прапанаваць нейкія рашэнні. На маю думку, гэта менавіта нейкія сацыяльныя пытанні, якія абмінае ўлада.

Аляксей Янукевіч: Я хацеў бы закрануць пытанне аб змене ўлады падчас магчымага эканамічнага крызісу. Мы ўсе згодныя, што для Расіі пытанне кошту на энэрганосьбіты, якія яна прадае сваім суседзям, з'яўляецца пытаннем палітычным, а не эканамічным. Ёсць і другое пытанне: ці зацікаўлена Расія ў такім моцным эканамічным крызісе, які б мог пацягнуць за сабой змену ўлады ў Беларусі? Я лічу, што не. Безумоўна, цяпер ідзе брутальны гандаль, жорсткае змаганне за гэтыя кошты. На маю думку, Расія хоча дамагчыся павелічэння свайго эканамічнага і палітычнага ўплыву на сітуацыю ў нашай краіне. Усе вы бачылі, якімі сродкамі яна карыстаецца. Я ўпэўненны, што А. Лукашэнка адпавядае ўсім асноўным інтарэсам Расіі ў Беларусі. Таму гандаль будзе сур'ёзны, ад Лукашенкі будуць патрабаваць саступак, але Расія не дазволіць сітуацыі перарасці ў крызіс. Апазіцыі чакаць гэтага — абсалютна ненадзейны і няправільны шлях.

Што ў нашым, палітычным, разуменні крызіс? Крызіс — гэта калі людзі выходзяць на вуліцу дзеля рэалізацыі сваіх эканамічных патрабаванняў. Не за каштоўнасьці, а за каўбасу. Калі людзі гатовыя выходзіць на вуліцу і выходзяць на вуліцу, то гэты працэс можна ўзначаліць, і калі б аб'яднаныя

дэмакратычныя сілы здолелі гэты працэс узначаліць і скіраваць у патрэбнае рэчышча, тады можна было б казаць пра нейкія рэальныя магчымасці. Але я, напрыклад, не веру, што такое можа адбыцца. І я думаю, што калі спадар Вячорка кажа, што крызіс — гэта цяпер ключавое слова, маецца на ўвазе, што ў палітычным змаганні, якое адбываецца, мы павінны паказваць людзям два шляхі: першы — гэта развіццё сітуацыі пры цяперашняй уладзе, і другі — якая можа быць альтэрнатыва. Паняцце крызісу лагічна звязваецца з далейшым захаваннем А. Лукашэнкі пры ўладзе. Ня веру, што адбудзецца настолькі маштабны крызіс, каб людзі выйшлі на вуліцы. Але там-сям прыкметы крызісу будуць узнікаць. Трэба растлумачваць людзям, што гэтыя праявы пагаршэння сведчаць аб непазбежнасці крызісу, што нас чакае наперадзе, што апынемся ў крызісе, калі не памяняем урада. Але я мяркую, што такога пагаршэння эканамічнага становішча, прынамсі ў першай палове 2007 году, не адбудзецца, каб людзі выйшлі на вуліцы з эканамічнымі патрабаваннямі. Хутчэй за ўсё палітычная сітуацыя захаваецца такая, як ёсць. Нам не варта спадзявацца на крызіс як сродак атрымання ўлады. Трэба працаваць з людзьмі даступнымі метадамі. Але ўсё роўна змена ўлады павінна адбыцца на вуліцах. Таму трэба больш звяртаць увагу на людзей каштоўнаснай арыентацыі.

Юры Чавусаў: Ні для каго не сакрэт, што людзей цяпер выходзіць на вуліцы вельмі мала. Не з'яўляюцца выключэннем нават сакавіцкія падзеі гэтага года. Андрэй Ягораў праводзіў нядаўна аналіз таго, колькі народу выходзіць на вуліцы. Дык вось, пратэстная актыўнасць у гэты выбарчы год не выйшла па-за межы звычайнай перад- і паслявыбарчай актыўнасці.

Аляксандр Чубрык: На конт таго, каго бачыць Расія ў Лукашэнку. Я лічу, што ён хутчэй перашкаджае ёй, чым задавальняе інтарасы. Калі б Расія магла дасягнуць такога становішча, што беларусы запатрабавалі б змены ўлады, то Расіі нашмат прасцей было б давесці беларускаму народу тое, што праблема ў тым, што Лукашэнка не хоча сябраваць з Расіяй і паставіць чалавека, які будзе сябраваць. Але ж Расія не можа гэтага зрабіць, бо Лукашэнка не той чалавек, які проста так адпусціць уладу з рук. І ў гэтым сэнсе, калі б цяпер адбыўся

крызіс, то ў апазіцыі не было б такога шанцу, які быў бы ў Расіі. У гэтым сэнсе Лукашэнка, можа, не шмат каму падабаецца, але ён, гэта ўжо не новая ідэя, выступае як бы гарантам незалежнасці Беларусі з 1996 года і да гэтага часу. Я не лічу, што гэта яго калектыўная роля, але так гістарычна сталася, што ён ім стаў. Паколькі ён не адпусціць улады і не аддасць яе Расеі, то гэта дае шанец для дэмакратычных сілаў на сярэднетэрміновую перспектыву.

Зміцер Волкаў: З аднаго боку, расійскае кіраўніцтва не надта любіць беларускага прэзідэнта, а з іншага — яно не давярае каму-небудзь іншаму. У выпадку, калі да ўлады ў Беларусі прыйдзе іншы чалавек, існуе рызыка змены палітычнага вектара. На сённяшні дзень А. Лукашэнка з'яўляецца адным з нешматлікіх палітыкаў на постсавецкай прасторы, якія, прынамсі, дэманструюць саюзніцкі абавязак. Яшчэ адзін момант. Чаму мы ўсе так упэўненыя ў тым, што насельніцтва жадае чуць нашую рыторыку аб змене сітуацыі, магчымасці крызісу, аб дэмакратычных каштоўнасцях? Можа, так ёсць у Менску, але на ўзроўні рэгіёнаў я гэтага не бачу. Насельніцтва цяпер занятае сваімі пабытовымі праблемамі. Сённяшняя выбарчая кампанія накіраваная толькі на інфармаванне, і таму яна не можа ні да чаго прывесці. Колькасць дэмакратычнага актыву застанецца ў тым жа выглядзе, не адбудзецца ніякага павелічэння. Пасля сакавіцкіх падзеяў я ацэньваю палітычную сітуацыю ў краіне дастаткова песімістычна. Я не бачу ніякіх падстаў для эканамічнага крызісу, бо, з аднаго боку, улада сапраўды дамаглася не толькі ідэалагічнай, але і эканамічнай стабільнасці, а з другога боку, Расія наўрад ці будзе зацікаўлена ў хоць нейкай дэстабілізацыі сітуацыі ў Беларусі. Тыя прэферэнцыя, якія яна тут мае, варта прызнаць дастатковымі ў гэтай сітуацыі. Большага ніхто прапанаваць не можа.

Аляксандр Чубрык: Гэткія разважанні цалкам лагічныя. Толькі тут ёсць адзін нюанс датычна зацікаўленасці Расіі. У Расіі акрамя зацікаўленасці ёсць яшчэ такі панятак, як імперыялізм. Пра зацікаўленасць Расіі мы можам казаць толькі ў тым выпадку, калі мы разглядаем сітуацыю, у якой Расія ўспрымае Беларусь як незалежную краіну. Ніхто там Беларусь

як самастойную незалежную краіну не разглядае. Тое, што Расія цяпер мае прэферэнцыі, разглядаецца не як заслуга прэзідэнта Лукашэнкі, а як нешта, дадзенае Богам. І Лукашэнка насамрэч адбірае частку гэтых прэферэнцыяў, таму што значныя фінансавыя рэсурсы плюс тое, што Беларусь да гэтае пары не ўваходзіць у склад Расіі, як бы супярэчыць Боскай хадзе рэчаў. Таму беларускі прэзідэнт у гэтым сэнсе — вораг Расіі нумар адзін у Беларусі. І ў выпадку дэстабілізацыі сітуацыі, я мяркую, Расія будзе мець нашмат больш рычагоў уплыву на чыноўнікаў і эліты, чым беларуская апазіцыя ці хто-небудзь іншы.

Сяргей Вазняк: Так. У Расіі ідэя імперыялізму на пабытовым узроўні вельмі моцна развіта. Тое, што яны разглядаюць Беларусь і Ўкраіну як геаграфічныя непаразуменні — гэта абсалютна пэўна.

Што датычыць палітычных наступстваў ад падвышэння коштаў на газ, то я мяркую, што для нас, як для апазіцыі, асабліва нічога не нясе. Для беларускай эканомікі, паводле меркавання спецыялістаў, сур'ёзных наступстваў не будзе, а значыць і рэзкага падзення ўзроўню жыцця таксама не будзе. З іншага боку, нават і падзенне ўзроўню жыцця насельніцтва не заўсёды цягне за сабой нелюбоў да ўлады. Многія дыктатарскія рэжымы цудоўна сябе адчуваюць ва ўмовах мабілізацыйнай эканомікі, у коле ворагаў. Так жыве, у прыватнасці, Паўночная Карэя, дзе народ вельмі шчыльна згуртаваўся вакол правадыра. Я думаю, што адзіная сур'ёзная пагроза для Лукашэнкі — гэта незадаволенасць унутры эліты. Тым болей, калі Крэмль усё-ткі знойдзе замену. А ён шукае. І калі знойдзе, то не ў шэрагах апазіцыі, а сярод наменклатуры. Таму ў любым разе нам радавацца няма чаму.

Што б там ні казалі, а ў Расіі ёсць рычагі ўплыву на Беларусь. Ёсць эканамічныя рычагі, ёсць рычагі інфармацыйнага ўплыву, ёсць вонкавапалітычная падтрымка беларускага рэжыму, без якой яму было б ой як цяжка.

Расія, на мой погляд, не бачыць сёння персаніфікаванай замены Лукашэнку. Хаця Лукашэнка для яе таксама дрэнны, я цалкам згодны. Там, па-мойму, пачалі разумець, што гэта міф,

што Лукашэнка сябар Расіі. Мабыць, Крэмль і хацеў бы для надзейнасці паставіць некага з наменклатуры. Не ведаю. Але нельга казаць, што Расія не можа ўплываць на Беларусь.

Аляксей Янукевіч: Я лічу, што Расія мае пэўнае рычагі. Натуральна, самы вялікі — гэта паліўны рычаг. Інфармацыйны? Напэўна, не пагаджуся, паколькі інфармацыйныя каналы цяпер імкнуцца перакрыць. Людзі, аднак, не заўсёды разумеюць, што гэта праграмы не ад імя Расіі, а ад імя Беларусі. Я б яшчэ назваў фактар бяспекі. Тое, што сістэмы бяспекі, я маю на ўвазе дзяржбяспеку і іншыя службы, у вялікай ступені захаваліся з савецкага часу. І гэта стварае сітуацыю дадатковай магчымасці для кантролю і ўплыву з боку Расіі.

Дзяніс Мельянцоў: Такім чынам, мы пагадзіліся, што газавая канфрантацыя і падвышэнне коштаў на газ не выклічуць ніякага сур'ёзнага палітычнага крызісу, які быў бы здольны пацягнуць за сабой змену ўлады.

Існуе яшчэ такі цікавы элемент газавага гандлю з Расіяй, як актывізацыя вонкавапалітычных дзеянняў беларускага ўраду ўва ўсіх кірунках. На працягу апошніх некалькіх месяцаў Беларусь зрабіла шэраг вонкавапалітычных прарываў, якія падаюцца ў сродках масавай інфармацыі як выключна важныя для дасягнення энэргетычнай незалежнасці краіны. Беларускія ўлады шукаюць апоры ў краінах трэцяга свету, спрабуюць адыгрываць больш значную ролю ў такіх антыамерыканскіх арганізацыях, як Рух недалучэння. Ці ёсць гэтыя дзеянні праявай фармавання альтэрнатывы расійска-беларускім саюзным стасункам, ці гэта проста прапагандысцкія захады з мэтай стварыць больш зручныя для Беларусі перамоўныя пазіцыі?

Юры Чавусаў: Хацеў бы адзначыць, што ідзе фармаванне не толькі вялікай дугі вонкавай палітыкі, якая складаецца з Кітая, Паўднёвай Афрыкі і іншых. Цяпер і сярод нашых суседзяў ствараецца падобная дуга ці апора. Утвараюцца нейкія пралукашэнкаўскія блокі ці палітычныя сілы, як партыя Лепера ў Польшчы. Яны з'яўляюцца ў краінах, у якіх абсалютна не чакалі падобных дзеянняў. Літва выступае супраць выключэння

Беларусі з сістэмы гандлёвых прэферэнцыяў. Пры гэтым яна яшчэ дапамагла здабыць голас Італіі.

Разам з гэтым, у Беларусі з'явілася нарэшце вонкавая палітыка, цікавая, і якую можна аналізаваць.

Зміцер Волкаў: Я мяркую, што такая змена вектара на самай справе ніякай зменай не з'яўляецца. Паколькі спробы Лукашэнкі выйсці ў свет не супярэчаць ягоным дачыненням з Расіяй. Іншая справа, што тут магчымая нейкая паліттэхналагічная гульня, калі Расіі, напрыклад, не выгадна самастойна выходзіць на трэція краіны. Яна рыхтуецца ўступіць у СГА, яна абвяшчае, што яна блізкая да еўрапейскіх рынкаў. І функцыі такога агента, такім чынам, выконвае Беларусь.

Аляксандр Чубрык: Я згодны, што гэты новы вектар не супярэчыць дачыненням з Расіяй. Наконт еўрапейскіх кірункаў вонкавай палітыкі, то тут, я думаю, палітыка будзе мяняцца ў бліжэйшыя гады. І вось цяпер гэта выглядае як дэманстрацыя Расіі таго, што Беларусь можа скіравацца зусім не ў той бок, куды хоча Расія.

Юры Чавусаў: У мяне складаецца такое перакананне, што адбываецца натуральны працэс: любы рэжым, які кіруе суверэннай дзяржавай, будзе вымушаны вырашаць пэўныя праблемы. І так складаецца, што інтарэсы Менску супадаюць з інтарэсамі суседніх краінаў. І палітыкі, якія сядзяць у Браціславе, Варшаве, іншых сталіцах, яны бачаць, што які б рэжым тут не кіраваў, ён мусіць рабіць пэўныя крокі. Знаходзяцца кропкі супадзення інтарэсаў. І, напэўна, пытанне паліўна-энергетычнага комплексу з'яўляецца адной з такіх кропак.

Зміцер Волкаў: Тут яшчэ магчымы варыянт, калі Лукашэнка грае на еўрапейскім полі, улічваючы антыамерыканскія настроі ў самім Еўрасаюзе.

Аляксандр Чубрык: Ну, яшчэ проста таму, што гэта нармальна, каб краіна, якая геаграфічна належыць да Еўропы, таксама была еўрапейская. Тут будуць працаваць еўрапейскія чыноўнікі, з'явіцца шмат новай цікавай працы, якую яны ўжо

перарабілі для іншых краінаў. Гэта ж нармальны працэс. Нават яны б і з Лукашэнкам працавалі, калі б ён крышачку змяніўся, зрабіў пэўныя крокі для паляпшэння стасункаў з Еўропай. Я думаю, гэта прыйдзе. Бо Еўропа — гэта не Штаты.

Дзяніс Мельянцоў: Ці дае новая вонкавапалітычная сітуацыя ў звязку з магчымай эканамічнай нестабільнасцю нейкія новыя магчымасці для дэмакратычных сілаў? Можа, было б магчыма скарыстаць хоць нешта для палітычнай працы?

Аляксей Янукевіч: Я лічу, што ў нас такой пакрокавай стратэгіі быць не можа. Каб мы зрабілі крок і замацаваліся на нейкім рубяжы, потым зрабілі яшчэ крок і зноў замацаваліся. У нас такога не будзе. У нас або адразу адбудзецца калапс усёй сістэмы, або ніхто нідзе не замацуецца. Калапс можа выклікаць толькі масавы выхад людзей на вуліцы. А гэта можа адбыцца толькі ў двух выпадках: па-першае, калі пад пагрозу будзе пастаўлена рэальная незалежнасць дзяржавы, або, па-другое, мабілізацыя людзей, якія маюць каштоўнасную арыентацыю, паколькі, як мы пагадзіліся, трэці варыянт, калі людзі выходзяць, таму што не атрымліваюць заробку і ім няма чаго есьці, у бліжэйшай перспектыве нерэальны. Мне здаецца, што нам трэба максімальна працаваць з людзмі з каштоўнаснымі арыентацыямі.

Аляксандр Чубрык: Заўсёды кажуць, што ёсць электарат, які прагаласуе, ёсць і той, які не прагаласуе, а ёсць балота, з якім трэба працаваць. У Беларусі такога балота няма. Ёсць тыя, хто «за», і тыя, хто «супраць». Ёсць каштоўнасны электарат прынцыповы, з якім працуй, не працуй, а яны прыйдуць і прагаласуюць супраць Лукашэнкі. Згодзен з тым, што газавы крызіс не стварае ніякіх новых магчымасцяў. Справа ў тым, што трэба радыкальна мяняць стратэгію, працаваць на пазітыўнае ўспрыняцце апазіцыі як нейкай сілы, якая можа прапанаваць канструктыўныя рэчы, а менавіта вырашэнне праблемаў насельніцтва. Бо насельніцтва цяпер не ведае, што сабой уяўляе апазіцыя, і якім чынам яна можа вырашыць праблемы людзей. У той жа час яны ведаюць, што дзяржава вырашае іх. Калі людзям сказаць, што мы таксама можам вырашыць вашыя праблемы, а не толькі дзяржава, вось гэта яны зразумеюць. А

тыя людзі, якія каштоўнасна арыентаваныя, ім можна наогул нічога не абяцаць, бо яны ўжо зрабілі свой выбар.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2007/02/10
[image]

МІКОЛА РАБЧУК вядучы ўкраінскі публіцыст і пісьменьнік. Вялікі сябар Беларусі. Рыхтуецца выданьне кнігі ягонай эсэістыкі на беларускай датычна беларускай мове.

Мікола Рабчук «Апошняя дыктатура ў Эўропе» — гэта Захад сур’ёзна?

Агульнавядомая ісьціна, што Беларусь — «апошняя дыктатура ў Эўропе», шмат кажа пра сутнасьць беларускага рэжыму. Яна вымагае выразна акрэсьленай маральнай пазыцыі датычна дыктатуры, але мала чым дапамагае ў вызначэньні практычнай палітыкі, якую можна і трэба эфэктыўна ажыцьцяўляць у дачыненьні да гэтай краіны. Па-першае, нават калі б палітыка на сто адсоткаў засноўвалася на маральных каштоўнасьцях і ідэалах, усё адно было б складана ўвесьці жорсткія палітычныя і эканамічныя санкцыі супраць уладаў і пры гэтым не закрануць шырокага грамадзтва. Па-другое, наўрад ці магчыма падтрымліваць грамадзянскую супольнасьць, заахвочваць іншадумства і спрыяць трансфармаваньню (ц)і падзеньню рэжыму-ізгоя, калі ў адказ на міжнародную ізаляцыю ён увядзе гэткую ж ізаляцыю знутры і зьвернецца да палітыкі аўтаркіі і абмежаваных кантактаў зь іншымі дзяржавамі-ізгоямі. Па-трэцяе, палітыка Захаду датычна рэжымаў-ізгояў ніколі не была і наўрад ці ў агляднай будучыні стане скаардынаванай, пасьлядоўнай і цалкам заснаванай на маральных прынцыпах. У ёй насамрэч заўсёды было і яшчэ доўга будзе багата апартунізму, партыкулярызму, сэпаратных змоваў, крывадушнасьці, падвойных стандартаў і іншай брыды, якую эўфэмістычна называюць *Realpolitik*.

Вядома, няпроста знайсьці належную раўнавагу паміж усімі гэтымі фактарамі і вызначыць аптымальную лінію. Але неабходна дакладна трымацца двух найважнейшых патрабаваньняў. Па-першае, грамадзянская супольнасьць на Захадзе павінна ціснуць на свае ўлады і прыватны бізнэс, каб яны праводзілі ў дачыненьні да недэмакратычных рэжымаў больш пасьлядоўную і менш крывадушную палітыку. Грамадзтву нельга трываць цынічных заяваў, што робяць палітыкі і вядомыя журналісты, кшталту таго «мудрага» назіраньня, што зрабілі «French News» напярэдадні парлямэнцкіх выбараў ва Ўкраіне і прэзыдэнцкіх — у Беларусі: «Ад Балтыйскага да Чорнага мора Расея твар у твар сутыкаецца з НАТО ці з прэтэндэнтамі на ўваходжаньне ў Альянс. І яна, як акупаваная краіна, непакоіцца за сваю будучыню. Парадаксальна, але ў гэтай сытуацыі найлепшым (sic!) выйсьцем для народаў абедзьвюх краінаў (г. зн. Беларусі і Ўкраіны. — **М. Р.**), прынамсі, у кароткатэрміновай пэрспэктыве, было б прагаласаваць супраць заходніх тэндэнцыяў».

Па-другое, санкцыі супраць краінаў-«нягоднікаў» мусяць быць абмежаваныя і цьвёрда вызначаныя, а санкцыі супраць афіцыйных асобаў — шырокія і гнуткія. Асноўны і, напэўна, самы эфэктыўны мэханізм пакараньня «праблемных» чыноўнікаў — адмовы ў візах і замарожваньне банкаўскіх рахункаў. У адказ на кожнае парушэньне правоў чалавека, запалохваньне апазыцыі, кожнае парушэньне закону міліцыяй, судамі, мытнымі службамі і г. д. урады заходніх краінаў павінны ўносіць у «чорны сьпіс» канкрэтныя імёны канкрэтных чыноўнікаў, якія парушылі закон. Беззаконьне ў Беларусі — не безыменнае, і чыніць яго не адзін Лукашэнка. Сьпіс чыноўнікаў-ізгояў мусіць папаўняцца штодзённа, пачынаючы ад самых вярхоў і да найніжэйшых прыступак герархіі. Больш за тое, паколькі найвышэйшыя афіцыйныя асобы Беларусі адкрыта хваляцца, што могуць абысьці санкцыі, зрабіўшы сабе новыя дакумэнты з фальшывымі імёнамі, вельмі пажадана было б увесьці біямэтрычны кантроль.

Вядома, скаардынаваны, пасьлядоўны ціск міжнароднай супольнасьці — не адзіны сродак, які можа ўрэшце паспрыяць

зьмене рэжыму, але, як я паспрабую давесьці далей, ён можа аказацца самым эфэктыўным і лёгка ажыцьцяўляльным.

ТРЫВАЛАСЬЦЬ АЎТАРЫТАРНЫХ РЭЖЫМАЎ

Лукан Ўэй у шэрагу артыкулаў зрабіў прарыў у вывучэньні шляхоў разьвіцьця розных аўтарытарных рэжымаў з пэўнай доляй палітычнай канкурэнцыі і пазначыў тры фактары, ад якіх у вялікай ступені залежыць лёс рэжыму: 1) моц дзейнага кіраўніка дзяржавы, 2) зьяднанасьць і моц апазыцыі і 3) міжнароднае асяродзьдзе. У сваім досьледзе Ўэй зыходзіць зь меркаваньня, пацьверджанага эмпірычна, што «дзейныя кіраўнікі дзяржавы пры аўтарытарных рэжымах з пэўнай доляй палітычнай канкурэнцыі хочуць захаваць сваю пасаду і дзеля гэтай мэты могуць пайсьці на незаконныя прыёмы (напрыклад, фальсыфікацыю выбараў і разнастайныя рэпрэсіі)». Ўэй прапанаваў мадэль, якая ўсебакова раскрывае ўзаемадзеяньне трох згаданых фактараў і падрабязна тлумачыць, «чаму некаторыя аўтарытарныя рэжымы з пэўнай доляй палітычнай канкурэнцыі, сутыкнуўшыся з крызісам, дэмакратызуюцца, а іншыя захоўваюць стабільнасьць ці ўмацоўваюць аўтарытарызм». Гэтая мадэль дае дасьледчыкам напаўаўтарытарных рэжымаў выдатны інструмэнт, каб аналізаваць верагодныя варыянты разьвіцьця падзеяў у адпаведных краінах і выпрацоўваць належныя палітычныя рэкамэндацыі.

З гледзішча Ўэя, моц дзейнага кіраўніка дзяржавы характарызуецца трыма вельмі важнымі для жыцьцяздольнасьці рэжыму паказьнікамі: адзінствам эліты, здольнасьцю да прымусу і кантролем над выбарамі. Адзінства эліты азначае ступень дысцыплінаванасьці і адданасьці, якой найвышэйшая выканаўчая ўлада можа патрабаваць ад астатняй дзяржаўнай эліты. Здольнасьць да прымусу паказвае, наколькі ўлада ў стане кантраляваць і ўдушаць апазыцыйныя сілы. Дзеля гэтага патрэбныя сыстэма цікаваньня і мэханізм рэпрэсіяў, а таксама эфэктыўны кантроль над імі. Кантроль над выбарамі характарызуе здольнасьць улады атрымліваць перамогі на выбарах, спалучаючы мабілізацыю выбарцаў і

фальсыфікацыі. Дзеля гэтага неабходная арганізацыйная структура — афіцыйная ці неафіцыйная партыя ўлады.

Моц апазыцыі вымяраецца паводле двух крытэраў: зьнітаванасьці і мабілізацыйнага патэнцыялу. Зьнітаванасьць азначае найперш здольнасьць апазыцыі аб'яднацца ў шырокую антыаўтарытарную кааліцыю і ня даць уладзе зьдзейсьніць прынцып «падзяляй і валадар». Мабілізацыйны патэнцыял паказвае, наколькі апазыцыя ў стане арганізаваць грамадзянаў на выступленьні супраць улады. Гэты чыньнік залежыць ад сілы апазыцыйных партыйных арганізацыяў, моцы і незалежнасьці грамадзянскай супольнасьці (асабліва працоўных, студэнцкіх і праваабарончых арганізацыяў) і ступені ўзаемадзеяньня паміж структурамі грамадзянскай супольнасьці і палітычнай апазыцыяй.

Усе пералічаныя складнікі маюць надзвычайную важнасьць, бо, як адзначае іншы экспэрт, для перамогі апазыцыі пры напаўаўтарытарным рэжыме «патрабуецца нашмат вышэйшы ўзровень мабілізацыі, адзінства, навыкаў і гераізму, чым зазвычай у дэмакратычных умовах»[1]. Часта дзеля перамогі таксама неабходнае міжнароднае назіраньне і ўмяшаньне, каб папярэдзіць або выявіць і абвясьціць незаконнымі выбарчыя махінацыі і фальсыфікацыі з боку аўтарытарнага рэжыму. Таму трэцім фактарам, ад якога залежыць зьмена ці захаваньне рэжыму, называецца міжнароднае асяродзьдзе, ці, дакладней, уплыў Захаду.

Стывэн Левіцкі і Лукан Ўэй даводзяць, што па заканчэньні халоднай вайны дзякуючы сувязям з Захадам захавалі аўтарытарызму абыходзіцца даражэй, а эліта атрымлівае дадатковыя моцныя стымулы гуляць паводле дэмакратычных правілаў. Дасьледчыкі вылучаюць ва ўплыве Захаду тры паказьнікі: зьвязанасьць зь ім і ягоныя падважнікі ўнутры краіны. На іхны погляд, зьвязанасьць з Захадам мае на ўвазе геаграфічную набліжанасьць, эканамічную інтэграцыю (рэальную і пажаданую), ваенныя альянсы, патокі міжнароднай дапамогі, ахоп міжнароднымі СМІ, сувязі зь міжнароднымі НДА і зь іншымі наднацыянальнымі структурамі, эліту, якая працавала б у міжнародных арганізацыях (ц)і атрымала б

[1] Diamond, Larry Jay. Thinking about Hybrid Regimes // Journal of Democracy. Vol. 13. 2002. No. 2. P. 24.

адукацыю ў заходніх унівэрсытэтах. Падважнікі ўзьдзеяньня, як мяркуюць Левіцкі і Ўэй, паказваюць, наколькі ўрады заходніх краінаў і міжнародныя арганізацыі здольныя ўплываць на недэмакратычныя рэжымы. Бясспрэчна, тыя будуць больш падатлівыя, калі залежаць ад Захаду ў эканамічным (ц)і вайсковым пляне.

Абмаляваная мадэль дапамагае вытлумачыць разьвіцьцё падзеяў практычна ва ўсіх посткамуністычных краінах як вынік складанага ўзаемадзеяньня згаданых трох фактараў. Гэтую мадэль можна таксама выявіць як змаганьне аўтарытарнай дзяржавы і грамадзянскай супольнасьці ў пэўным міжнародным асяродку, які мае каталізацыйны эфэкт. У рамках гэтай канцэпцыі прасьцей зразумець прычыны пасьпяховых дэмакратычных пераўтварэньняў у Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе і краінах Балтыі: там грамадзянская супольнасьць аказалася дастаткова моцнай, каб разбурыць ленінісцкую дзяржаву і перайсьці да лібэральнай дэмакратыі. Гэтаксама робіцца зразумелым, чаму не ўдаліся дэмакратычныя пераўтварэньні ў Сярэдняй Азіі: там ня склалася амаль ніякай грамадзянскай супольнасьці. І нарэшце, прапанаваная Левіцкім і Ўэем мадэль дазваляе асэнсаваць працэсы на Балканах і ў заходніх рэспубліках былога СССР як працяглую барацьбу двух аднолькава моцных, ці, дакладней, аднолькава слабых, супернікаў: разладжанай аўтарытарнай дзяржавы і слаба разьвітай грамадзянскай супольнасьці.

Апошнія два прыклады — Балканы і заходнія постсавецкія рэспублікі — самыя складаныя, а значыць, і самыя цікавыя з аналітычнага гледзішча. У прыватнасьці, пры іх супастаўленьні выяўляецца роля заходняга ўплыву — вельмі станоўчая ў балканскім выпадку і досыць нэўтральная ці адмоўная на захадзе былога СССР. Варта нагадаць, што ў першай палове 1990-х усе гэтыя краіны мелі вельмі блізкія паказьнікі дэмакратычнага разьвіцьця. Фактычна ў той час заходнія рэспублікі былога СССР нават апярэджвалі посткамуністычныя балканскія краіны[2].

Усе гэтыя адносна адкрытыя для палітычнай канкурэнцыі рэжымы паўсталі напрыканцы 1980-х — у пачатку 1990-х, то шчо гадовыя

[2] Гл.

пераважна ў выніку рэарганізацыі *anciens regimes* (старыя рэжымаў), а не перамогі моцнай і рашучай грамадзянскай супольнасьці. Ва ўсіх згаданых краінах працягвала вельмі старая эліта, мала прыхільная да дэмакратыі, ім усім бракавала гістарычнай традыцыі дэмакратыі, паўсюль была слабая грамадзянская традыцыя і прававая дзяржава. Аднак перад балканскімі дзяржавамі ў доўгатэрміновай пэрспэктыве ў рамках пагадненьняў аб стабілізацыі і супрацоўніцтве адкрывалася сяброўства ў Эўразьвязе. Урэшце яны ўзьняліся паводле паказьніка дэмакратычнага разьвіцьця ад «нетрывалага аўтарытарызму» да «нетрывалай дэмакратыі». Між тым эўрапейскія рэспублікі былога СССР ня мелі стымулу ў выглядзе пэрспэктывы далучыцца да Эўразьвязу, і ў другой палове 1990-х гг. яны пасунуліся ў супрацьлеглым кірунку — ад «нетрывалай дэмакратыі» да «нетрывалага» — пакуль — аўтарытарызму. Прыведзеныя прыклады толькі пацьвярджаюць ранейшыя назіраньні шмат каго з экспэртаў:

Пераўтварэньні пры дакладнай пэрспэктыве інтэграцыі ў Эўропу, безумоўна, больш пасьпяховыя і бясьпечныя, чым безь яе. Рэч тут ня толькі ў павелічэньні замежнай дапамогі і наўпроставых інвэстыцыяў, хоць абодва гэтыя чыньнікі таксама вельмі важныя. Магчымасьць далучыцца да Эўразьвязу зьмяняе палітычны клімат у краінах-прэтэндэнтах, беручы верх над нацыяналістычнымі настроямі і прываблiваючы эліту амаль з усіх партыяў[3].

Умовы, што ставіць Эўразьвяз прэтэндэнтам, прынцыпова розьняцца ад іншых, менш пасьпяховых формаў міжнароднага ціску… Адрозна ад усіх іншых заходніх дзяржаваў і міжнародных арганізацыяў, Эўразьвяз патрабуе поўнага выкананьня дэмакратычных нормаў і мае шырокую і высокаарганізаваную сыстэму маніторынгу. Мабыць, самае важнае ў тым, што, адрозна ад звычайных палітычных умоваў, перавагі ўваходжаньня ў Эўразьвяз (рэальныя і ўяўныя) дастаткова вялікія, каб прымусіць шырокія групы элітнай ці на далёкасяжныя саступкі. У выніку такія краіны, як Румынія, ня менш абцяжараныя посткамуністычнай спадчынай, дасягнулі значных посьпехаў у дэмакратызацыі. Эўразьвяз дасюль сур’ёзна не разглядаў Украіны як кандыдата на ўступленьне. Аднак калі б гэта адбылося, шанцы дэмакратыі ва

[3] Mongiu-Pippidi, Alina. Beyond the New Borders // Journal of Democracy, Vol. 15. 2004. No. 1. P. 50.

Ўкраіне рэзка ўзрасьлі б[4].

І ўсё ж шляхі разьвіцьця заходніх рэспублік былога СССР у другой палове 1990-х гг. істотна разышліся ня толькі ў параўнаньні з Балканамі, але і між сабою. На пачатку дзесяцігодзьдзя ўсім чатыром краінам: Украіне, Беларусі, Малдове і Расеі — была ўласьцівая адносная адкрытасьць дынамічнай палітычнай канкурэнцыі. У выніку ва ўсіх, апроч Расеі, адбыліся электаральныя рэвалюцыі. (У Расеі ж пасьля дапусьціў Ельцын, арганізаваўшы антыпарлямэнцкі путч і перапісаўшы Канстытуцыю.) Аднак наяўнасьць палітычнай канкурэнцыі абумоўлівалася «ў значна меншай ступені разьвітасьцю грамадзянскай супольнасьці, моцнымі дэмакратычнымі інстытутамі ці дэмакратычнасьцю ідэалогіі, і ў значна большай ступені — *няздольнасьцю дзейных гульцоў дзяржавы захаваць уладу і засяродзіць у сваіх руках палітычны кантроль*, падтрымліваючы адзінства эліты, узяўшы пад свой кантроль выбары і падпарадкаваўшы сабе СМІ (ц)і ўжываючы супраць апанэнтаў сілу». Пэўная ступень канкурэнтнасьці ў палітыцы перадусім сталася вынікам раптоўнага развалу СССР, так што аўтарытарныя кіраўнікі засталіся без арганізацыі, навыкаў і фінансавых сродкаў, неабходных, каб захаваць уладу (ц)і засяродзіць у сваіх руках палітычны кантроль[5].

Іншымі словамі, постсавецкія рэжымы ў гэтых краінах сфармаваліся ня столькі ў барацьбе за дэмакратыю, колькі кіраўнікі дзяржавы імкнуцца збудаваць больш плюралістычныя інстытуты, колькі празь нязьдзейсьненасьць аўтарытарных праектаў. Ўэй вельмі трапна назваў падобныя рэжымы «плюралізм паводле змоўчаньня» — гэтая форма палітычнай канкурэнцыі ўласьцівая слабым дзяржавам:

Плюралізм паводле змоўчаньня назіраецца ў краінах, дзе палітычная канкурэнцыя захоўваецца ня дзякуючы асьведчанай дэмакратычнасьці лідэраў ці моцы актыўнага грамадзтва, а таму што ўрад занадта разьяднаны, а дзяржава — занадта слабая, каб увесьці аўтарытарнае кіраваньне ў дэмакратычным міжнародным асяродку. У падобных сытуацыях лідэрам бракуе ўладных паўнамоцтваў і каардынацыі дзеяньняў, каб не даць сёньняшнім хаўрусьнікам стаць заўтрашнімі канкурэнтамі, каб узяць пад кантроль заканадаўчую ўладу, увесьці цэнзуру,

[4] Way L. The Sources and Dynamics of Competitive Authoritarianism in Ukraine // Journal of Communist Studies and Transition Politics. Vol. 20. 2004. No. 1. P. 15.

[5] Way L. Authoritarian State Building and the Sources of Regime Competitiveness in the Fourth Wave. The Cases of Belarus, Moldova, Russia, and Ukraine // World Politics. Vol. 57. 2005. No.

пасьпяхова маніпуляваць вынікамі выбараў ці ўжываць сілу супраць палітычных апанэнтаў. Гэткія краіны апынаюцца ў парадаксальным становішчы: тая ж слабасьць дзяржавы і разьяднанасьць ураду, што спрыяе плюралізму, таксама замінае эфэктыўнаму кіраваньню і ў доўгатэрміновай пэрспэктыве можа паставіць пад пагрозу станаўленьне трывалай дэмакратыі.

Аднак зь цягам часу постсавецкая эліта завалодала значнымі багацьцямі празь ценявую прыватызацыю і іншыя сумнеўныя зьдзелкі. Яна навучылася маніпуляваць выбарамі, СМІ і палітычнымі апанэнтамі. Слабасьць дзяржавы яна паступова ператварыла ў своеасаблівую моц, пад якой найперш маюцца на ўвазе мэтады і маштабы прымусу.

Каб зразумець, што ў гэтай перамене — сапраўдная сутнасьць «трансфармацыяў», трэба прыгадаць, што слабасьць постсавецкіх дзяржаваў была вынікам ня столькі адсутнасьці па распадзе СССР адпаведных структураў, колькі поўнай разладжанасьці ўсіх савецкіх інстытутаў, успадкаваных постсавецкімі рэспублікамі. Усе гэтыя інстытуты: парлямэнты і ўрады, мясцовыя саветы і выканаўчыя камітэты, суды і мытня, міліцыя і службы бясьпекі — адыгрывалі другасную ролю ў параўнаньні з рэальным цэнтрам улады, які прыводзіў у дзеяньне ўсю сыстэму, прымушаў яе працаваць, хоць і неэфэктыўна. Усе важныя рашэньні прымаліся камуністычнай партыяй. Яна ж распачынала ўсе перамены, вымагала адданасьці і паслушэнства ад усіх падначаленых. Калі напрыканцы перабудовы ейная ўлада аслабела, сталася відавочнай недзеяздольнасьць ленінісцкай дзяржавы. Няўдалы камуністычны путч і канчатковы сыход партыі з палітычнай арэны пакінулі камуністычную дзяржаву безь яе рухальнай сілы і зрабілі развал Савецкага Саюзу непазьбежным.

Успадкаваўшы недзеяздольныя аскепкі недзеяздольнай імпэрыі, мясцовая эліта постсавецкіх рэспублік мела выбар: або збудаваць новыя дзяржаўныя інстытуты, заснаваныя на вяршэнстве закону, дэмакратычных працэдурах і арганізацыі грамадзтва, або ажывіць разладжаныя квазіінстытуты ленінісцкай дзяржавы пры дапамозе іншых нефармальных

мэтадаў і напаўзаконных структураў. Першы варыянт адназначна абралі толькі дзяржавы Балтыі. Усе астатнія постсавецкія рэспублікі пайшлі другім шляхам. На зьмену Цэнтральным Камітэтам Камуністычнай партыі зьявіліся прэзыдэнцкія адміністрацыі, а прадстаўнікі прэзыдэнта — «губэрнатары», — маючы ў сваім падпарадкаваньні аналягічны апарат, перанялі ролю мясцовых камуністычных бонзаў. Каб відазьмененая сыстэма запрацавала, патрабавалася толькі адно.

Ценявая ўлада камуністычнай партыі палягала на камуністычнай ідэалёгіі, абавязковай для ўсіх, хто займаў больш ці менш значныя пасады (ц)і імкнуўся ўзьняцца па сацыяльнай лесьвіцы. Ідэалёгія была дзейснай прыладай дзяржаўнага кантролю, бо «ідэалягічны шантаж» дазваляў дамагацца адданасьці сыстэме ад любога падначаленага. За постсавецкімі безыдэалягічнымі рэжымамі дасягаць адданасьці даводзілася іншымі сродкамі — часткова, як зазвычай, хабарам і ўлучэньнем у сыстэму, часткова пры дапамозе новага віду шантажу — эканамічнага, абавязанага сваім зьяўленьнем прыйсьцю алігархічнага капіталізму.

ЗЬВЯЗАНАСЬЦЬ З ЗАХАДАМ І АДСТУПНІЦТВА ЭЛІТЫ

Большасьць дасьледчыкаў згаджаецца, што ў краінах са слабаразьвітай грамадзянскай супольнасьцю і кволымі дэмакратычнымі традыцыямі ўсе кардынальныя зьмены наўпрост альбо ўскосна абумоўленыя разьяднанасьцю або расколам унутры аўтарытарнай уладнай групоўкі. Як адзначае Ўэй, «адступніцтва эліты — істотны складнік плюралізму паводле змоўчаньня»; «моцна разьяднаная эліта найхутчэй перашкодзіць умацаваньню аўтарытырызму, бо кантроль дзейнага кіраўніка дзяржавы над падпарадкаванымі яму структурамі зьменшыцца, а без належнага кантролю не навязаць антыдэмакратычных правілаў гульні. Узрастае верагоднасьць, што СМІ ня будуць выконваць загадаў неаб'ектыўна асьвятляць падзеі, службы бясьпекі — ужываць рэпрэсіі супраць апазыцыі, а мясцовыя ўлады — падтасоўваць

вынікі галасаваньня».

Значэньне канкурэнцыі ўнутры эліты павялічваецца тым, што галоўныя супернікі аўтарытарнай улады, як правіла, зьяўляюцца зь ейнага ж вузкага кола. Ва Ўкраіне ня толькі Юшчанка быў прэм'ер-міністрам Кучмы, але і сам Кучма быў прэм'ерам за Краўчуком, а Краўчук — адным з партыйных босаў за Шчарбіцкім. Высокія пасады дапамагалі ім усім адтачыць палітычныя навыкі, стварыць патрэбны публічны імідж, займець рэпутацыю памяркоўных і кампэтэнтных палітыкаў. Калі б яны пачыналі кар'еру ў апазыцыі, дасягнуць усяго гэтага ім было б немагчыма, бо апазыцыянэраў альбо не дапускалі да найбольш уплывовых СМІ, альбо дэманізавалі як небясьпечных радыкалаў, альбо, што яшчэ горш, зь іх кпілі, як з інфантыльных і некампэтэнтных ідэалістаў.

Адступніцтва эліты, бясспрэчна, адыграла вырашальную ролю ў мірным зьвяржэньні рэжымаў Мілошавіча і Шэварднадзэ, а таксама ў падзеньні камуністычных рэжымаў у 1989—1991 гг. Цалкам натуральны падзел унутры ўладнай групоўкі не абавязкова прыводзіць да адкрытага адступніцтва з боку пэўнай яе часткі ці нават да прыхаванага сабатажу. Дзеля гэтага патрабуюцца, як правіла, яшчэ два чыньнікі: магутны ціск «зьнізу» палітычна актыўных масаў і адчувальны ціск «зьверху» міжнародных урадавых і няўрадавых структураў, якія могуць прызнаць правамоцным або неправамоцным аўтарытарны рэжым.

Стывэн Левіцкі і Лукан Ўэй называюць чатыры арэны барацьбы, што існуюць пры аўтарытарных рэжымах з пэўнай доляй палітычнай канкурэнцыі: выбарчае поле, заканадаўчая ўлада, судовыя органы і СМІ. Яны дзейнічаюць дзякуючы захаваньню напоўненых рэальным зьместам дэмакратычных інстытутаў. Пры іх дапамозе апазыцыйныя сілы могуць пэрыядычна кідаць выклік кіраўнікам-аўтакратам, аслабляць, а бывае, што і перамагаць іх. Адразу відаць, што ва Ўкраіне, адрозна ад Беларусі, усе гэтыя структуры ніколі цалкам не падпарадкоўваліся ўладзе. Выбары заўсёды адзначаліся рэальнай канкурэнцыяй, падлік галасоў адбываўся збольшага справядліва, нягледзячы на значныя злоўжываньні дзяржаўнай

уладай падчас перадвыбарчых кампаніяў. Украінскі нацыянальны парлямэнт, адрозна ад расейскага і беларускага, ніколі не ператвараўся ў марыянэтку ў руках прэзыдэнта. Хоць парлямэнт і ня меў значнага ўплыву на палітыку ўраду, але ўсё ж ён «выконваў ролю галоўнай пляцоўкі для дзейнасьці апазыцыі, забясьпечваючы дэпутатам адносна лёгкі доступ да СМІ і імунітэт ад перасьледу».

Судовая ўлада хоць і падпадала пад махінацыі і ўціск, а часьцяком і карумпавалася, захавала пэўную ступень незалежнасьці, асабліва на найвышэйшым узроўні. Судзьдзяў Вярхоўнага суду немагчыма адхіліць ад пасады да 65-гадовага ўзросту, калі яны мусяць сыходзіць на пэнсію. І нарэшце, незалежныя СМІ, як бы іх ні запалохваў, ні выціскаў з інфармацыйнага поля ўрад, усё ж даносілі да грамадзтва не прасеяную скрозь сіта цэнзуры інфармацыю. Нават у найгоршыя месяцы 2004 г., калі рэжым у агоніі нібы сарваўся з ланцуга, апазыцыя па-ранейшаму мела доступ да газэтаў зь вялікімі накладамі, такіх, як «Сільскі вісті», што падтрымлівалі сацыялістаў, «Україна молода», што выступала за Юшчанку, «Вечерние вести», што былі на баку Цімашэнкі, незалежнае «Дзеркало тижня», а таксама да асобных FM-станцыяў і да знакамітага «5-га каналу» тэлебачаньня. (Хоць «5-ты канал» і выціснулі з большасьці рэгіёнаў, але яго можна было глядзець па кабэльным тэлебачаньні на трэцяй частцы ўкраінскай тэрыторыі, у т. л. і ў Кіеве.)

Усё гэта тлумачылася ня толькі адноснай сілай грамадзянскай супольнасьці, што мела некаторую традыцыю, прынамсі, у цэнтральнай і заходняй Украіне, і выявіла большую здольнасьць супрацьстаяць аўтарытарнаму ціску, чым чакалі многія назіральнікі. Надзвычай важную ролю адыграла палярызаванасьць і разьяднанасьць украінскай эліты. Яна перашкодзіла ўмацаваньню аўтакратычнай прэзыдэнцкай улады, стварыўшы фактычна нефармальную сыстэму стрымліваньня і супрацьваг. Спаборныя кланы алігархаў, з аднаго боку, і адчувальныя сілы дэмакратычнай апазыцыі — з другога, актыўна ўзаемадзейнічалі, заключаючы і парушаючы дзівосныя тактычныя альянсы паміж рознымі групоўкамі і асобамі.

Між тым шмат для каго з алігархаў добрыя стасункі з Захадам набылі першачарговую значнасьць. На асабістым узроўні яны ажыцьцявілі глыбокую «эўраатлянтычную інтэграцыю»: займелі прыватныя банкаўскія рахункі, нерухомасьць, мілую постсавецкую звычку навучаць сваіх дзяцей у добрых заходніх унівэрсытэтах, лячыцца ў Бадэн-Бадэне, а не ў крамлёўскім шпіталі, і аддавацца *la dolce vita* (салодкаму жыцьцю) на самых лепшых міжнародных курортах. Дзякуючы падобнай зьвязанасьці з Захадам, украінская эліта вельмі не хацела ісьці на якія-кольвек радыкальныя крокі, што маглі б аслабіць яе сувязі з Захадам. Шмат хто зь іх, у т. л. і зяць Кучмы, мэталюргічны магнат Віктар Пінчук, лічыў страту ўлады і некаторых эканамічных прывілеяў меншым ліхам, чым магчымыя міжнародныя санкцыі, што ўключалі б адмову ў візах і, як падказала Мадлен Олбрайт, замарожваньне банкаўскіх рахункаў.

КАЛІДОР МАГЧЫМАСЬЦЯЎ

Пасьпяховыя электаральныя рэвалюцыі ва Ўкраіне і некаторых іншых посткамуністычных дзяржавах, даўно выкрасьленых са сьпісу магчымых дэмакратычных краінаў, выклікалі ажыўленыя дыскусіі сярод палітыкаў, навукоўцаў і журналістаў наконт магчымага пашырэньня «дэмакратычнай заразы» на афарбаваныя ў колер дыктатуры абсягі былога СССР. Беларускі аналітык Віталь Сіліцкі па-ранейшаму вельмі скептычна ацэньвае пэрспэктывы новых дэмакратычных прарываў на постсавецкай прасторы. Іронія лёсу ў тым, кажа ён, што цяпер, пасьля дэмакратычных рэвалюцыяў апошніх гадоў, арганізаваць падобную зьмену ўлады ў іншых краінах будзе не прасьцей, а яшчэ складаней. Сіліцкі падае два асноўныя аргумэнты: па-першае, астатнія постсавецкія краіны — не напаўаўтарытарныя, а цалкам аўтарытарныя, там няма практычна ніякай рэальнай палітычнай канкурэнцыі: па-другое, іх кіраўнікі вынесьлі з «каляровых рэвалюцыяў» асноўны ўрок: трэба яшчэ мацней нацягнуць лейцы аўтарытарызму.

Для пачатку адзначым, што многія з астатніх дзяржаў, якія калісьці ўваходзілі ў Савецкі Саюз, папросту ня маюць адзнак

канкурэнтных аўтарытарных сыстэм. Улада сканцэнтраваная ў руках прэзыдэнтаў, а прадстаўнічыя інстытуцыі выконваюць дэкаратыўныя функцыі. Кантроль за эканамічнымі рэсурсамі яшчэ больш канцэнтраваны, часткова дзякуючы наяўнасьці лёгка кантраляваных прыродных рэсурсаў. Пра незалежных алігархаў альбо нічога не чутно, альбо яны былі плянамерна зьнішчаныя. Кантроль за фінансавымі рэсурсамі часта дапамагае падтрымліваць высокую ступень грамадзкай згуртаванасьці, паколькі спрашчае разьмеркаваньне грошай (Шэварднадзе доўга не плаціў заробкаў сваёй службе бясьпекі, але азэрбайджанскі прэзыдэнт Гейдар Аліеў і беларускі Аляксандар Лукашэнка такой памылкі ніколі не рабілі). Эліты былі старанна вычышчаныя і ператасаваныя з мэтай прадухіліць узьнікненьне ўнутранай апазыцыі, а іншадумства строга караецца. Грамадзянская супольнасьць і палітычная апазыцыя слабыя (калі яны ўвогуле існуюць); калі ж ім удаецца набыць пэўны ўплыў, іх адразу імкнуцца зьнішчыць і дыскрэдытаваць. Найбольш уплывовых і харызматычных лідэраў апазыцыі садзяць у турму па сфабрыкаваных абвінавачаньнях, мяшаюць з брудам у падкантрольных рэжыму СМІ альбо робяць зь імі штось яшчэ горшае (успомнім, напрыклад, пра «зьнікненьні» беларускіх апазыцыйных палітыкаў). Рэшта апазыцыі застаецца напалоханай альбо няздольнай для змаганьня.

Так, больш кансалідаваныя аўтарытарныя рэжымы яшчэ праводзяць выбары, але робяць стаўку ня так на падтасоўку галасоў і пасьлявыбарныя рэпрэсіі (як у мякчэйшых вэрсіях недэмакратычных сыстэм), як на зьнішчэньне сваіх апанэнтаў, падрываючы такім чынам веру ў саму магчымасьць палітычных зьменаў шляхам выбараў. Яны старанна песьцяць міт, што лідэру такой палітычнай сыстэмы няма альтэрнатывы, а ў шырэйшым сэнсе — што няма альтэрнатывы і самой такой палітычнай сыстэме. (…) Рэпрэсіі ў такіх сыстэмах — ня сродак самазахаваньня, а лад жыцьця

[6].

Хоць некаторыя рэжымы, напрыклад, армянскі ці расейскі, у параўнаньні зь сярэднеазіяцкімі «султанатамі» здаюцца ўсё ж досыць «лібэральнымі», але яны хутка засвойваюць, што

[6] Сіткі, у Віцы ў.

«занадта лібэральныя» аўтакраты могуць доўга не працягнуць. Тактыка выжываньня ў іх простая: больш жорсткія законы, // больш суворы кантроль, больш папераджальных удараў па апазыцыі. Сіліцкі робіць выснову, што ў выніку «будзе больш небясьпечна вылучаць сваю кандыдатуру на выбарах, больш небясьпечна арганізоўвацца, больш небясьпечна галасаваць за апазыцыю, больш небясьпечна публічна ў гэтым прызнавацца, больш небясьпечна выходзіць на вуліцы і бараніць свой выбар». Урэшце аўтакраты могуць папросту перастаць лічыць галасы і пачаць штампаваць загадзя падрыхтаваныя вынікі.

працягнуць.
ARCHE
2005. № 2.

У такіх абставінах дэмакратычныя апазыцыянэры, нават заваяваўшы розумы і сэрцы грамадзян, могуць ня здолець зьдзейсьніць таго, што ўдалося іх калегам зь «мяккіх» аўтакратый, — даказаць сваё права на ўладу, не парушаючы законаў, напісаных папярэдняй уладай. Калі бюлетэні не даступныя для пераліку, пратаколы не выдаюцца і не падпісваюцца, ніхто з членаў камісіі не гатовы публічна прызнацца ў махлярстве, ніводны суд не асьмельваецца прыняць справу на разгляд, то ў апазыцыі мала шанцаў абвергнуць афіцыйныя лічбы. Можна ладзіць экзыт-полы, але іх лёгка сарваць (альбо заглушыць «афіцыйнымі» апытаньнямі, якія дэманструюць амаль аднагалосную падтрымку прадстаўнікоў улады).

У такіх абставінах шляхі да палітычных перамен пралягаюць ня цераз выбарчыя ўчасткі, і якімі б ні былі гэтыя альтэрнатыўныя шляхі, яны могуць стаць дужа доўгімі. Чакаць на постсавецкай прасторы ў бліжэйшы час сьмерці якогасьці прэзыдэнта, дзяржаўнага перавароту альбо народнага паўстаньня было б нерэалістычна

7.

Аднак аўтар не сьцьвярджае, што ўсялякія намаганьні Сіліцкі, асуджаныя на паразу і ў куродымнае постсавецкае вакольца ніколі не загляне сонца. Ён папросту нагадвае, што пашырэньне дэмакратыі — цяжкая, нудная, часам рызыкоўная праца, якая зусім не гарантуе хуткіх вынікаў. Разьвіцьцё постсавецкіх краінаў перадусім залежыць ад іх народаў. Але іх

7. Сіліцкі, Вікаль, Выбары вызыкоўнага выбару // ARCHE.

грамадзянскай супольнасьці, вядома, дапамагла б падтрымка Захаду, а санкцыі супраць постсавецкай «эліты» шмат у якіх выпадках ахаладзілі б яе аўтарытарны імпэт. Нельга разьменьваць пытаньні правоў чалавека і дэмакратыі ў Расеі і Азэрбайджане на газ і нафту, а тым болей на асабістую палітычную выгаду для спадароў Шырака і Шродэра.

Магчыма, пасьпяховае палітычна-эканамічнае разьвіцьцё пасьля рэвалюцыяў, напрыклад, ва Ўкраіне і Грузіі, паўплывае на ўсе постсавецкія нацыі, дасьць ім пераканаўчы прыклад посьпеху, які значна рэальней паўтарыць, чым дасягненьні далёкіх чэхаў і славенцаў. Гэта азначае, што Захад мусіць стымуляваць іх ня менш, чым Альбанію, Сэрбію і Македонію. Зьбігнеў Бжэзінскі вельмі крытычна ставіцца да палітыкі Захаду датычна постсавецкіх дзяржаваў, асабліва Расеі і Ўкраіны, аднак верыць, што становішча можна зьмяніць, «…асабліва калі Захад дапаможа Ўкраіне прасоўвацца ў заходнім кірунку».

Зразумела, кожная краіна ў сваім разьвіцьці, магчымым ці пажаданым, сутыкаецца з пэўнымі абмежаваньнямі, накладзенымі палітычнай культурай і гістарычнай традыцыяй, геаграфічным становішчам, тыпамі рэгіяналізму і нацыянальнай сьвядомасьці, а таксама шмат якімі іншымі чыньнікамі. Прыхільнікі гэтай тэорыі перадвызначанага шляху маюць рацыю ў тым, што куды мы прыйдзем, залежыць ад таго, адкуль мы выйшлі. Аднак яны памыляюцца ў тым, што выяўляюць усю траекторыю руху простай няўхільнай лініяй. Дакладней было б казаць пра «калідор магчымасьцяў», які могуць пашырыць (альбо звузіць) самі людзі. Ёсьць выразныя вызначальныя фактары, зь якімі трэба лічыцца, але няма жорсткага дэтэрмінізму, які трэба абагаўляць. Магчыма, у гэтым — галоўны для ўсіх нас урок «каляровых рэвалюцыяў» у постсавецкіх дзяржавах.

ЗАМЕСТ ВЫСНОВЫ

Трывалы аўтарытарны рэжым, які цалкам усталяваўся і ў Беларусі, і ў многіх іншых постсавецкіх рэспубліках, — дастаткова стабільная, хоць і закасьнелая зьява. Ён можа

трываць доўга. Найбольш магчымасьцяў зьмяніць сыстэму маюць акурат тыя, хто найбольш зацікаўлены ў ейным захаваньні. Узьнікае заганнае кола, разарваць якое надзвычай цяжка. Зрабіць гэта можа толькі моцная грамадзянская супольнасьць, але рэжым усімі сродкамі не дае ёй разьвівацца. І ўсё ж, нягледзячы ні на што, асобныя прыкметы сьведчаць: ня ўсё так безнадзейна.

Па-першае, аўтарытарны рэжым пры ўсім ягоным дэспатызьме — усё ж не таталітарны. У яго рамках застаецца нейкая прастора для розных поглядаў, ідэалёгіяў, нават для нейкай палітычнай і эканамічнай свабоды.

Па-другое, аўтарытарны рэжым пры ўсім адзінстве ягоных карпаратыўных інтарэсаў — не маналітны. У ім існуюць свае канкурэнтныя групоўкі са сваімі эканамічнымі інтарэсамі і палітычнымі прыхільнасьцямі. Больш за тое, Беларусь мае досыць абмежаваныя запасы прыродных рэсурсаў, і яе адсталая эканоміка ня можа забясьпечыць грамадзтва, ужо ня кажучы пра «вярхі», колькасьць і спажывецкія запатрабаваньні якіх растуць і растуць. І хоць паноўную паразытычную групоўку паранейшаму задавальняе аўтакратыя Лукашэнкі, з шэрагаў уладнай эліты непазьбежна паўстануць «унутраныя дысыдэнты», якія раней ці пазьней прывядуць да новай хрушчоўскай адлігі, гарбачоўскай перабудовы ці рэвалюцыі Ататурка.

І нарэшце, Беларусь знаходзіцца ў Эўропе, таму на яе непазьбежна зьвяртае ўвагу і ўплывае Захад. У галіне СМІ, правоў чалавека, вяршэнства закону дапамога Захаду азначае найперш маніторынг шматлікіх парушэньняў і міжнародны ціск на беларускі ўрад, у т. л. санкцыі супраць кожнага канкрэтнага чыноўніка, што іх дапускае. Як выразна сьведчыць прыклад Югаславіі, калі раздаваць больш бізуноў аўтарытарнай уладзе і больш пернікаў — розным інстытутам і асобам нованароджанай грамадзянскай супольнасьці, гэта можа прывесьці да некаторых станоўчых вынікаў.

Сапраўды, Захад мае досыць мала падважнікаў узьдзеяньня на Беларусь, бо ў краіне не адбылося буйнамаштабнай прыватызацыі, ня ўзьнікла алігархічных кланаў, а таму не

ўсталявалася «плюралізму паводле змоўчаньня». Беларускі аўтарытарызм у вялікай ступені пэрсаналізаваны ў асобе непрадказальнага дыктатара. Але гэта не азначае, што ён усёмагутны і яму нельга кінуць выклік. Беларуская эліта непазьбежна разаб'ецца на фракцыі, як гэта здарылася нават пры больш трывалай дыктатуры ў Румыніі і ў СССР. Зьвязанасьць Беларусі з Захадам досыць моцная: беларускае грамадзтва ў аснове сваёй эўрапейскае, у ім адбываецца досыць актыўны інфармацыйны і чалавечы абмен з Захадам (беларусаў на Захадзе пабывала большая доля ад агульнага ліку насельніцтва, чым украінцаў), а нябачная рука свабоднага рынку дзейнічае, хоць і ў абмежаваным маштабе, у дробным гандлі, сыстэме абслугоўваньня і малой вытворчасьці.

Вядома, Захад ня можа зрабіць за беларусаў іх справу, але ён, бясспрэчна, можа і мусіць рабіць сваю справу ў дачыненьні да Беларусі значна лепш.

З украінскай пераклала П.С.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 12 (52) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2007/02/11
[image]

ЭТАН С. БЭРГЕР
навуковы супрацоўнік факультэту міжнародных справаў Амэрыканскага ўнівэрсытэту ў Вашынгтоне, ад'юнкт-прафэсар юрыдычнага цэнтру пры Джорджтаўнскім унівэрсытэце. Быў міжнародным назіральнікам на выбарах у Беларусі ў 2001 г. і 2004 г. Піша пра палітычныя, прававыя, эканамічныя праблемы і правы чалавека ў

Этан С. Бэргер

Злучаным Штатам патрэбная новая палітыка ў дачыненьні да Беларусі

Ніякіх ружовых, памаранчавых ці бананавых рэвалюцыяў у нашай краіне ня будзе.

Аляксандар Лукашэнка
8 студзеня 2005 г.

У Арганізацыю Аб'яднаных Нацыяў уваходзіць больш за 180 удзельнікаў. Аднак можна сьцьвярджаць, што на практыцы ў сьвеце ўсяго каля 40 краінаў. Астатнія — проста тэрыторыі, дзе ўсім распараджаецца вярхушка, асноўная мэта якой — самаўзбагачэньне і захаваньне асабістай улады. Як правіла, яе мала абыходзяць правы і патрэбы людзей, што жывуць на землях, якімі яна кіруе.

Аднак міжнароднае права лічыць нацыянальную дзяржаву (краіну) асноўным суб'ектам замежнапалітычных дачыненьняў. Яна разглядаецца як сувэрэнная адзінка, надзеленая пэўнымі правамі, што сфармаваліся на працягу часу на падставе традыцыяў і дамоўленасьцяў. Паводзіны беларускіх уладаў часам заслугоўваюць меншага асуджэньня ў параўнаньні зь іншымі рэжымамі.У гэтым тэксьце каротка аналізуецца лёгка

гэткай сыстэмы на прыкладзе разьвіцьця сытуацыі ў Беларусі.
Яе асаблівасьць у тым, што яна зазвычай не ўважаецца за «няспраўджаную дзяржаву». Хутчэй, гэта дыктатура ў агульнапрынятым сэнсе слова. Ад яе не зыходзіць ваеннай пагрозы суседзям. Шмат у чым паводзіны яе ўладаў заслугоўваюць меншага асуджэньня ў параўнаньні зь іншымі рэжымамі. Адрозьнівае яе тое, што яна знаходзіцца не ў якой-небудзь аддаленай частцы сьвету, а на ўсходняй мяжы Эўразьвязу і НАТО. Магчыма, таму да яе падыходзяць зь іншымі меркамі, чым да большасьці астатніх дзяржаваў сьвету.

І гэта апраўдана, бо вынікае з абавязкаў, прынятых на сябе самою дзяржавай. Як заўважыў адзін амэрыканскі філёзаф і пісьменьнік, «бязглуздая пасьлядоўнасьць — знак абмежаванага розуму». Сапраўды, Беларусь — гэта адмысловы выпадак. Магчыма, таму, што яна мае вялікае стратэгічнае значэньне, ці таму, што для шмат каго зь яе суседзяў разьвіцьцё палітычнай сытуацыі ў Беларусі — як лякмусавая паперка для краінаў, што ажыцьцяўляюць палітычныя і эканамічныя пераўтварэньні.

Мы часта забываемся, што ў 1994 г. Лукашэнку абралі прэзыдэнтам у выніку справядлівых, паводле агульнапрынятых крытэраў, выбараў — ён не захоплівaў улады гвалтоўнымі сродкамі. Але гісторыя Эўропы ведае і іншых дыктатараў, якія прыйшлі да ўлады і ўмацавалі яе амаль што законным шляхам. У Беларусі за Лукашэнкам апазыцыю імкнуліся ў ідэале выштурхнуць за мяжу, пазбаўляючы яе рэсурсаў, неабходных, каб супрацьстаяць ягоным дзеяньням.Лукашэнка забясьпечвае ў Беларусі парадак (у сэнсе «стабільнасьць») тым, што ўжывае сілу, дзе лічыць патрэбным.

У сваёй кнізе «Віртуальная палітыка: імітацыя дэмакратыі на постсавецкай прасторы» Эндру Ўілсан тлумачыць, што і Лукашэнка, і шмат якія іншыя лідэры дзяржаваў — пераемніцаў СССР адчуваюць свой абавязак праводзіць выбары і ствараць сыстэму кіраваньня, заснаваную, здавалася б, на прынцыпах прававой дзяржавы. Аднак насамрэч гэта даніна савецкай эпосе: лідэры СССР таксама адчувалі сябе

абавязанымі праводзіць выбары ў саветы рознага ўзроўню.

Лукашэнка праводзіць палітыку запалохваньня апазыцыі, удушае і зьнішчае незалежныя СМІ. Яму, у прынцыпе, хапала майстэрства быць начальнікам турмы, дзьверы якой адчыненыя — да нядаўняга часу незадаволеным ніхто не замінаў зьехаць. Студэнты маглі вучыцца (і заставацца) за мяжой. Па магчымасьці, улады не дапушчалі зьяўленьня «адмаўленцаў» і пакутнікаў за ідэю. У Беларусі за Лукашэнкам апазыцыю імкнуліся ў ідэале выштурхнуць за мяжу, пазбаўляючы яе рэсурсаў, неабходных, каб супрацьстаяць ягоным дзеяньням.

Рэдка бывае, каб кіраўнік аўтарытарнай краіны дазваляў выбары, ня маючы ўпэўненасьці ў іх выніках. І Лукашэнка — не выключэньне з правіла. Апазыцыя ня мае ілюзіяў наконт магчымасьці атрымаць бясспрэчную перамогу над Лукашэнкам, ня маючы належных рэсурсаў і доступу да дзяржаўных СМІ. Але яе, здаецца, глыбока ўразіў маштаб фальсыфікацыяў. Апазыцыя ўбачыла, што Лукашэнка прагнуў дамагчыся рашучай перамогі на выбарах, каб здэмаралізаваць сваіх апанэнтаў і прымусіць замаўчаць крытыкаў за мяжою.

ШТО ПАМАГЛО ЛУКАШЭНКУ ЗАСЯРОДЗІЦЬ УЛАДУ Ў СВАІХ РУКАХ?

Праз два дні пасьля выбараў у Беларусі ў 2001 г. сьвет зьмяніўся пад уплывам падзеяў 11 верасьня і іх наступстваў. Беларусь амаль цалкам зьнікла з поля зроку большасьці афіцыйных асобаў у амэрыканскім урадзе. Доўгачаканыя «дывідэнды міру» расталі, фондавы рынак абваліўся. Міжнародныя арганізацыі ў правах чалавека сутыкнуліся з тым, што іх спонсары ўжо не маглі выдаваць столькі грантаў, як раней.

За наступныя некалькі гадоў Лукашэнка зрабіў захады, каб пазбавіць апазыцыю пляцдарму для супраціву. Рэдка бывае, каб кіраўнік аўтарытарнай краіны дазваляў выбары, ня маючы ўпэўненасьці ў іх выніках. І Лукашэнка — не выключэньне з правіла.Каб запалохаць беларускую прэсу, усё часьцей

выкарыстоўвалася прававая сыстэма: на пэрыядычныя выданьні падавалі ў суд за «паклёп», яны закрываліся за дробныя парушэньні. Чым шырэй разгортваліся рэпрэсіі, тым больш палітычных актывістаў не адважвалася працягваць дзейнасьць, баючыся за свае сем'і.

Беларускія ўлады ўзмацнялі кантроль над грамадзтвам, часта адмаўляючы ў рэгістрацыі недзяржаўным арганізацыям, якія маглі б прытуліць і фінансава падтрымаць прыхільнікаў апазыцыі. Беларускім арганізацыям у правах чалавека стала бракаваць сродкаў, таму дзейнасьць многіх зь іх зрабілася менш эфэктыўнай, а некаторыя проста спынілі сваё існаваньне.

Пры гэтым многія з тых, хто раней спадзяваўся зьмяніць палітычнае становішча ў Беларусі, адчулі глыбокае расчараваньне. Шмат хто зьехаў на Захад, часта дзеля таго, каб рэалізаваць свае здольнасьці ў навуковай сфэры. Іншыя перабраліся ў Расею ў пошуках матэрыяльнага дабрабыту для сябе і сваіх сем'яў.

МАРЫЯНЭТКАВЫ ПАРЛЯМЭНТ І ПРАВА НА ПАЖЫЦЬЦЁВАЕ ПРЭЗЫДЭНЦТВА

Адзін са спосабаў забясьпечыць сабе паслухмяны парлямэнт — гэта ня даць апазыцыі ўнесьці сваіх кандыдатаў у выбарчыя бюлетэні. На парлямэнцкіх выбарах 2004 г. нібыта незалежная Цэнтральная выбарчая камісія зарэгістравала толькі 26 з 58 кандыдатаў ад АГП і 20 з 30 ад Партыі БНФ. З 912 прэтэндэнтаў у кандыдаты ў дэпутаты збольшага бяспраўнага заканадаўчага органу Цэнтравыбаркам адмовіў у рэгістрацыі 313. Раённыя выбарчыя камісіі пазбаўлялі кандыдатаў рэгістрацыі напярэдадні галасаваньня.

7 верасьня 2004 г. Лукашэнка зрабіў нечаканую заяву. У дадатак да парлямэнцкіх выбараў беларускі электарат мусіў адказаць, ці трэба дазволіць Лукашэнку ўдзельнічаць у прэзыдэнцкіх выбарах па заканчэньні другога прэзыдэнцкага тэрміну. Пытаньне, што выносілася на рэфэрэндум, ніяк нельга назваць узорам добрага пісьма:

Ці дазваляеце Вы першаму Прэзыдэнту Рэспублікі Беларусь Лукашэнку А. Р. удзельнічаць у якасьці кандыдата ў Прэзыдэнты Рэспублікі Беларусь у выбарах Прэзыдэнта і ці прымаеце частку першую артыкулу 81 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у наступнай рэдакцыі: «Прэзыдэнт абіраецца на пяць гадоў непасрэдна народам Рэспублікі Беларусь на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаваньні»?

Фармулёўка цікавая зь некалькіх пунктаў гледжаньня. Па-першае, у ёй ня ўлічваецца, што першым прэзыдэнтам Беларусі калі не *de jure*, дык *de facto* быў Станіслаў Шушкевіч, а не Аляксандар Лукашэнка. Па-другое, у артыкуле 81 няма ніякага абмежаваньня тэрмінаў прэзыдэнцтва — гэта азначае, што Лукашэнка можа пераабірацца зноў і зноў. Па-трэцяе, на рэфэрэндуме для перамогі неабходна набраць 50 % плюс адзін голас ад *унесеных у сьпісы для галасаваньня*, а на прэзыдэнцкіх выбарах — толькі 50 % плюс адзін голас ад ліку тых, хто прагаласаваў.

Старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына паведаміла, што Лукашэнку падтрымалі 87,97 % ад тых, хто ўдзельнічаў у галасаваньні. Паводле яе словаў, гэта адпавядае 79,42 % ад агульнай колькасьці выбарцаў. Згодна з вынікамі экзыт-полаў, праведзеных арганізацыяй, заснаванай Інстытутам Гелапа, Лукашэнка атрымаў толькі 48,4 % галасоў тых, хто ўдзельнічаў у рэфэрэндуме, і, адпаведна, яшчэ меншы працэнт ад агульнай колькасьці выбарцаў. Хоць у такой краіне, як Беларусь (ня кажучы пра ЗША), вынікі экзыт-полаў могуць быць памылковымі, няма нічога дзіўнага, што апазыцыя абвінаваціла ўлады ў буйных фальсыфікацыях.

Такім чынам, за тры гады, што прайшлі пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г., Лукашэнка здолеў запалохаць апазыцыю і ўзмацніць кантроль над нібыта незалежнымі выбарчымі камісіямі. Са 110 акруг, дзе былі абраныя дэпутаты, у парлямэнт не прайшоў ніводны кандыдат ад апазыцыі.

У 2004 г. абедзьве палаты кангрэсу ЗША адзінагалосна прынялі Акт аб дэмакратыі ў Беларусі. Яго падпісаў прэзыдэнт Буш, і ён

набыў моц закону. Цяпер у кангрэсе разглядаецца новая рэдакцыя Акту аб дэмакратыі, якая ня толькі б удасканаліла некаторыя фармулёўкі і ўзмацніла санкцыі супраць беларускіх уладаў, але і дазволіла б фінансаваць адкрыта антылукашэнкаўскія праграмы.

КАМПАНІЯ 2006 г.

Каб зьменшыць шанцы апазыцыі арганізавацца, Лукашэнка прымусіў парлямэнт перанесьці прэзыдэнцкія выбары зь ліпеня на сакавік. Гэтым ён дасягнуў адразу некалькіх мэтаў. Ён пазбавіў разьяднаную беларускую апазыцыю рэальнай магчымасьці правесьці эфэктыўную выбарчую кампанію. Халоднае сакавіцкае надвор'е зьмяншала верагоднасьць стыхійных антыўрадавых выступленьняў. Гэты крок таксама азначаў, што прэзыдэнцкія выбары ў Беларусі адбудуцца за тыдзень да парлямэнцкіх ва Ўкраіне. Апроч таго, ён дадаў Лукашэнку ўпэўненасьці, што ўдзельнікі «вялікай васьмёркі» на сустрэчы ў Санкт-Пецярбурзе не адвядуць сытуацыі ў Беларусі (адрозна ад энэргетычных пытаньняў) значнага месца ў парадку дня.

Як кажа старое выслоўе, адзін харызматычны фанатык ператворыць 30 баязьліўцаў у змагароў. Лукашэнка зрабіў, здаецца, усё, што трэба, каб такая асоба не паўстала ў Беларусі. У апазыцыі не было кандыдата, які б карыстаўся вялікім аўтарытэтам у беларускім грамадзтве і мог бы праводзіць агрэсіўную выбарчую кампанію. Большасьць палітычнай апазыцыі вырашыла падтрымаць адзінага кандыдата — Аляксандра Мілінкевіча, колішняга дацэнта Гарадзенскага ўнівэрсытэту і былога намесьніка мэра Горадні. Перад выбарамі некаторыя эўрапейскія лідэры і высокія чыноўнікі сустракаліся зь Мілінкевічам на знак таго, што аддаюць яму перавагу перад Лукашэнкам.

У сваіх публічных заявах Мілінкевіч адзначаў, што ён не сумняецца: Лукашэнка ўжо зрабіў усё неабходнае, каб галасаваньне сталася пустой фармальнасьцю. Таму кандыдат ад апазыцыі заклікаў сваіх прыхільнікаў не лічыць за мэту

кампаніі перамогу на выбарах, а пераканаць тых, хто настроены супраць Лукашэнкі, што зьмена рэжыму мірнымі сродкамі магчымая ў будучыні.

ПРЭВЭНТЫЎНЫЯ ЗАХАДЫ ЛУКАШЭНКІ

17 жніўня 2005 г. Лукашэнка падпісаў указ, які ўводзіў новыя абмежаваньні на атрыманьне тэхнічнай дапамогі з-за мяжы. Указ забараняе арганізацыям і асобным грамадзянам атрымліваць і выкарыстоўваць дапамогу для «падрыхтоўкі і правядзеньня выбараў, рэфэрэндумаў, адкліканьня дэпутатаў і сяброў Савету Рэспублікі, арганізацыі і правядзеньня сходаў, мітынгаў, вулічных шэсьцяў, дэманстрацыяў, пікетаваньня, страйкаў, вырабу і распаўсюду агітацыйных матэрыялаў, правядзеньня іншых формаў палітычнай агітацыйна-масавай працы сярод насельніцтва». Указ стварыў заканадаўчую базу для забароны тэхнічнай дапамогі ў выглядзе арганізацыі сэмінараў, канфэрэнцыяў і публічных дыскусіяў.

19 ліпеня 2005 г. беларускі парлямэнт прыняў закон, які ўводзіць абмежаваньні на стварэньне і дзейнасьць палітычных партыяў. У ім пералічваюцца падставы, паводле якіх Вярхоўны суд Беларусі пасьля звароту Міністэрства юстыцыі можа прыпыніць палітычную дзейнасьць партыі. Гэты закон на практыцы істотна перашкаджае ўтварэньню новых палітычных суб'ектаў.

У лістападзе таго ж году Савет Міністраў Беларусі прыняў пастанову, якой уводзілася дзяржаўная манаполія на стварэньне новых сацыялягічных службаў, а пры Нацыянальнай акадэміі навук утваралася структура для кантролю над арганізацыямі, што мелі дазвол праводзіць апытаньні грамадзкай думкі. Калі ў дзейнасьці сацыялягічнай службы заўважаць парушэньні ці калі вынікі апытаньняў палічаць «прадузятымі і ня вартымі даверу», службу могуць пазбавіць акрэдытацыі.

У сьнежні 2005 г. прэзыдэнт Лукашэнка падпісаў закон, якім уводзілася крымінальная адказнасьць за «дыскрэдытацыю Рэспублікі Беларусь». У Крымінальны кодэкс уносіліся

папраўкі, згодна зь якімі падрыхтоўка людзей да ўдзелу ў вулічных акцыях пратэсту, дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь за мяжой, заклікі да іншых краінаў і міжнародных арганізацыяў дзейнічаць «на шкоду бясьпецы, сувэрэнітэту і тэрытарыяльнай цэльнасьці краіны» павінны разглядацца як злачынства. Апроч таго, Лукашэнка прымусіў беларускі парлямэнт даць яму ў рукі дадатковыя інструмэнты, што не дазвалялі апазыцыі мабілізаваць «людзкую сілу» ў выпадку фальсыфікацыі выніку выбараў. Напрыклад, узмацнялася крымінальная адказнасьць за арганізацыю акцыяў пратэсту, прыналежнасьць да забароненай арганізацыі і выступленьне супраць нацыянальных інтарэсаў.

У дадатак беларускі парлямэнт унёс папраўкі ў Закон Рэспублікі Беларусь аб унутраных войсках Міністэрства ўнутраных справаў. Цяпер яны атрымалі права разганяць антыўрадавыя дэманстрацыі. Парлямэнт надаў прэзыдэнту паўнамоцтвы загадваць беларускім войскам ужываць зброю і іншы ваенны рыштунак, каб захаваць парадак унутры краіны. Абмяжоўвалася права беларускіх вайскоўцаў адмовіцца ад выкананьня незаконных, на іх думку, загадаў (напрыклад, страляць ці ўжываць ваенную тэхніку супраць цывільных асобаў). Як у Нямеччыне за Гітлерам, вайскоўцы і міліцыя сталі прыносіць прысягу на вернасьць не Рэспубліцы Беларусь ці Канстытуцыі, а Лукашэнку.Больш за тое, як у Нямеччыне за Гітлерам, вайскоўцы і міліцыя сталі прыносіць прысягу на вернасьць не Рэспубліцы Беларусь ці Канстытуцыі, а Лукашэнку. Такім чынам зьмяншалася верагоднасьць, што ў выпадку праліцьця крыві вайскоўцы вырашаць падтрымаць апазыцыю.

Лукашэнка мае ў сваім распараджэньні як мінімум 110 тысячаў байцоў спэцыялізаваных ваенізаваных фармаваньняў, у тым ліку АМАПу. Яны могуць істотна папоўніцца за кошт рэзэрвістаў. Лукашэнка мае таксама ахутаны заслонай сакрэтнасьці кантынгент асабістых целаахоўнікаў, адмыслова навучаных і забясьпечаных найноўшай тэхнікай. Апроч таго, улады ўзмацнілі *СОБР* — спэцыяльны атрад хуткага рэагаваньня — і атрад «Алмаз».

ПАСЬЛЯ ВЫБАРАЎ

Эканамісты і палітолягі падрабязна дасьледавалі эканамічную залежнасьць Беларусі ад Расеі. Сачыць за паваротамі беларуска-расейскіх дачыненьняў — само па сабе цэлая прафэсія. Шмат у каго склалася ўражаньне, што без паставак прыроднага газу і нафты з Расеі па цэнах, ніжэйшых за рынкавыя, беларуская эканоміка не дасягнула б цяперашніх паказьнікаў. Да таго ж Расея — рынак збыту для многіх беларускіх вытворцаў. Аднак нельга не заўважаць, што расейскія экспартэры зброі могуць рукамі беларускіх партнэраў рабіць пастаўкі ў краіны, зь якімі расейскі ўрад не хацеў бы весьці справы адкрыта. Трэба дадаць, што расейскія энэрганосьбіты паступаюць у Заходнюю Эўропу па трубаправодах, пракладзеных праз тэрыторыю Беларусі. Такім чынам, з эканамічным раскладам у беларуска-расейскіх стасунках ня ўсё так проста, як здаецца на першы погляд.

На думку некаторых дасьледчыкаў, Расея знаходзіцца ў жудасным дэмаграфічным крызісе. Каля трох чвэрцяў этнічных расейцаў жыве на захад ад Уралу, а большасьць прыродных рэсурсаў знаходзіцца ў раёнах, што гістарычна належалі іншым народам. Пол Гобл выказаў здагадку, што надыдзе момант, калі большасьць насельніцтва Расейскай Фэдэрацыі будуць складаць мусульмане. Застаецца страх, што Расея паўторыць лёс Савецкага Саюзу. Мэта сёньняшняй расейскай нацыянальнай палітыкі — зноў цэнтралізаваць уладу ў Маскве і вярнуць краіне статус «вялікай дзяржавы», як за часам СССР. Зразумела, калі Расея анэксуе ці іншым чынам возьме пад свой кантроль Беларусь і ўсходнюю Ўкраіну, дзень, калі ўсходнія славяне перастануць складаць большасьць насельніцтва РФ, адсунецца ў больш аддаленую будучыню.

Амэрыка ставіцца да рэжыму Лукашэнкі як да ўлады *de facto*, але не *de jure*. І Эўразьвяз, і ЗША забаранілі ўезд у свае краіны шэрагу беларускіх афіцыйных асобаў, аднак ні Амэрыка, ні Эўропа не жадаюць узмацненьня ціску на рэжым. Напрыклад, пакуль ідуць дыскусіі пра тое, каб пазбавіць у будучыні гандлёвых прэфэрэнцыяў постсавецкія краіны, якія не захоўваюць правоў чалавека, адхіляюцца прапановы

эканамічных санкцыяў супраць Беларусі. Ні краіны Эўразьвязу, ні ЗША не парвалі дыпляматычных стасункаў зь Беларусьсю і не адклікалі зь Менску сваіх амбасадараў (праўда, некаторыя адклікалі амбасадараў для кансультацыяў).

У параўнаньні са Злучанымі Штатамі, Эўразьвяз, нягледзячы на афіцыйныя заявы, праводзіць значна больш асьцярожную палітыку датычна Беларусі. Яе суседзі: Польшча, Літва, Латвія — больш за ўсіх *публічна* крытыкуюць Лукашэнку. Але яны ўвогуле ня маюць ніякага жаданьня псаваць эканамічныя стасункі зь Беларусьсю. Амэрыка ставіцца да рэжыму Лукашэнкі як да ўлады de facto, але не de jure.І гэта ня дзіўна, бо, паводле зьвестак фонду *Pontis*, у Беларусі адбываецца пераарыентацыя замежнага гандлю на краіны, што не ўваходзяць у СНД.

Напрыклад, літоўскі прэм'ер-міністар Гедымінас Кіркілас нядаўна выказаўся супраць увядзеньня Эўразьвязам эканамічных санкцыяў у дачыненьні да Беларусі. Ён заявіў, што ізаляцыя краіны і зьвязаныя зь ёю дадатковыя цяжкасьці для беларускага народу ніяк не адаб'юцца на рэжыме Лукашэнкі. Фактычна большасьць краінаў, якія выказваліся па гэтым пытаньні: Польшча, Літва, Латвія, Грэцыя, Кіпр — не падтрымлівалі ўвядзеньня санкцыяў. На нядаўнім пасяджэньні Эўразьвязу Чэхія, Італія і Славакія адмовіліся вызначыцца па беларускай праблеме. Гэта сьведчыць, што дзяржавы Эўразьвязу схільныя выступаць супраць гандлёвых санкцыяў, бо лічаць іх контрапрадуктыўнымі.

Замест санкцыяў Эўразьвяз задавольваецца чыста сымбалічнымі жэстамі і закуліснымі мэтадамі. Чыноўнікі Эўразьвязу адыгралі не апошнюю ролю ў прысуджэньні прэміі імя Андрэя Сахарава за свабоду мысьленьня Аляксандру Мілінкевічу ў 2006 г. і Беларускай асацыяцыі журналістаў — у 2004 г.Напрыклад, некаторыя яго краіны зьлёгку падтрымлівалі палітычных апанэнтаў Лукашэнкі, даючы ім магчымасьць друкаваць свае выданьні і праводзіць сустрэчы. Асобныя краіны Эўразьвязу асьцярожна ўздымаюць пытаньні правоў чалавека непасрэдна пры сустрэчах зь беларускімі афіцыйнымі асобамі. Трэба меркаваць, чыноўнікі Эўразьвязу

адыгралі не апошнюю ролю ў прысуджэньні прэміі імя Андрэя Сахарава за свабоду мысьленьня Аляксандру Мілінкевічу ў 2006 г. і Беларускай асацыяцыі журналістаў — у 2004 г.

Эўразьвяз успрымае Мілінкевіча як легітымную палітычную фігуру. Ён мае магчымасьць сустракацца з афіцыйнымі асобамі Эўразьвязу. Гэта дапамагае яму даносіць голас апазыцыі да грамадзтва (прынамсі, за межамі Беларусі), але, відаць, не павялічвае арганізацыйнага патэнцыялу апазыцыі.

Лукашэнка, магчыма, упэўнены, што ня страціць улады ў выніку вулічных акцыяў. Як ні парадаксальна, пры гэтым ён імкнецца яшчэ больш абмежаваць шанцы апазыцыі трапіць у выбарныя органы. Старшыня беларускага Цэнтравыбаркаму Лідзія Ярмошына, абвяшчаючы папраўкі ў Выбарчы кодэкс, заўважыла, што беларускі парлямэнт плянуе разгледзець папраўкі ў Выбарчы кодэкс, якія пройдуць апрабацыю на выбарах у мясцовыя саветы ў 2007 г. Калі пісаўся гэты артыкул, рыхтаваліся два варыянты правядзеньня мясцовых выбараў: адзін паводле старога закону, а другі — паводле новага, які рэгулюе правядзеньне перадвыбарчых сустрэчаў у грамадзкіх месцах: «Калі такія сустрэчы будуць ладзіцца па-за закрытымі памяшканьнямі, на іх правядзеньне трэба будзе атрымаць згоду мясцовых выканаўчых камітэтаў». Бясспрэчна, гэтыя зьмены робяцца для таго, каб умацаваць пазыцыі Лукашэнкі і падарваць дух ягоных апанэнтаў.

ЯКОЙ МАЕ БЫЦЬ НОВАЯ АМЭРЫКАНСКАЯ ПАЛІТЫКА Ў ДАЧЫНЕНЬНІ ДА БЕЛАРУСІ?

Закон Злучаных Штатаў аб міжнародных дачыненьнях сьцьвярджае:

Дзяржава ня можа прызнаваць альбо прымаць палітычны рэжым за ўрад, не прызнаючы тым самым дзяржаўнасьці той адзінкі, на кіраваньне якой прэтэндуе гэты рэжым. Аднак дзяржава можа прызнаваць адзінку за дзяржаву ці ставіцца да яе як да такой, не прызнаючы пры гэтым пэўны палітычны

рэжым за яе ўрад.

Тэарэтычнае непрызнаньне Лукашэнкі законным і правамоцным прэзыдэнтам Беларусі аўтаматычна не вядзе да практычных вынікаў. Большасьць урадаў робіць адрозьненьне паміж урадам *de facto* і *de jure*, але на практыцы яно чыста сымбалічнае, бо міжнародная супольнасьць згодная мець справу з урадамі *de facto*. Большасьць дзяржаваў вельмі ня хоча праводзіць іншага разьмежаваньня: паміж легітымнымі і нелегітымнымі ўрадамі.

У сьвеце, дзе рэальных дзейных дэмакратычных дзяржаваў — меншасьць, міжнароднай супольнасьці будзе складана (калі наагул магчыма) вызначыць, якія чыньнікі сьведчаць аб легітымнасьці ўраду. Але калі мы ня ў стане пакараць нелегітымныя рэжымы, гэта вельмі падобна да Крымінальнага кодэксу бязь мераў пакараньня. Мабыць, час прававым дзяржавам зьмяніць сваё стаўленьне да гэтай праблемы. Яны павінны паспрабаваць знайсьці адказ на пытаньне: ім рупяць паводзіны ўрадаў *de facto* толькі на міжнароднай арэне ці ўрад можна прызнаць нелегітымным паводле таго, як ён абыходзіцца з уласнымі грамадзянамі?

Было б наіўна чакаць, што міжнародныя абавязкі пераважаць над замежнапалітычнымі меркаваньнямі ці інтарэсамі асноўных груповак унутры краіны. Аднак, магчыма, прыйшоў час, калі асобным дзяржавам трэба кіравацца наступным палітычным прынцыпам: калі ўрад замежнай краіны прыйшоў да ўлады ня ў выніку свабодных і справядлівых выбараў або дапушчае буйнамаштабныя парушэньні грамадзянскіх правоў, ён мусіць лічыцца нелегітымным.

Трэба заахвочваць міжнародную супольнасьць дзейнічаць супраць нелегітымных рэжымаў звычайнымі мэтадамі. Іх дыпляматычны корпус не павінен карыстацца дыпляматычнымі прывілеямі. Іншыя дзяржавы не павінны выдаваць візы беларускім афіцыйным асобам, парушальнікам правоў чалавека і вядомым прыхільнікам рэжыму. Гэтыя захады няпроста ажыцьцяўляць на практыцы. Калі чалавек працуе на беларускі ўрад, гэта яшчэ аўтаматычна не азначае, што яму не

было б больш даспадобы новае кіраўніцтва, якое паважала б закон і правы чалавека. Становішча складанае. З аднаго боку, калі беларускія «вярхі» вымушаныя будуць на сабе адчуць «кошт» лукашэнкаўскай палітыкі, можа, гэта зьменшыць іх падтрымку ўлады. Зь іншага боку, беларусы пазбавяцца шанцаў кантактаваць зь людзьмі за мяжою і лепей зразумець рэпрэсіўную сутнасьць рэжыму Лукашэнкі.

Апроч таго, нелегітымныя рэжымы мусяць мець магчымасьць імпартаваць толькі прадукты харчаваньня, лекі і спажывецкія тавары. (Але гэта можа прывесьці да непажаданага выніку — росту залежнасьці ад Расеі і іншых дзяржаваў, якія парушаюць правы чалавека.) Замежныя банкаўскія рахункі чыноўнікаў нелегітымных рэжымаў трэба замарозіць, а нерухомасьць — перадаць пад кантроль апякунскай рады.

Пераклала з ангельскай мовы С. Т.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 12 (52) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2007/02/25**
[image]

АНДРЭЙ КАЗАКЕВІЧ
палітоляг, галоўны рэдактар часопісу «Палітычная сфэра». Гэты тэкст быў напісаны для зборніка «Прэзыдэнцкія выбары 2006», які неўзабаве будзе выдадзены віленскім Інстытутам беларусістыкі.

Андрэй Казакевіч Ідэалягічная інфраструктура беларускае палітыкі

Ідэалягічная сфэра не зьяўляецца самай дынамічнай часткаю палітычнай сыстэмы. Ейная эвалюцыя адбываецца дастаткова павольна, а зьмены часам не зьяўляюцца відавочнымі. Але афіцыйная ідэалягічная сфэра Беларусі ў апошнія некалькі гадоў перажывала пэрыяд бурнага росту, якасныя і колькасныя змены. Гэты артыкул накіраваны на паглыбленьне нашых дасьледаваньняў гэтай сфэры. У «Беларускай сыстэме...»[1] былі акрэсьленыя асноўныя спробы канцэптуалізацыі сучаснае Беларусі і самаапісаньня беларускага рэжыму, артыкул «Культурны фон беларускае палітыкі», у сваю чаргу, галоўным чынам аналізаваў мадэль ідэнтычнасьці, якую прапануе новы ідэалягічны праект, і ідэалягічную эвалюцыю рэжыму[2]. Гэты артыкул ставіць на мэце апісаньне інфраструктуры і ўмоваў разгортваньня ідэалягічнага праекту, а таксама некаторыя ягоныя вынікі. Такім чынам, аналізаваная будзе пераважна інстытуцыйны бок гэтага фэномэну.

Вызначэньне таго, чым зьяўляецца ідэалёгія ў сучаснай палітычнай сыстэме Беларусі, — справа няпростая. У розных кантэкстах пад гэтым паняцьцем разумеюцца розныя практыкі. З аднаго боку, гэта палітычныя канцэпты і ідэі што да разуменьня Беларусі, якія прапаноўваюцца ўладамі і замацоўваюцца ў выступах афіцыйных асобаў і праграмах, з

[1] Гл.: Казакевіч, Андрэй. Беларуская сістэма: марфалогія, фізіялогія, генэалогія // ARCHE. № 4 (33). 2004.

[2] Гл. аднайменны артыкул у кнізе «Найноўшая гісторыя беларускага парлямэнтарызму» (Менск: Аналітычны грудок, 2005)..

[3] Разгортваньне праекту было ў тым ліку матываванае і сацыялягічнымі дасьледаваньнямі.

[4] Гл. Указ прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2005 году.

другога — дастаткова эклектычны «навуковы» прадукт, што прапаноўваецца функцыянэрамі акадэмічнае сфэры. Акрамя гэтага, гаворка можа ісьці пра сукупнасьць рэклямных сымбаляў і лёзунгаў (накшталт дэвізу «За моцную і квітнеючую Беларусь»), самі практыкі рэклямаваньня рэжыму, прапагандысцкую, інфармацыйную і «тлумачальную» работу ды г. д. «Ідэалёгія» можа разумецца як «праект ідэнтычнасьці» і спроба стварыць новае пачуцьцё нацыянальнага адзінства, а таксама як звычайны сродак утрыманьня ўлады і забесьпячэньня ўласнае палітычнае будучыні[3].

З практычнага пункту гледжаньня ідэалягічны праект накіраваны на стымуляваньне «патрыятызму», гэта значыць фармаваньне пазытыўнага стаўленьня да наяўнай палітычнай сыстэмы, ляяльнасьці да ўлады, разуменьня каштоўнасьці і карыснасьці беларускай «мадэлі разьвіцьця», таму рэкляма сыстэмы займае тут цэнтральнае месца. Але разам з гэтым ідэалягічнай работаю лічыцца стымуляваньне ў грамадзкай сьвядомасьці пэўных гістарычных вобразаў і сымбаляў, асабліва тых, што датычаць Вялікае Айчыннае вайны. Больш за тое, нават узнаўленьне гістарычных і стварэньне новых афіцыйных геральдычных сымбаляў можа разглядацца як дзейнасьць у фармаваньні ідэалёгіі беларускае дзяржавы[4].

Такім чынам, ідэалёгія ўяўляе сабою дастаткова разнастайны набор практык, супольным для якіх зьяўляецца тое, што яны разглядаюцца як дзяржаўна-бюракратычная (а ня проста палітычная) дзейнасьць і ў любым выпадку накіраваныя на павышэньне легітымнасьці і ўстойлівасьці сучаснага палітычнага ўладкаваньня Беларусі.

Эвалюцыя праекту ідэалёгіі беларускае дзяржавы ўжо мае сваю гісторыю, але прынцыповых і эпахальных зьменаў (падобных да «ідэалягічнага павароту» пачатку XXI ст.) у апошні час не адбылося, і асноўныя пазыцыі ў канцэпцыі разуменьня Беларусі і праекце нацыянальнай ідэнтычнасьці, якія былі аформленыя ў 2003 г., засталіся. У той жа час назіраецца пэўнае зрушэньне акцэнтаў у гэтай сфэры. Гэты артыкул будзе прысьвечаны апісаньню асноўных структурных зьменаў у галіне дзяржаўнае ідэалёгіі, якая з 2003 г. зьяўляецца інстытуцыялізаванаю

часткаю палітычнае практыкі ўладаў.

Дарма што «дзяржаўная ідэалёгія» функцыянуе ў якасьці элемэнту палітычнага працэсу, вызначэньне гэтага паняцьця застаецца даволі праблематычным. Ідэалёгія функцыянуе ў розных гіпастасях і па-рознаму інтэрпрэтуецца ўдзельнікамі ідэалягічных практык, гэта значыць тое, што разумеюць пад ідэалёгіяй работнікі выканкамаў і, напрыклад, унівэрсытэцкія выкладчыкі, якія выкладаюць аднайменную дысцыпліну, можа значна розьніцца. У акадэмічных і часткова палітычных тэкстах словазлучэньне «дзяржаўная ідэалёгія» ўжываецца ў адным сэмантычным шэрагу з паняцьцямі «нацыянальная ідэя», «нацыянальная ідэалёгія», «нацыянальна-дзяржаўная ідэалёгія» і г. д.[5]. Такім чынам, яны адсылаюць да больш мяккае і легітымнае тэрміналёгіі, звыклай для сучаснае палітычнае мовы. З аднаго боку, у ідэалёгію ўключаюць розныя сыстэмы ідэяў, канцэптаў, мадэль апісаньня Беларусі як унікальнага і своеасаблівага палітычнага фэномэну, схемы інтэрпрэтацыі мінуўшчыны. З другога — палітычная мова ўлады ўключае ў ідэалёгію ўзровень нацыянальнае культуры, каштоўнасьцяў, рэлігійнай традыцыі і г. д.

У гэтай сувязі найбольш значныя падзеі ў ідэалягічнай практыках тычыліся суадносінаў тэарэтычнага і прадметнага ўзроўню. На пачатку свайго разгортваньня ідэя беларускасьці разглядалася ня толькі як інфармацыйная прапагандысцкая работа, але і як важны інтэлектуальны праект, накіраваны на канцэптуалізацыю аўтарытэтнае Беларусі, стварэньне пэўнага корпусу актуальных ідэяў і тэкстаў, самаапісаньне ўласнае палітычнае асаблівасьці, наданьне ўсяму гэтаму пэўнага надпабытовага значэньня. У пэўны час на сьвітанку ідэалягічнага праекту інтэлектуальная частка нават выносілася на першае месца, што мела адлюстраваньне ў шматлікіх манаграфіях і артыкулах адпаведнае тэматыкі, а таксама ў рыторыцы ўлады. Праект ідэалёгіі ўключаў у сябе пераўтварэньні на акадэмічным узроўні: стварэньне навучальных курсаў, катэдраў, распрацоўку адпаведных дасьледчых праграмаў з прэтэнзіяй на фармаваньне асобнае акадэмічнае дысцыпліны з уласным прадметам і гераархіяй статусаў. Але пасьля першаснага назапашваньня схемаў і

[5] Параўн.: Идеология белорусской государственности: проблемы генезиса и практики: Материалы Международной научной конференции (12 ноября 1998) / Мухарынский В. Пособие по идеологии. Минск, 1998; Гарохавік Я. Дзяржаўная ідэалогія.

мадэляў апісаньня сучаснае Беларусі асноўная роля належыць перайшла да інфармацыйнае работы, гэта значыць з канцэптуальнага на сымбалічны ўзровень. Такая зьмена акцэнтаў зьяўляецца галоўным і чаканым фактам эвалюцыі ідэалягічнага праекту з 2003 па 2006 г.

Ініцыяцыя праекту ідэалёгіі на мэтадалягічным сэмінары 2003 г.[6] сутыкнулася зь дзьвюма асноўнымі вэрсіямі разуменьня праблемы. Адна частка функцыянэраў выступала супраць ужываньня тэрміну «ідэалёгія» і прапаноўвала весьці гаворку пра «інфармацыю», «інфармацыйную работу». Другая разумела ідэалёгію ня столькі як інфармацыйны, колькі як інтэлектуальны праект, фармаваньне пэўнае сыстэмы ідэяў, унікальнасьці існага рэжыму, нават фармуляваньне культурнае і палітычнае місіі для Беларусі ў маштабах рэгіёну. Пасьля сярод прыхільнікаў другой пазыцыі, якая ў выніку адчувальна больш моцнаю і вызначыла на першых этапах разгортваньня праекту, не было ні канцэптуальнага, ні каштоўнаснага адзінства, а розныя групы і асобы выступалі як канкуруючыя за новыя фінансавыя і палітычныя рэсурсы, што адкрывалі ў выніку разгортваньня гэтага шырокага праекту. У выніку ідэалягічны праект зрабіў магчымым пэўнае пераразьмеркаваньне статусаў на акадэмічным і частка палітычным полі. Не аналізуючы гэты працэс дэталёва, трэба адзначыць, што збольшага ідэалягічныя практыкі спрычыніліся да ўзмацненьня «артадаксальных» асобаў і групаў «аўтарытарнай арыентацыі»[7] (асабліва ў гуманітарных навуках), а таксама да павышэньня значэньня палітычнай лаяльнасьці (актыўнай падтрымкі) для акадэмічнай дасягальнасьці. Гэта спалучылася з наданьнем дзяржаваю гуманітарыям ідэалягічных функцыяў, а адсюль — з пачаткам абавязковай работы ў гэтым кірунку, прынамсі на ўзроўні інстытуцыяў, нават са зьяўленьнем адпаведнага паняцьця — «ідэалягічная эфэктыўнасьць» (інстытуту, дысцыпліны). Мела месца таксама агульнае пагаршэньне клімату і пашырэньне палітыкі страху. Такім чынам, ідэалягічны праект непасрэдна закрануў значную частку акадэмічнае супольнасьці і палітыку ў сфэры

— Минск, 2002; О совершенствовании идеологической работы и мерах по ее совершенствованию — Минск, 2003.

6 Матэрыялы сэмінару выдадзеныя асобнай кнігай, якая ўжо стала бібліяграфічнай рарытэтам. Праграмныя дакумэнты ідэалягічнага праекту: О совершенствовании идеологической работы и мерах по ее совершенствованию. Материалы семинара руководящих работников республиканских государственных

гуманітарнае навукі ўвогуле.

органов. — Минск, 2003.

КАНСТРУЯВАНЬНЕ ІДЭІ (ІДЭАЛЁГІЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ)

[7] Гэтае азначэньне ўмоўнае.

Ад пачатку стварэньне ідэалёгіі беларускае дзяржавы як ідэі і інтэлектуальнага прадукту было дэцэнтралізаваным, а сам прадукт — разнастайным. Мела месца архаічнае ўзнаўленьне савецкага канону (адпаведных палітычных шаблёнаў, клішэ, інтэнцыяў рэабілітацыі таталітарнай сыстэмы, сакральных фігураў савецкага пантэону) і спробы мадыфікацыі панрусісцкіх гістарычных і палітычных мітаў (трэба сказаць, дастаткова абмежавана). Але ў асноўным атрыманы прадукт (гэта тычыцца як асобных артыкулаў, так і манаграфіяў) ня меў супольнае стылістыкі, а тэматыка вагалася ад прапагандысцкае практычнасьці да выкладаньня абстрактных тэарэтычных схемаў. Істотнай інтэлектуальнай падзеяй «канструяваньне ідэі» не зрабілася, прынамсі, ня ўзьнікла тэкстаў, якія сталі б легітымнымі для ўсяго поля ідэалягічнае вытворчасьці і тым больш цікавымі для шырэйшае аўдыторыі[8]. Большай часткай эфэктыўнасьць інтэлектуальнага боку ідэалягічнага праекту была нізкая, а зьмест адпаведных выданьняў не выклікаў асаблівых эмоцыяў у шырокіх колах ляяльнай і тым больш неляяльнай інтэлігенцыі. Галоўным здабыткам для практыкі канструяваньня ідэі можна назваць толькі інтэграцыю ў палітычную мову і афіцыйны акадэмічны ўжытак некалькіх канцэптаў і схемаў: «беларуская мадэль (эканомікі, права, палітыкі)», «карпарацыя», «цывілізацыйны выбар», «ідэалёгія як элемэнт любой дзяржавы», «незалежнасьць/сувэрэнітэт як каштоўнасьць» і г. д. Асабліва можна адзначыць агучваньне і цыркуляцыю ў асяродках адміністрацыйнае эліты розных ідэяў пра Беларусь як «карпарацыю». Акрамя гэтага, можна згадаць самаапісаньне і канцэптуалізацыю фэномэну аўтарытарнае Беларусі, кадыфікацыю праекту новае беларускае ідэнтычнасьці.

Праект распрацоўкі ідэалёгіі беларускае дзяржавы меў шэраг іншых істотных праблемаў, сярод якіх варта адзначыць адсутнасьць легітымных базісных тэкстаў, якія б неўзабаве ўключаныя ў дастаткова складанае поле канкурэнцыі ідэалягічным полі. Спробы ўвесьці ва ўжытак такія тэкстаў

[8] Паказальная была да канца 1990-х гг. і

мелі посьпеху. Як ужо было адзначана, сама па сабе кніга ўсё яшчэ
праца ня стала ўсеагульнай інтэлектуальнай падзеяй. Ю. Шаўцова.
Палітычная канкурэнцыя ў полі ідэалягічнае вытворчасьці была
дастаткова складанай, што не спрыяла творчасьці, а вэрсіі
ідэнтычнасьці і ідэалёгіі прапаноўваліся вельмі розныя — ад
рудымэнтаў саветызму да «грамадзянскага патрыятызму» ці
ўвогуле імкненьня адысьці ад жорсткае ідэнтыфікацыі.

Зь вясны 2003 г. прапаноўваліся розныя мэханізмы легітымацыі
тэкстаў. Найбольш лягічнай зь бюракратычнага і палітычнага
пункту гледжаньня падавалася прапанова стварыць канон
ідэалёгіі з тэкстаў А. Лукашэнкі. Але, як вядома, прэзыдэнт
аказаўся ня здольны на прадукаваньне ўласных тэкстаў,
нягледзячы на шматлікія прапановы з боку атачэньня[9], таму
справа далей за выданьне розных эклектычных зборнікаў
прамоваў і выступаў не пасунулася (пры тым што аўтарства
прамоваў, відавочна, не належала прэзыдэнту ў поўнай
ступені). Корпус «клясычных тэкстаў» зь мінулых эпох таксама
адсутнічаў, спробы рэанімацыі савецкае традыцыі выглядалі
бездапаможна, а беларуская нацыянальная традыцыя
адназначна апазнавалася як непрымальная. Адзіным
легітымным корпусам ідэяў, сымбаляў і тэкстаў была героіка
Вялікай Айчыннай вайны, і ў меру магчымага яна
эксплюатавалася бязьлітасна, але гэтага для стварэньня хоць
бы часткова завершанага ідэалягічнага ўнівэрсу, відавочна,
недастаткова. Прапановы зацьвердзіць базісныя ідэалягічныя
тэксты праз рашэньні ўсебеларускага народнага сходу ці
нарматыўныя акты прэзыдэнта або парлямэнту не знайшлі
падтрымкі[10].

Акрамя дэфармацыі афіцыйнай акадэмічнай сфэры, працэс
канструяваньня ідэі непасрэдна паўплываў на сыстэму
адукацыі і сумежныя практыкі. Асноўнае месца тут
выкладаньню адмысловага курсу «Ідэалёгія беларускай
дзяржавы». Курс быў уведзены для абавязковага вывучэньня
студэнтам усіх вышэйшых навучальных установаў з 2003/2004
навучальнага году, арганізацыя навучальнага працэсу
ўскладзеная на гуманітарныя катэдры, элемэнты курсу
інтэграваныя ў сыстэму сярэдняе адукацыі. Акрамя
межах кваліфікацыйнага экзамэну пры паступленьні на

[9] Сваёй кнігі, як вядома, Аляксандар Лукашэнка так і не выдаў.

дзяржаўную службу былі ўведзеныя пытаньні з курсу ідэалёгіі беларускае дзяржавы». Зьмест курсу часткова апісваўся ў цэлым характарызуецца эклектычнасьцю, пры гэтым рэальны зьмест моцна залежыць ад выкладчыка. Самі падручнікі па ідэалёгіі беларускай дзяржавы ўяўляюць сабой дастаткова разнародную сумесь з заходняе паводле паходжаньня паліталёгіі, краіназнаўства і назойлівых прапагандысцкіх тэкстаў (савецкага і сучаснага паходжаньня), з асобнымі дадаткамі філязофскіх (з практычна абавязковаю данінаю марксізму-ленінізму), эканамічных і гістарычных фрагмэнтаў[11]. У афіцыйных заявах на працягу 2004—2005 гг. неаднаразова гаварылася пра неабходнасьць павышэньня якасьці падручнікаў і ідэалягічнай работы са студэнтамі ўвогуле.

У 2003—2004 гг. меў месца сапраўдны бум у галіне вытворчасьці тэкстаў, зьвязаных з выкладаньнем і дасьледаваньнем ідэалёгіі. Колькасьць манаграфіяў, падручнікаў і артыкулаў была значнай, што адлюстроўвала, з аднаго боку, наяўнасьць значнага дзяржаўнага заказу, з другога — зьяўленьне пэрспэктыўнае для кар'ернага росту і назапашваньня палітычнага капіталу тэмы. Папулярнасьць тэмы была зьвязаная і з тым, што афіцыйнаму акадэмічнаму полю вытворчасьць ідэалягічнае прадукцыі для акадэмічных структураў стала неабходнай дзеля захаваньня статусу. У 2005 г. колькасьць выданьняў пачынае падаць, што адлюстроўвае перавытворчасьць і агульнае згортваньне ідэалёгіі як інтэлектуальнага праекту, відаць, гэтая тэндэнцыя захаваецца і надалей.

«ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА САВЕЦКАГА НАРОДУ»

Вялікая Айчынная вайна стала важным элемэнтам ідэалёгіі ў 2004—2005 гг., галоўным чынам з прычыны жаданьня ўладаў эксплюатаваць гэты сымбалічны пласт нацыянальнае сьвядомасьці з дэманстрацыяй «вернасьці памяці народу». Акрамя гэтага, у рамках ідэалягічнае кампаніі падкрэсьлівалася пагроза забыцьця і перапісваньня гісторыі ды

(Тудзелёвіцы) і ўсё вышэй і

10 Збольшага гэта мела рацыянальную аснову. Малаверагодна, каб калектыўны орган мог прыняць «рэфлексійны тэкст» хутчэй дакумэнт падобны да бюракратычнай праграмы ці нарматыўнага акту (гэта значыць малазьмястоўны, нецікавы для чытаньня дакумэнт зь перавагаю агульных выразаў).

11 Гэта агульны кантэкст, які мае адпаведныя аўтарскія варыяцыі.

12 Былі выдадзены адпаведныя падручнікі для школы і ВНУ. Рэцэнзію на іх гл.: Корбут, Віктар. Культура вайны // ARCHE. № 2, 2005.

страты набыткаў Перамогі (улада такім чынам выступіла галоўным і адзіным абаронцам Перамогі). Фармальнай падставаю для актуалізацыі памяці пра мінулую вайну стала сьвяткаваньне 60-годзьдзя вызваленьня Беларусі ад нямецкіх войскаў у 2004 г. і заканчэньня Другой сусьветнай вайны (перамогі савецкага народу ў Вялікай Айчыннай вайне) у 2005-м. Праз год пасьля зьяўленьня курсу «Ідэалёгія беларускай дзяржавы», у 2004/2005 навучальным годзе ў школах і ВНУ быў уведзены абавязковы курс «Вялікая Айчынная вайна савецкага народу»[12], які ад пачатку разглядаўся як ідэалягічны праект. Прадмет зьяўляецца дастаткова спэцыфічным прадуктам палітыкі «захаваньня памяці» ў Беларусі: з аднаго боку, ён прызначаны для выхаваньня патрыятызму і павагі, з другога — актыўна прывязвае беларускі кантэкст да «савецкага народу», што спалучалася з разнастайнай апалягетыкай палітыкі СССР.

«БЕЛАРУСЬ — НАША РАДЗІМА»

Сярод іншых ідэалягічных акцыяў у сфэры адукацыі варта адзначыць выданьне кнігі «Беларусь — наша Радзіма. Падарунак Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі першаклясьніку». Калі «Ідэалёгія беларускае дзяржавы» і «Вялікая Айчынная вайна савецкага народу» прызначаліся для моладзі старэйшага ўзросту, то новая акцыя была разьлічаная на пачатковую школу. Зьмест дапаможніка ўключае ідэалягічна стылізаваную кароткую інфармацыю пра Беларусь і накіраваны на выхаваньне адмысловага «патрыятызму і грамадзянскасьці». Кніга складаецца з дваццаці тэматычных разьдзелаў і пачынаецца са звароту А. Лукашэнкі да першаклясьнікаў, утрымліваецца таксама тэкст гімну, выявы афіцыйных сымбаляў, адміністрацыйная карта Беларусі з інфармацыяй пра асобныя рэгіёны, а таксама сьціслыя гістарычныя зьвесткі.

Упершыню акцыя распаўсюджваньня каляровага ілюстраванага навучальнага дапаможніка для першаклясьнікаў прайшла ў 2004 г. і была прызнана пасьпяховай. Акцыя праводзілася 1 верасьня ва ўсіх школах краіны ў рамках тэматычнага ўроку «Я — грамадзянін Рэспублікі Беларусь»[13]. У 2005 годзе акцыя

была праведзена паўторна (для больш чым 80 тысяч першаклясьнікаў). Была пастаўлена задача пашырэньня ў 2006 праекту і на старшых школьнікаў.

ДАМІНАВАНЬНЕ СЫМБАЛІЧНАГА ЎЗРОЎНЮ



Гэты вобраз, дарэчы, ілюстраваны на плакатах «За Беларусь».

Нягледзячы на імкненьне ўплываць на працэсы сацыялізацыі беларусаў, а таксама на інтэлектуальнае поле, асноўны цяжар ідэалягічных практык прыпадае на распрацоўку палітычнае рэклямы, лёзунгаў і інфармацыйную работу. Калі на першых этапах ідэалягічнага праекту адчувалася пэўнае захапленьне тэарэтычнымі канструкцыямі (канструяваньнем ідэі), то імкненьне да палітычнай эфэктыўнасьці прывяло да дамінаваньня на полі ідэалягічнае вытворчасьці СМІ і прапагандысцкіх структураў. Напачатку частка ідэалягічнага апарату спрабавала лабіраваць рэанімаваньне традыцыйных савецкіх мэтадаў працы: сустрэчы ў калектывах, лекцыі адмысловых прапагандысцкіх таварыстваў — але сацыялягічныя дасьледаваньні звычайна паказвалі значную неэфэктыўнасьць такіх акцыяў. Яны захавалі сваё пэрыфэрыйнае значэньне (у прыватнасьці, дзейнасьць таварыства «Веды»), але цэнтральная роля ўжо з канца 2003 г. надавалася СМІ, асабліва ў кантэксьце палітычных кампаній 2004 і 2006 гг. Гэта суправаджалася ростам дзяржаўных фінансавых і іншых інвэстыцыяў у інфармацыйныя праекты і павышэньнем тэхналягічнага ўзроўню апошніх. Такім чынам, асноўная нагрузка ў ідэалягічных практыках кладзецца на вытворчасьць палітычных сымбаляў, лёзунгаў, кароткіх канцэптаў і іншага прадукту, які можа быць хутка распаўсюджаны праз СМІ. Сымбалічны ўзровень у праекце ідэалёгіі дамінуе над канцэпцыямі і тэорыямі, а тэхналёгія — над зьместам, што цалкам натуральна, зыходзячы з пазыцыяў палітычнае мэтазгоднасьці. Такая сытуацыя цалкам вызначаецца структураю сучаснага беларускага грамадзтва, кантроль над якім найбольш эфэктыўна дасягаецца празь дзейнасьць СМІ, а не празь іншыя сродкі ідэалягічнае работы. Яшчэ раз зазначым, што такая сытуацыя зьяўляецца лягічнай, бо такое функцыянаваньне ідэалёгіі ўласьціва сучаснаму грамадзтву.

Праект ідэалёгіі як канструяваньня корпусу ідэяў у асноўным ня быў пасьпяховы, але на ўзроўні вытворчасьці рэклямнага прадукту і прапаганды дазволіў дасягнуць прынамсі часовае палітычнае эфэктыўнасьці і забясьпечыць высокі ўзровень мабілізацыі адміністрацыйнага апарату ды значнай часткі насельніцтва. Паміж палітычнымі кампаніямі рэйтынг улады быў высокі і стабільны, што ў пэўнай (а магчыма, і значнай) ступені было прадвызначана шчыльнай ідэалягічнай кампаніяй у СМІ.

ДЭЛЕГАВАНЬНЕ ІДЭАЛЯГІЧНЫХ ФУНКЦЫЯЎ

У адпаведнасьці з прынцыпамі дзяржаўнай палітыкі, аб'яўленымі з 2003 г., ідэалёгія (ідэалягічная работа) пачынае разглядацца як важная функцыя дзяржаўных і ляяльных дзяржаве структураў. Фактычна ідэалёгія пачынае лічыцца неабходным і важным дадаткам да асноўнае дзейнасьці, што аказвае свой уплыў на функцыянаваньне дзяржаўнага апарату. Больш за тое, ідэалягічныя функцыі ўскладаюцца і на недзяржаўныя структуры. Такім чынам, ідэалягічная практыка сталася мэханізмам падтрымкі ўсёй беларускай сыстэмы і важнай формай выказваньня ляяльнасьці да яе. Поруч з дэлегаваньнем ідэалягічных функцыяў практычна ўсім дзяржаўным структурам, для каардынацыі адпаведнай дзейнасьці, былі створаныя спэцыялізаваныя інстытуты.

СТРУКТУРА ІДЭАЛЯГІЧНАГА АПАРАТУ

Неабходнасьць стварэньня спэцыялізаваных дзяржаўных структураў для ажыцьцяўленьня ідэалягічнае і палітычнае дзейнасьці ў інтарэсах уладнае групоўкі абмяркоўвалася на базісным сэмінары ў сакавіку 2003 г., і адпаведнае рашэньне было прынятае. Вызначэньне дакладнае арганізацыйнае структуры новага ўтварэньня і абмеркаваньне дэталяў заняло практычна год. Першае абмеркаваньне праекту ўказу прэзыдэнта «Аб удасканаленьні кадравага забесьпячэньня ідэалягічнае работы ў Рэспубліцы Беларусь» адбылося ў жніўні 2003 г., другое — у лютым 2004-га, у выніку ўказ, з улікам заўваг і прапановаў, быў прыняты ў сакавіку 2004 г.[14]. Указ

стаў дастаткова паказальным дакумэнтам, які забясьпечыў штатны патэнцыял і дзяржаўнае фінансаваньне разгалінаванае сыстэмы, абавязкам якой зьяўляецца павышэньне папулярнасьці і палітычных пазыцыяў улады, а таксама забесьпячэньне адпаведнае палітычнае рэклямы. Ад моманту свайго стварэньня ідэалягічная вэртыкаль пачала выконваць значныя палітычныя функцыі на месцах. Акрамя гэтага, указ вызначыў пэрсанальную адказнасьць кіраўнікоў дзяржаўных і іншых арганізацыяў Беларусі за стан ідэалягічнае работы ў калектывах (фактычна, за ўзровень палітычнае ляяльнасьці), адпаведна непасрэдная арганізацыя ідэалягічнае работы была ўскладзеная на аднаго з намесьнікаў кіраўніка, які зьяўляецца элемэнтам ланцуга ідэалягічнае вэртыкалі.

Штатная колькасьць супрацоўнікаў ідэалягічных аддзелаў выканкамаў (уласна ідэалягічнай вэртыкалі) выглядае наступным чынам (без уліку тэхнічнага пэрсаналу). Упраўленьні ідэалягічнай работы абласнога ўзроўню ў Менску налічваюць 15 чалавек кожнае — у суме, такім чынам, 105 штатных адзінак. Аддзелы ідэалягічнай работы ўпраўленьні раённых выканкамаў укамплектаваныя трыма-шасьцю работнікамі (у залежнасьці ад колькасьці насельніцтва), аддзелы ідэалягічнай работы мясцовых адміністрацыяў раённых гарадах — чатырма чыноўнікамі[15]. Такім чынам, колькасьць работнікаў ідэалягічнае вэртыкалі «базавага ўзроўню» складае недзе 750—800 чалавек. Калі ўлічыць супрацоўнікаў адпаведнага ўпраўленьня Адміністрацыі прэзыдэнта, агульная колькасьць дзяржаўных чыноўнікаў, якія займаюцца выключна ідэалягічнай і палітычнай работай у павышэньні папулярнасьці, рэклямаваньні існага рэжыму, у краіне набліжаецца да тысячы чалавек. Пры гэтым тут ня ўлічаныя галоўныя рэдактары і супрацоўнікі дзяржаўных СМІ (якія таксама ўключаюцца ў склад ідэалягічных работнікаў), супрацоўнікі спэцыялізаваных ідэалягічных аддзелаў у міністэрствах і іншых дзяржаўных органах, на дзяржаўных прадпрыемствах і ў арганізацыях, што фінансуюцца зь дзяржаўнага бюджэту. Таму агульная колькасьць асобаў, засяроджаных на палітычнай рабоце ў падтрыманьні існае палітычнае сыстэмы, дзейнасьць якіх фінансуецца зь дзяржаўнага бюджэту, складае некалькі тысяч чалавек[16]. Прызначэньне на пасады кіраўнікоў ідэалягічнае вэртыкалі

[14] Указ № 111 прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь аб удасканаленьні кадравага забесьпячэньня ідэалягічнай работы ў Рэспубліцы Беларусь ад 20 студзеня 2004 г.

[15] Менш за 20 тысяч чалавек — тры адзінкі; ад 20 да 50 тысяч чалавек — чатыры адзінкі; ад 50 да 100 тысяч чалавек — пяць адзінак; 100 і больш тысячы чалавек — шасьць адзінак.

[16] Трэба

таксама мае асаблівасьці. Прызначэньне кіраўнікоў адзначыць, што частка супрацоўнікаў ВНУ, галоўных рэдактараў нацыянальных СМІ, павінна ўзгадняцца з Адміністрацыяй прэзыдэнта. Кандыдатуры кіраўнікоў базавага ўзроўню, галоўных рэдактараў мясцовых дзяржаўных СМІ і, што паказалася, намесьнікаў кіраўнікоў, якія арганізуюць ідэалягічную работу на прадпрыемствах з колькасьцю работнікаў звыш тысячы чалавек, узгадняюцца з абласнымі выканкамамі і Менскім гарвыканкамам. Прызначэньне кіраўнікоў у ідэалягічнай сфэры больш нізкага ўзроўню абавязкова ўзгадняецца з раённымі (гарадзкімі) выканаўчымі органамі.

Арганізацыйна ідэалягічныя структуры ствараліся на аснове інфармацыйных аддзелаў і ўпраўленьняў, у назвах якіх слова «інфармацыя» замянялася на словазлучэньне «ідэалягічная работа». Уладамі неаднаразова падкрэсьлівалася, што стварэньне ідэалягічнае вэртыкалі не прывядзе да росту дзяржаўных выдаткаў, але малаімаверна, каб гэта адпавядала праўдзе. Пры гэтым трэба адзначыць, што дэ-факта выканаўчыя структуры займаліся ідэалягічнай ды палітычнай работай і да гэтага часу, толькі ў менш цэнтралізаванай і спэцыялізаванай форме.

ІНШЫЯ ІДЭАЛЯГІЧНЫЯ ФУНКЦЫІ

У адпаведнасьці з сучасным станам палітычнае сыстэмы ідэалягічныя функцыі выконваюць ня толькі спэцыялізаваныя дзяржаўныя структуры, але і іншыя дзяржаўныя і напаўдзяржаўныя фармаваньні; вядзеньне такое працы разглядаецца як важная праява ляяльнасьці да існае сыстэмы ўлады і яе палітыкі. Акрамя гэтага, ідэалягічны праект выкарыстоўваецца для рэалізацыі палітычных і эканамічных інтарэсаў[17].

Ідэалягічная функцыя СМІ неаднаразова падкрэсьлівалася ў афіцыйнай інфармацыі і прамовах, таму ў пераважнай большасьці выпадкаў такая функцыя для дзяржаўных газэтаў, радыё і тэлеканалаў успрымаецца як натуральная і фармальна верасьні 2003 г. на сустрэчы з прадстаўнікамі СМІ прэзыдэнт

[17] Дзейнасьць ухваў фармальна

аб’явіў, што «сродкі масавае інфармацыі сёньня — гэта прыблізна ўсё інструмэнт правядзеньня дзяржаўнае ідэалёгіі, і наваю дзейнасьць яны павінны будаваць з улікам гэтых функцыяў». Падчас прызначэньня на пасаду старшыні Белтэлерадыёкампаніі У. Мацьвейчука быў адзначаны ягоны «неацэнны досьвед у тут сфэры ідэалёгіі», якога ня мае ніводзін зь дзейных чальцоў ураду, і г. д. Разуменьне СМІ як элемэнту дзяржаўнае ідэалягічнае работы зьяўляецца цяпер хутчэй стандартным не толькі не адмаўляецца, але і пастаянна падкрэсьліваецца. Нават кадравыя зьмены ў кіраўніцтве агульнанацыянальных дзяржаўных СМІ называюцца прызначэньнямі ў ідэалягічныя сфэры[18]. Ідэалягічная функцыя СМІ таксама часта называецца з інфармацыйным супрацьстаяньнем, «абаронаю» ва ўмовах інфармацыйнай вайны, якая вядзецца супраць Беларусі, што спалучаецца з заявамі, што роля ідэалёгіі ў жыцьці беларускай дзяржавы павінна павышацца[19].

Акрамя СМІ, ідэалягічныя функцыі дэлегуюцца і іншым інстытутам, нават тым, якія фармальна не зьвязаныя з прэзыдэнтам дачыненьнямі падпарадкаваньня (трэба адзначыць, што праект беларускае ідэалёгіі пазыцыянуецца як «агульнадзяржаўны», таму дзейнасьць у ягоную падтрымку абавязак усіх дзяржаўных органаў). Правядзеньне ідэалёгіі беларускае дзяржавы («а значыць, і забесьпячэньне палітычнай стабільнасьці грамадзтва») у войску і праваахоўных органах ускладаецца на афіцэраў[20]. У ідэалягічную работу ўключаны галіновыя і іншыя прафсаюзныя арганізацыі. На зьезьдзе БРСМ (верасень 2005 г.) прапаганда асновы ідэалёгіі дзяржавы была названа А. Лукашэнкам важным кірункам дзейнасьці гэтае моладзевае арганізацыі. Паказальным зьяўляецца ня тое, што гэтыя структуры выконваюць ідэалягічныя функцыі (дэ-факта яны іх выконвалі і да гэтага), адкрытае аб’яўленьне пра *абавязкі* і *адказнасьць* за гэтую актыўнасьць у гэтай сфэры. Адпаведныя задачы ўскладаюцца на рэктараў ВНУ («выхаваньне стала асобым і надзвычай важным напрамкам ідэалягічнай работы»), міністэрствы адукацыі, культуры, інфармацыі і г. д.[21]. Выключэньнем не зьяўляецца і заканадаўства галіны.

У зваротах прэзыдэнта да беларускага народу і нацыянальнага сходу Беларусі за 2005 г., дзе давалася ўказаньня фармальна незалежнаму органу, першай мэтай было

[18] 22 сьнежня 2005 г. А. Зянюк быў прызначаны старшынём Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі, Ю. Княтка — генэральным дырэктарам ЗАТ «Сталічнае тэлебачаньне».

[19] Паводле слоў прэзыдэнта, новыя кадравыя прызначэньні не выпадкова закранулі сфэру ідэалёгіі: «Сёньня супраць Беларусі, і вы гэта выдатна ведаеце, разьвязана сапраўдная інфармацыйная вайна. Роля ідэалёгіі ў нашай дзяржаве будзе павышацца. Электронныя СМІ зайсёды былі ў эпіцэнтры барацьбы і процістаяньня. Пакуль мы не прайграём, але рэзервы цалкам вялікія. Трэба выходзіць на больш высокі

ўзровень у рабоце. Думаю, мы знайдзем, як супрацьстаяць такім атакі, каб гэта не адбівалася на нашых адносінах з народам і ўладай, якая іх падтрымлівае».

[20] Выступленне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнкі на сустрэчы з членамі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 5 жніўня 2005 г. // Беларусь сегодня. — 6 августа 2005 г.

[21] Аднак кіраўнік дзяржавы рэзка раскрытыкаваў некаторыя [illegible] працягнуў работу, калі рэальная справа падмяняецца напісаньнем плянаў, тлумачэньне палітыкі, што праводзіцца ў краіне, ператвараецца ў чытаньне бюракратычных лекцыяў.

[22] Зварот прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнкі з пасланьнем да беларускага народу і нацыянальнага сходу, 19 красавіка 2005.

СТАТУС ІДЭАЛЁГІІ Ў ПАЛІТЫЧНЫХ ТЭКСТАХ І ПРАГРАМАХ

У якасьці падсумаваньня разгляду фэномэну ідэалягічнай работы ў сучаснай палітычнай сыстэме Беларусі акрэсьлім статус і ролю, якія адводзяцца ідэалягічнаму корпусу. Перш-нае, што варта адзначыць, — легітымнасьць ідэалягічнае тэрміналёгіі, якая практычна не выкарыстоўваецца ў суседніх краінах. Словы «дзяржаўная ідэалёгія» ўжываюцца ў пазытыўным значэньні, а ідэалягічныя здольнасьці (ці зьвязаныя зь імі факты ў біяграфіі) дадаюць магчымасьцяў для кар'ернага росту. Калі на пачатку рэалізацыі праекту ў 2003 г. аднаўленьне ідэалягічнае рыторыкі было дастаткова нязвыклым і яе часта абыходзілі, то ў сучаснай палітычнай практыцы гэта ўжо натуральная зьява, а ўлічэньне ідэалягічных рамак зрабілася, здаецца, прывычным стылем думкі ўцягнутых у афіцыйную сфэру. Звычайна гэта аргумэнтуецца тым, што ідэалёгія зьяўляецца абавязковым элемэнтам любое дзяржавы, толькі часам яна мае лятэнтны характар, як у заходніх дэмакратыях.

Пытаньні ідэалёгіі пачалі ўключацца ў палітычныя праграмы і выступы, галоўным чынам у разьдзелы, якія тычацца культуры, духоўнага разьвіцьця і г. д. Часам ідэалёгію адносяць да аднае са «сфэраў жыцьцядзейнасьці» грамадзтва і дзяржавы, разам з палітыкай, эканомікай і навукаю (тут «ідэалёгія» часта функцыянальна замяняе «культуру»). Дзяржаўная ідэалёгія фігуруе сярод «Галоўных прынцыпаў дзяржаўнае палітыкі Рэспублікі Беларусь», у разьдзеле «Сфэра культуры і грамадзкага жыцьця». Такім чынам, фармуецца адзін з прынцыпаў палітыкі ў грамадзкай і культурнай сфэры: «У краіне ажыцьцяўляецца пасьлядоўны курс на фармаваньне ідэалёгіі беларускае дзяржавы, крышталізацыю беларускае нацыянальнае ідэі»[23]. Традыцыю адносіць ідэалёгію да «культуры» працягвае і выступ прэзыдэнта на трэцім

усебеларускім народным сходзе (сакавік 2006 г.), дзе адзначаецца, што і надалей «асаблівая ўвага будзе надавацца духоўна-культурнай сфэры грамадзтва, удасканаленьню ідэалягічнай работы». «Гэтыя тонкія матэрыі не даюць непасрэднага ўкладу ў эканоміку, але менавіта яны вызначаюць клімат у нашым грамадзтве, вызначаюць яго адзінства і цэласнасьць». У пасланьні прэзыдэнта парлямэнту (2004 г.) ідэалягічная праблематыка аднесеная да часткі, прысьвечанай «духоўнаму і фізычнаму разьвіцьцю».

Да гэтага мы адзначалі, што праект ідэалёгіі беларускае дзяржавы разьвіваецца ў двух вымярэньнях: канструяваньне ідэі/ідэнтычнасьці і прапагандысцка-інфармацыйная работа. Першае вымярэньне ажыцьцяўляецца ў межах афіцыйнай акадэмічнае супольнасьці, культурных установаў дзеля адукацыі і, на думку ўлады, інтэгруецца, а часам падмяняе ў паглынае паняцьці «культура», «духоўныя каштоўнасьці» і «духоўная сфэра» (пра што сьведчыць статус ідэалягічнае праблематыкі ў палітычных тэкстах). У акадэмічнай акрамя гэтага, ідэалёгія шчыльна інтэгруецца ў гуманітарную дысцыпліны, асабліва паліталёгію. Другое вымярэньне рэалізуецца ў прасторы СМІ, палітычнае рэклямы, прапаганды і public relations. Тут паняцьці «ідэалёгія» і «ідэалягічная работа» падмяняюць і выціскаюць паняцьце «інфармацыя». Паказальнай тут зьяўляецца рэарганізацыя ўпраўленьняў і аддзелаў інфармацыі выканаўчых органаў у структуры «ідэалягічнае работы». Гэтыя два фэномэны дастаткова рэльефна ілюструюць значэньне, статус і накіраванасьць праекту ідэалёгіі ў сучаснай Беларусі.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 12 (52) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2007/02/26
[image]

[illegible]

[image]

[image] [image] [image]

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

Андрэй Хадановіч паэт, выкладчык. Гедройць думае пра Беларусь, альбо Аўтар кнігі «Сто лі100ў Запіскі на tut.by» кантрабандыста («Наша Ніва», Логвінаў).

Увосень 1994 г. я, тагачасны студэнт БДУ, з маленькай групкай аднакурсьнікаў прыехаў у горад Люблін. Мэта візыту была высакародная. Мы ўпершыню прымерылі на сябе ролю культуртрэгераў, а папросту кажучы — кніганошаў. Адна зь люблінскіх бібліятэк бескаштоўна перадала нашай унівэрсытэцкай горы сьпісаных, але яшчэ вельмі чытэльных польскіх кніжак. Кожнаму з нас дасталося цягнуць некалькі аграмадных кніжных пакункаў. Ва ўзнагароду за альтруізм кожнаму было дазволена ўзяць у асабістае карыстаньне трохі са сьпісаных кніжак — і мы з азартам галодных капаліся ў набітых кніжкамі скрынях. Апускаю сваю радасьць навасьпечанага ўладальніка томікаў паэзіі Леапольда Стафа й Юльляна Тувіма, Яраслава Івашкевіча й Тадэвуша Ружэвіча. Скажу, што найбольш пацешыў мяне двухтомнік вершаў Чэслава Мілаша, якім я рэгулярна карыстаюся й да сёньня. А яшчэ было некалькі нумароў парыскай «Культуры», адзін зь якіх выклікаў маё шчырае захапленьне, і непадробную зайздрасьць — у калегаў.

Нумар быў малюткі — лёгка зьмяшчаўся на далоні, і яшчэ месца пагадаць па лініях рукі заставалася. Папера была

танюткая, амаль празрыстая. Ледзь угледныя літары відавочна патрабавалі люпы. Я дагэтуль тэарэтычна ведаў пра існаваньне ў сьвеце забароненай літаратуры, якую можна перавозіць празь мяжу адно кантрабандаю. Цяпер жа я сам трымаў у руках такі музэйны экспанат. То бок ён мне тады здаваўся музэйным экспанатам, бо на дварэ быў 94 год, я жыў у амаль свабоднай краіне і быў сьвята ўпэўнены, што больш нікому й ніколі не давядзецца правозіць літаратуру ў Беларусь нелегальна.

Тады я толькі-толькі пазнаёміўся з забойча-іранічным вершам Адама Міцкевіча «Exegi munimentum» з радкамі *«Stąd mimo carskich groźb, na złość strażnikom ceł / Przemyca w Litwę Żyd tomiki moich dzieł»*. Я тады яшчэ блізка не атаясамляў сябе з такім габрэем-культуртрэгерам. Шмат што ў вершы я палічыў паэтычным перабольшаньнем, пасмакаваў вобраз моладзі, што чытае «прарока» ў Менску й Наваградку. Уявіў сабе сёньняшніх жыхароў Менску й Наваградку за чытаньнем Міцкевіча ў арыгінале — ды хоць бы і ў перакладзе! — і сумна ўсьміхнуўся. Але нешта ў гэтым вершы зачароўвала — а найперш сам вобраз паэтычнага мройцы, што, фізычна знаходзячыся ў Парыжы, будуе адтуль польскую, літоўскую, беларускую «крэпасьць» — чытай «дзяржаву». Потым, падчас чытаньня супэркішэннага нумару парыскай «Культуры», а пасьля й іншых, нармальных нумароў часопісу, у маёй галаве паступова складаўся вобраз яшчэ аднаго парыскага мройцы, які, калі не збудаваў, то прынамсі выношваў у ідэях свой польскі, але таксама й беларускі, украінскі, літоўскі *munimentum*, а магчыма, нават наблізіў іх зьяўленьне. Я пра Ежы Гедройця, нязьменнага рэдактара ўсіх кішэнных і некішэнных нумароў парыскай «Культуры».

Ня буду лішні раз казаць ні пра месца нараджэньня Гедройця, ні пра безьліч плённых ідэяў, якімі абавязаныя польскія дый — што граху таіць! — беларускія інтэлектуалы гэтаму «wieszczu» (дазвольце, я ўжыву гэтае старасьвецкае й крыху запатаснае слова ў адрас Гедройця). Абмяжуюся тым, што большасьць ідэяў гэтых, як часта й бывае з прарокамі, доўгія гады ўсё ніяк не матэрыялізуюцца, дагэтуль чакаюць сваёй рэалізацыі. Я пра ідэі талерантнасьці і нексэнафобскага патрыятызму, пра адкрытасьць для дыялёгу й пабудову напраўду раўнапраўных

дачыненьняў паміж Польшчаю і яе нядаўна палітычна паўсталымі ўсходнімі суседзямі. Найперш мяне цікавіць імідж маёй краіны, а перадусім вобраз беларускай культуры ў вачах як найкультурнейшых і найцікаўнейшых палякаў, так і крыху менш рафінаваных польскіх грамадзянаў. Не прэтэндуючы на аб'ектыўнасьць і нават не стараючыся рабіць высновы, адно падзялюся «кавалкамі» ўласнага досьведу, бо іншага матэрыялу для аналізу проста ня маю.

Шмат гадоў маю гонар удзельнічаць у міжнароднай школе мастацкага перакладу «Translatorium». Маладыя перакладчыкі з Польшчы, Украіны, Беларусі, а ў апошнія гады й Расеі сустракаюцца, дэманструюць адно аднаму й абмяркоўваюць свой творчы плён. З ініцыятывы кіраўнікоў праекту выбітных інтэлектуалаў Олі Гнацюк і Адама Паморскага адным з прынцыпаў існаваньня школы ёсьць такі: кожны яе ўдзельнік гаворыць сваёй роднай мовай, а ўсе іншыя мусяць яе разумець. Ну чым вам не пераможнае ўвасабленьне ідэяў Гедройця! Пару год таму заняткі школы праходзілі ў бібліятэцы Варшаўскага ўнівэрсытэту. Памятаю адзін прыўкрасны ранак, калі групка перакладчыкаў, гучна размаўляючы па-беларуску, уваходзіла ў бібліятэку, і, здавалася, нішто не абяцала нэрвовага стрэсу. Ды раптам, як вядро халоднай вады, рэпліка адной зь бібліятэкарак, якая думала, што яе не разумеюць альбо ня чуюць: «Вось ужо гэтыя ўкраінцы! Панаехалі тут, ходзяць, а пасьля кніжкі ў бібліятэцы зьнікаюць!» Дагэтуль шкадую, што не патлумачыў ёй тады, чым беларусы адрозьніваюцца ад украінцаў, а талерантнасьць ад ксэнафобіі. Вось і думай, што горш, антыўкраінскія стэрэатыпы — ці амаль суцэльная адсутнасьць беларусаў у польскай сьвядомасьці.

Я ня згадваў бы гэтага адзінкавага выпадку, каб пару тыдняў таму ня здарыўся амаль такі самы. Мы з калегам спакойна шпацыруем па кракаўскім Казімежы, размаўляем: ён польскаю, я беларускаю. Ізноў жывое ўвасабленьне гедройцеўскага дыялёгу. І тут за намі (калі быць дакладным, то за мной) увязваецца зграйка хуліганістых з выгляду польскіх дзетак і падлеткаў. Кракаўскія гаўрошы радасна атачаюць нас і, спрабуючы перадражніць, выгукваюць: «Добрый дэнь! Добрый дэнь!» А потым нешта пра «горілку» ды іншыя тавары. У пэўны

момант мне падумалася, ці не закідаюць каменьнем? Абышлося. Я нават уступіў у дыскусію і ў жартаўлівай форме нешта ім патлумачыў. (На старасьці гадоў, калі дажыву, можа, пайду ў вулічныя прапаведнікі.) А самому згадаўся люстрана-сымэтрычны выпадак зь беларускага дзяцінства. У 88-м ці 89-м, калі я быў на спартовых зборах у горадзе Пінску, на мясцовым кірмашы было шмат палякаў, што прыяжджалі тады гандляваць у Беларусь. Адзін з маіх калегаў-спартоўцаў чамусь вельмі іх не палюбіў. Ён хадзіў на кірмаш, жартаваў і зьдзекаваўся з гандляроў, нават спрабаваў скрасьці ў іх дробныя тавары й грошы. Злоўлены на гарачым учынку й сурова асуджаны трэнэрам, ён абсалютна не разгубіўся й на заўвагу, што нельга ж так паводзіцца зь людзьмі, адказаў так, што ўсіх агаломшыў: «З гэтымі можна. Яны ж — жыды!» Апошняе слова было ўжыта яўна мэтафарычна, і цяжка вызначыць, чаго больш: антысэмітызму ці антыпольскіх настрояў — было ў гэтым ксэнафобскім кактэйлі. (Дзеля справядлівасьці адзначу, што сустрэў гэтага знаёмага гадоў пяць-шэсьць таму й паразмаўляў пару хвілінаў, але мне хапіла. Ён апавядаў, як працуе турэмным ахоўнікам на Валадарцы й як цешыцца, калі ўдаецца пачасаць аб зьняволеных кулакі. А потым за сэкунду ператварыўся ў пяшчотнага мужа й бацьку, гаворачы пра жонку й пра маленькую дачку, якая цяжка хварэе…)

Але вернемся да польска-беларускага дыялёгу. Відавочна, у апошнія гады ў Польшчы расьце цікавасьць да Беларусі. У Варшаве, Кракаве, Уроцлаве праводзяцца дні беларускай культуры. Усё болей арганізоўваецца канфэрэнцыяў і інтэлектуальных форумаў, канцэртаў, мастацкіх выставаў і літаратурных чытаньняў з удзелам беларускіх творцаў. (Праўда, на адной з такіх сустрэчаў мне давялося пазнаёміцца зь вядомым польскім літаратарам, што некалі, яшчэ зусім юнаком, пераехаў у Гданьск зь Беларусі. «Вось будзе цікавая размова», — загадзя цешыўся я. Літаратар таксама ўзрадаваўся й, дазнаўшыся маё імя, закрычаў на чысьцюткай беларускай: «Андрэй, не дурэй, не дзяры сарочку!» Вось і пагаварылі як інтэлектуалы!) Тэксты беларускіх пісьменьнікаў патроху трапляюць у польскія літаратурныя часопісы, беларускіх паэтаў пачалі запрашаць на міжнародныя паэтычныя фэстывалі. (Праўда, польскія ангельскамоўныя мадэратары ніяк не

навучацца казаць «Belarusan», а ўпарта кажуць нават не «Belarussian» — «Whiterussian».) Беларускія аўтары пачалі карыстацца пісьменьніцкай стыпэндыяй, да якой раней мелі доступ толькі нямецкія, польскія ды ўкраінскія літаратары. (Хоць адна з арганізатарак гэтага шчасьця, вельмі інтэлігентная жанчына, нядаўна спытала ў мяне, ці мяжуе Беларусь з Польшчай. Добра, што хоць дапусьціла такую магчымасьць!) У гэтым годзе ва Ўроцлаве ў выдавецтве «Kolegium Europy Wschodniej» пачала выходзіць кніжная сэрыя «Literatura Białoruska», і ваш пакорны слуга нават выпусьціў там кніжку сваіх вершаў і меў гонар удзельнічаць у кракаўскіх *targach książki.* . (Праўда, у раскладзе працы гэтага кніжнага кірмашу назва сэрыі крыху зьмянілася й гучала ўжо як «Literatura białowieska». Дарэчы, калі я запісваў гэтыя словы, функцыя праверкі артаграфіі майго нядаўна купленага ў Польшчы ноўтбука словазлучэньне «literatura biaioruska» падкрэсьліла як няправільнае, а «literatura białowieska» прапусьціла. Так што, можа, арганізатары кірмашу мелі рацыю, і мне надалей варта называцца «żubr literatury białowieskiej»?)

Што могуць зьмяніць у гэтай сытуацыі беларускія й польскія інтэлектуалы? Што могуць зрабіць пісьменьнікі, калі ў Беларусі робіцца зусім не да жартаў і пачынаюць перасьледаваць нацыянальныя меншасьці — учора габрэяў, сёньня палякаў, каго заўтра? Некалі прагрэсіўныя расейскія літаратары адказвалі на габрэйскія пагромы перакладамі габрэйскіх пісьменьнікаў з мовы ідыш на расейскую. Ня так і шмат зьмянілася з таго часу, і літаратар мае ўсё тую ж зброю, набліжаючы да рэальнасьці самыя сьмелыя ідэі парыскага мройцы Гедройця. Што можа зрабіць кожны з нас? Я, скажам, магу падрыхтаваць для польскага чытача анталёгію маладой беларускай паэзіі й падбаць пра тое, каб яе перастварылі па-польску напраўду клясныя перакладчыкі. Альбо давесьці да друку колькі кніг сучаснай польскай літаратуры па-беларуску, паэтычных і ня толькі. А потым, магчыма, цягнуць іх на сабе кантрабандаю цераз польска-беларускую мяжу, бо апасаюся, што друкавацца яны будуць усё-ткі ў Польшчы.

Ці будзе гэта ўсё мець хоць нейкія грамадзкія наступствы? (Паэзія нічога не зьмяняе ў жыцьці, казаў У. Х. Одэн.) Ці, можа,

я такім чынам проста супакойваю сам сябе, спрабую ўлагодзіць прывідаў, якія казычуць сумленьне? Так ці іначай, працытую пры канцы колькі радкоў зь вершу «Адам і Ева», напісанага Чэславам Мілашам, нобэлеўскім ляўрэатам і сталым аўтарам парыскай «Культуры», чый двухтомнік я некалі таксама шчасьліва выцягнуў са скрыні сьпісаных кніжак люблінскай бібліятэкі:

Адам і Ева чыталі пра малпу ў лазенцы,
Якая скочыла ў ванну, за прыкладам гаспадыні.
І пачала круціць — ратунку! горача! — краны.
Гаспадыня прыбегла як была ў пэньюары:
Вялікія белыя грудзі з блакітнай жылкай трасуцца.
Малпку ратуе, сядае за туалетны столік
І пакаёўку гукае: час зьбірацца ў касьцёл.

І ня толькі пра гэта чыталі Адам і Ева,
Разгарнуўшы выгодна кніжку на голых каленях.
Тыя замкі! Палацы! Агромністыя гарады!
У атачэньні пагадаў плянэтарныя аэрапорты!..

Напраўду, шмат ёсьць на сьвеце рэчаў, якія яшчэ ўчора ня сьніліся мудрагелям з самай буйнай фантазіяй. І, магчыма, ужо заўтра беларускія аўтары прынамсі паўтораць міжнародны посьпех сваіх украінскіх калегаў. Альбо мы станем сьведкамі зьяўленьня беларускага інтэлектуальнага часопісу, які будзе друкавацца ў Парыжы й нелегальна (альбо — мроіць дык мроіць! — абсалютна легальна) прывозіцца ў Беларусь. І тады выраз «literatura białoruska» будзе свабодна, не выклікаючы зьдзіўленьня, праходзіць праз горла польскага чытача й ня будзе падкрэсьліваць польскім спэлчэкерам як няправільны.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2007/03/03
[image]

ПЯТРУШКА ШУСТРАВА

Пятрушка Шустрава Прадажная Беларусь

Празь некалькі дзён пасьля г. зв. сакавіцкіх падзеяў у Менску — то бок пасьля выбараў, што выклікалі масавыя пратэсты, і пасьля разгрому намётавага мястэчка, стыхійна ўзьніклага на цэнтральнай плошчы сталіцы, — некалькі

чалавек запар даслалі мне электронныя лісты з расейскім тэкстам. Ён называўся «Дыялектыка беларускага міту». Яго аўтар — Вольга Цімохіна. Гэта ці не найлепшае апісаньне ўнутранага адраджэньня грамадзтва, якое я калі-небудзь чытала. Адзін абзац у ім навёў мяне на роздум пра зьяву, якую мне б хацелася абмеркаваць. Вось ён:

Яшчэ адзін беларускі міт — заробкі. Своечасовая іх выдача і рост абсалютна дакладна абумоўленыя вонкавымі чыньнікамі, а менавіта: вымушанай міласьцю Пуціна. Але, як слушна адзначыў у пердвыбарчым тэлезвароце апазыцыйны кандыдат Казулін, заробкі ў нас беларускія, а цэны, у тым ліку і на прадукты, эўрапейскія. Самая танная аднапакаёвая кватэра ў Менску каштуе 30 тысячаў даляраў, а «добры заробак» — 200 даляраў. Усялякія падпрацоўкі абкладаюцца рабаўніцкімі падаткамі — ад

9 да 20 %.
Так піша Вольга Цімохіна пра эканамічнае становішча беларусаў.
Але, нягледзячы на гэтыя, бясспрэчна, апраўданыя заўвагі, вялікая частка — а мабыць, і большасьць — беларусаў лічыць, што ў іх надзейнае фінансавае становішча і што дзяржава — перадусім у асобе прэзыдэнта Лукашэнкі — гарантуе ім забясьпечанасьць і стабільнасьць.
У 1970—1980-я гады фінансавая забясьпечанасьць выразна ўплывала на стабільнасьць у краінах былога савецкага блёку. Дастаткова прыгадаць масавыя выступленьні ў Польшчы, асабліва ў 1970, 1976 і 1980 гадах. Сёньня мы іх справядліва разглядаем як праявы барацьбы за свабоду, але першасным імпульсам заўсёды служыла пагаршэньне эканамічных умоваў. Аднак нельга не пагадзіцца: там, дзе стыхійна зьбіралася мноства незадаволеных грамадзянаў, што жылі за рэпрэсіўным камуністычным рэжымам, заўжды гучалі і лёзунгі свабоды.
У Чэхаславаччыне на той час было ціха. Я ня веру, што чэхам і славакам падабаўся камунізм ці што яны мелі больш свабоды ў параўнаньні са сваімі польскімі суседзямі. Але г. зв. працэс нармалізацыі, што пачаўся ў Чэхаславаччыне ў 1970 годзе і адняў у чэскага і славацкага народаў атрыманую ўвесну і ўлетку 1968 году свабоду, апроч усяго іншага, у масавым парадку разбэшчваў і падкупляў людзей. Нармалізацыйны камуністычны рэжым рабіў чэхам і славакам маўклівую прапанову: мы вам гарантуем прыстойныя заробкі, будуем аўтастрады, дамо магчымасьць набыць або пабудаваць лецішчы за горадам. За гэта вы ня будзеце наракаць і забудзецеся пра ўсялякую свабоду.
Падобная стратэгія прынесла посьпех. Гарады, што былі цэнтрамі хваляваньняў, цяпер на выходных пусьцелі: людзі разьяжджаліся на свае лецішчы, каб пабыць зь сям'ёй, зь сябрамі, заняцца садам, рознымі ўлюбёнымі справамі, адпачыць. Быў ува ўсім гэтым і іншы бок: за камуністамі ўсё было ў заўсёдным калясальным дэфіцыце, таму збудаваньне лецішча зьвязвалася ня толькі зь няспынным пошукам патрэбных тавараў, але і з самымі рознымі праявамі карупцыі. Такім чынам ледзь ня кожны чалавек уцягваўся ў не зусім сумленныя апэрацыі або дробны крадзеж зь месца працы. Іншага спосабу набыць будаўнічыя матэрыялы і інструмэнты

фактычна не было. Практычна кожнага можна было шантажаваць, практычна кожны ведаў: калі ён пачне пратэставаць, улады могуць лёгка прымусіць яго замаўчаць, прыгадаўшы дапушчаныя ім парушэньні.
Мне думаецца, існуе пэўнае падабенства паміж чэхамі і славакамі тады і беларусамі цяпер. Нездарма Цімохіна кажа пра «нэасавецкі лад жыцьця». Пасьля пачатку эканамічных пераўтварэньняў у 1990-я гады Лукашэнка таксама прапанаваў у Беларусі своеасаблівы варыянт нармалізацыі. Сярод яе складнікаў — і выгоды, якія гэтак высока цэняць шараговыя беларусы: рэгулярная выплата і нават рост заробкаў і пэнсіяў. У постсавецкія дзевяностыя падобнага не было, і дзяржаўная прапаганда без разважаньняў стала няспынна прыўзносіць гэтае дасягненьне ў СМІ.
Калі я была ў Менску перад самымі выбарамі 2003 г., мне надарылася распытаць некаторых выпадковых мінакоў сталага веку, чаму яны будуць галасаваць за Лукашэнку. «Я штомесяц атрымліваю пэнсію ў 50 даляраў», — сказаў адзін стары і запытаўся: «Вы ведаеце краіну, у якой пэнсіянэр мог бы жадаць чаго-небудзь яшчэ?» Бабулька, якая несла дахаты з кірмашу бульбу і моркву, заявіла: «Прэзыдэнт даў мне магчымасьць купіць усё, што я хачу. Дык як я магу галасаваць за апазыцыю?!»
Дзяржаўная прапаганда ўвесь час паўтарае, што ў параўнаньні з суседнімі краінамі, дзе не спыняюцца хваляваньні, Беларусь — востраў стабільнасьці і міру. Гэта прыносіць свае плады. Але добра вядома, што савецкая эканоміка не магла працаваць так, каб надоўга забясьпечваць дабрабыт уласнага народу. Ня зможа гэтага і нэасавецкая беларуская эканоміка. Без свабоднага рынку яна ня ў стане паўнавартасна разьвівацца. І хоць беларусы задаволеныя адносна малым, яно таксама мусіць аднекуль ды брацца.
Лукашэнкаўскі постсавецкі вырай з рэгулярнай выплатай пэнсіяў і заробкаў не такі надзейны, як хацелася б ягоным начальнікам. У краіне занадта вялікая доля даходаў паступае з Расеі — Крэмль прадае Беларусі газ і сырую нафту па значна ніжэйшых коштах, чым, напрыклад, дзяржавам Балтыі і Ўкраіне. Беларусь перапрацоўвае сырую нафту і прадае нафтапрадукты на Захад па сусьветных коштах.
Аднак гэтая ідылія не працягнецца вечна: «Газпром» (чытай:

расейскі дзяржапарат) абвясьціў, што да 2007 г. цэны на газ для Беларусі падымуцца да ўзроўню эўрапейскіх, г. зн. у пяць разоў у параўнаньні зь цяперашнімі. У апошнім квартале 2006 г. пастаўкі сырой нафты з Расеі на беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы скараціліся амаль на траціну. У дадатак Расея плянуе скараціць імпарт беларускіх тавараў. Паводле афіцыйнай вэрсіі, гэта адказ на абмежаваньне Менскам доступу расейскіх імпартэраў на беларускі рынак. Але насамрэч падобныя захады больш зьвязаныя з зацягненымі расейска-беларускімі перамовамі наконт супрацоўніцтва ў энэргетычнай галіне, на якім настойвае Расея. Лукашэнка трапіў у пастку: з аднаго боку, ён ня хоча псаваць дачыненьняў з расейскай дзяржавай і яе чыноўнікамі; з другога, ён ня хоча саступаць перад ціскам і згаджацца на эканамічна невыгодныя для ягоный краіны крокі. Аднак вельмі цяжка прадказаць, як доўга Лукашэнку ўдасца захоўваць фінансавую стабільнасьць пры абмежаваным доступе грамадзянаў да ўлады, калі ён пазбавіцца моцнай падтрымкі з Расеі.

У Беларусі крыху больш за сотню прыбытковых буйных прадпрыемстваў. Астатнія субсыдуюцца зь дзяржаўнага бюджэту. Усяго каля 8 % буйных і палова малых і сярэдніх кампаніяў — прыватныя. Вядома, падобнае абмежаваньне прыватнай эканамічнай ініцыятывы ў доўгатэрміновай пэрспэктыве ня можа ня шкодзіць. Але дзяржаўная форма ўласнасьці гарантуе ляяльнасьць працоўных уладзе. Нязгодныя могуць сыходзіць.

А магчымасьці знайсьці працу па-за дзяржаўным сэктарам жорстка абмежаваныя: нават прыватны бізнэсоўца (а такіх у Беларусі адносна мала) двойчы падумае, перш чым узяць на працу чалавека, вядомага сваімі апазыцыйнымі поглядамі. Застаецца дробны гандаль і «чаўночніцтва». Але дзеля гэтага трэба заплаціць за візу і прайсьці вельмі суворы памежны кантроль. Да таго ж у Беларусі існуе сьпіс «сумнеўных» асобаў, якім хоць і не забаронена езьдзіць за мяжу, але не дазваляецца нічога з сабою прывозіць.

Сёньня большасьць беларусаў заклапочаная хутчэй тым, як здабыць кавалак хлеба з кілбасой, чым цьмяным прывідам свабоды. Аднак як толькі дзяржава ня зможа больш субсыдаваць стратныя і неканкурэнтаздольныя прадпрыемствы, гарантаваць грамадзянам фінансавую забясьпечанасьць і

сацыяльную абароненасьць, людзям больш ня будзе чаго губляць. Тады, магчыма, замест дваццаці тысячаў, як пасьля сёлетніх вясновых выбараў, на вуліцы выйдзе дзьвесьце тысячаў дэманстрантаў. Акурат у гэты момант, як мы ведаем з досьведу мінуўшчыны, і зрынаюцца недэмакратычныя рэжымы.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2007/03/03
[image]

ПАВАЛ АБРАМОВІЧ

Павал Абрамовіч Хадановіч і «Люфтганза»

Product placement (згадваньне ў літаратурным творы гандлёвых марак за грошы) — зьява, не характэрная для сучаснай беларускай літаратуры і не рэгуляваная законамі свабоднага рынку. Аднак гэта ня значыць, што ў нашай літаратуры нямашака

згадак ці апісаньняў фірмовых марак, тавараў ці паслуг. Найчасьцей іх можна сустрэць у вершах **Андрэя Хадановіча**. Тут няма нічога дзіўнага, бо менавіта гэты беларускі паэт актыўна перастварае рэчаіснасьць, якая перанасычана моднымі лэйбламі і гандлёвымі знакамі: «Тваіх кішэнных / хапае роўна на шэсьць кухляў Weissbier…» («Сухі закон»), «Усе чатыры акардэаністы / зь фірмовымі

«Вэльтмайстарамі».
/ (Я бачыў
такія ў
Музэі
музычных
інструмэнтаў.)»
(«Унтэр дэн
Ліндэн») ці
«…ды на
прыборы ад
фірмы
«Прамень» /
блісьне
агнём
аднайменны
прамень»
(«Дождж
запой і
вясёлка»).

А мо я памыляюся, і «пералётныя анёлы «Люфтганзы» — тое ня проста мэтафарычны радок зь вершу Хадановіча «Прагноз надвор'я», а сапраўдны product placement?

ТАЛСТОЙ І 1863 ГОД

Напачатку
траўня 1863
году **Леў**
Талстой
пісаў да
Афанасія
Фета: «У
мяне і
пчолы, і
авечкі, і
новы сад, і
вінакурня. І
ўсё ідзе
патрошку,
хоць,
зразумела,

кепска ў
адносінах да
ідэалу». І
раптам —
безь
пераходу,
без абзаца,
быццам
думка гэтая
была
прадыктаваная
боязьзю за
сваю
маёмасьць,
гаспадарку,
хай і
далёкую ад
«ідэалу»:
«Што вы
думаеце пра
польскія
справы? Бо
справа ж
кепская, ці
ня
прыйдзецца
нам з вамі і
з Барысавым
ізноў
здымаць меч
з іржавага
цьвіка?»

Але расейская ваенная машына абышлася без 35-гадовага Талстоя: ужо ў верасьні 1863 году паўстаньне было практычна падаўленае. Паводле афіцыйных зьвестак 128 чалавек былі пакараныя сьмерцю, 12 483 — сасланыя. Застаецца дадаць, што праз два гады пасьля гэтага ў часопісе «Русский вестник» зьявілася першая частка першага тому «Вайны і міру».

БЫКАЎ І ДЫЯЛЁГ

У незавершанай аповесьці **Васіля Быкава** «Бліндаж» (Дзеяслоў. № 24. 2006) ёсьць месца, дзе стаіць аўтарскае шматкроп’е: яно зроблена там, дзе мусіла быць пазначана назва маркі цыгарэт, якія курыў нямецкі салдат. Што ж, гэты прабел здольны запоўніць любы літаратурны рэдактар. Салдаты і афіцэры вэрмахту курылі «R6», «Ernte 23», «Reval» і «Rot-Handle» — цыгарэты і папяросы асноўных марак таго

часу, і
толькі
пасьля
Сталінграду
мусілі
перайсьці на
«кардонныя»
эрзац-
папяросы.
Каб жа гэтак
лёгка можна
было
дапісаць
канцоўку
аповесьці!
Аднак тое
немагчыма.
Нават цяпер,
калі ў
літаратуры
модным
зрабілася
дапісваць-
перапісваць
клясыку,
зьмяняючы
сюжэты і
фіналы
твораў.
Адзінае, на
што пайшоў
часопіс
«Дзеяслоў»
—
«зманціраваў»
паводле
аўтарскіх
запісаў плян
заключных
частак

«Бліндажа»
(гэтая
цалкам
навуковая
праца была
зроблена
**Алесем
Пашкевічам**)
і зьмясьціў
яго ў канцы
часопіснай
публікацыі
аповесьці.
Амаль
завершаны ў
1987 годзе
твор
нарэшце
трапіў да
чытача.

Тым ня менш знайшліся людзі, якія абрынуліся на «Дзеяслоў» з крытыкай за публікацыю «Бліндажа»: на іхны погляд, рэдакцыя ня мела маральнага права друкаваць няскончаную аповесьць, нешта там «манціраваць», бо гэта прыніжае постаць пісьменьніка. Гэтыя людзі, відаць, ужо адлілі для сябе помнік Быкаву і пазалацілі яго, а цяпер старанна ахоўваюць ад усіх «нядобразычліўцаў».
Клясык, як пісаў **Юры Лотман**, заўсёды застаецца жывым, таму што скрозь віхуры стагодзьдзяў знаходзіцца ў пастаянным дыялёгу з чытачом. У тым, што наша размова з Быкавым не перарываецца, ёсьць заслуга і «Дзеяслова».

УЭЛЬБЭК І МІНЭТ

Апошнім
часам
прысьвячаць
колькі
радкоў
новым
чальцам ці

Эўразьвязу стала bon ton у эўрапейскай літаратуры. Так, у рамане каталёнца **Альбэрта Санчэса Піньёля** «У п’янкой цішыні» (2002) згадваюцца вучоныя з Кіеўскага ўнівэрсытэту, у рамане француза **Фрэдэрыка Бэгбэдэра** «Рамантычны эгаіст» (2005) апісваецца віленскі аэрапорт, наведнікі модных латыскіх клюбаў і поўня, «насаджаная на шпіль тэлевізійнай вышкі ў агромністым марозным небе Рыгі».

А ў яшчэ
аднаго
француза,
Мішэля
Ўэльбэка
(раман
«Магчымасьць
выспы»,
2005),
можна
прачытаць
пра
беларусаў,
дакладней,
беларусак.
Герой
Уэльбэка,
эстрадны
комік
Даніель,
зайшоўшы
па справах у
рэдакцыю
жаночага
часопісу,
захацеў
«зьняць»
прадстаўніцу
нашай
краіны, якая
чакала сваёй
чаргі, каб
сфатаграфавацца
для
выданьня.
Бедны
Даніель, ён
нават не
здагадваўся,
чым

абернецца
ягоная
прапанова:
мінэт
дзяўчына
ацаніла на
паўтысячы
эўра.
«Пяцьсот
эўра за
мінэт — дый
хто яна
такая, гэтая
славянка?
Тое каштуе
ад сілы
пяцьдзясят,
ня болей»,
— кідае
злосна
герой
раману
(мільянэр,
дарэчы).

Цікава, адкуль у аўтара такое ўяўленьне аб нашых жанчынах? Хутчэй за ўсё, яно сфармавалася не без удзелу мас-мэдыяў. А мо і сапраўды яму стрэлася такая беларуска?..
Уэльбэк, чые кнігі карыстаюцца попытам сярод інтэлектуалаў розных краінаў сьвету, некалькімі радкамі тэксту ператварыў у пыл тыя вялікія грошы, якія беларускае кіраўніцтва выдаткоўвае на стварэньне пазытыўнага іміджу краіны. Хоць, зрэшты, адмоўная рэкляма — таксама рэкляма.

БАГУШЭВІЧ І ЧУЖЫЯ ГРОШЫ

У лісьце да
Яна
Карловіча,
напісаным у
1885 г.,
Францішак

Багушэвіч распавёў пра «ненатольнае жаданьне знайсьці на вуліцы згубленыя кімсьці (ня думаючы пра тое, хто згубіць) грошы на заспакаеньне маіх патрэб». «Дык вось тое жаданьне знайсьці столькі згубленых грошай, колькі мне трэба, — дзяліўся далей патаемнымі думкамі аўтар «Дудкі беларускай», — даходзіла да маніі, і мне ўрэшце здавалася, што я павінен знайсьці, бо інакш здабыць іх ня мог,

нягледзячы на ўсе свае высілкі, а прасіць ці ўкрасьці ня мог».

Прырода чалавека не зьмяняецца: мара знайсьці грошы, «ня думаючы пра тое, хто згубіць», ва ўсе часы вярэдзіла людзкую душу. Пісьменьнікі і літаратурныя крытыкі тут не выключэньне. Галоўнае, ня быць скнарай і, уважліва гледзячы пад ногі, прагнуць знайсьці столькі грошай, колькі трэба на гэты момант. Тады абавязкова пашчасьціць. Як Багушэвічу: у час студэнцтва яму тэрмінова спатрэбіліся два рублі, і ён знайшоў іх на Васілеўскай высьпе.

БУЛЕ І ЗМАГАНЬНЕ З КЛЯСЫКАЙ

Перакладчык **Ота Буле** ў артыкуле «Складаны продаж: расейская літаратура ў Галяндыі» (Октябрь. № 10. 2006) распавядае пра цяжкасьці, якія напаткалі найноўшую расейскую літаратуру ў гэтай краіне. У той час, як расейская клясыка карыстаецца ў галяндцаў

нязьменным
посьпехам
(так, за
шэсьць
месяцаў
гэтага году ў
Нідэрляндах
прададзеныя
чатыры
тысячы
асобнікаў
раману
Фёдара
Дастаеўскага
«Браты
Карамазавы»,
які выйшаў
у новым
перакладзе),
кнігі
сучасных
аўтараў з
Расеі яны
набываюць
зь меншай
ахвотай (да
прыкладу, з
паўтаратысячнага
накладу
трагікамічнага
раману
Валер’я
Залатухі
«Апошні
камуніст»
пра
сацрэалістычнае
мастацтва і
жыццё
савецкага

грамадзтва ў брэжнеўскі час было прададзена толькі шэсцьсот экзэмпляраў). На думку О. Буле, пераканаць галяндцаў пры дапамозе маркетынгавых сродкаў у тым, што ім неабходна набываць творы сучасных расейскіх аўтараў, замінае «агульная тэндэнцыя сучаснай расейскай літаратуры да некаторай зацыкленасьці на абыгрываньні і дэканструкцыі савецкіх мітаў і ідэалягемаў». Як вынік, «навейшая

расейская
літаратура
часта
ўспрымаецца
як
тэматычна
занадта
вузкая, якая
хутка губляе
сваю
актуальнасьць».
Вось чаму
сучасную
літаратуру
галяндзкі
чытач
абыходзіць
увагай. У
бліжэйшы
час, мяркуе
О. Буле,
сытуацыя на
рынку ня
зьменіцца.

Гэты артыкул актуальны і для беларускай літаратуры. Нашыя пісьменьнікі займаюцца аднаўленьнем/дэмантажом савецкіх ідэяў і канцэпцыяў альбо сыходзяць у «гістарычнае» вымярэньне — пішуць пра вялікага князя Альгерда альбо правінцыйную Воршу 20-х гадоў мінулага стагодзьдзя. З аднаго боку, гэтыя пераважным чынам часопісныя публікацыі *сёньня* застаюцца невядомыя прамому адрасату — масаваму беларускаму чытачу. З другога боку, падобныя творы *заўтра* нічога ня скажуць замежнаму чытачу, як гэта ўжо адбылося ў Галяндыі з сучаснымі расейскімі літаратарамі.
Я ня веру, што айчынныя празаікі не зацікаўленыя ў тым, каб іхныя кнігі чыталі. Але яны самі асуджаюць сябе на забыцьцё, паразу. Перамогу ж ізноў будзе сьвяткаваць яе вялікасьць Кляcыка.
[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2007/03/03
[image]

Уільям Гібсан Нэўрамантык

УІЛЬЯМ ГІБСАН (William Ford Gibson, нар. 17 сакавіка 1948 г. у Паўднёвай Караліне) — канадзкі пісьменьнік, родапачынальнік літаратурнога жанру «кібэрпанк». Раман «Нэўрамантык» пасьля яго першапублікацыі у 1984 г. разышоўся на ўсім сьвеце накладам, большым за 6,5 млн асобнікаў.

Прысьвячаецца Дэб,
якая зрабіла гэты твор магчымым.
Зь любоўю.

ЧАСТКА ПЕРШАЯ
БЛЮЗ ЧЫБА-СІЦІ

Неба над портам было колеру тэлевізара, настроенага на пусты канал. «Ня тое, каб я падсеў, — пачуў Кейс чыюсьці, прадзіраючыся праз натоўп перад дзьвярыма «Чату». — Проста майму арганізму стала вельмі бракаваць гэтага рэчыва». Гэта быў голас жыхара Гігаполісу і тыповы гігаполісаўскі жарт. «Чатсуба» быў барам прафэсійных эмігрантаў, дзе можна піць цэлы тыдзень і не пачуць нават пары словаў па-японску. За стойкай гаспадарыў Рац, яго плястыкавая рука манатонна здрыгвалася, напаўняючы бочкавым «Кірынам» куфлі, якія ён ставіў на паднос. Ён убачыў Кейса і ўсьміхнуўся, паказаўшы карычневыя абломкі зубоў ды ўсходнеэўрапейскія сталёвыя пратэзы. Кейс знайшоў вольнае месца перад стойкай паміж ненатуральным загарам адной зь дзевак Лоні Зоўна і бездакорнай марской уніформай высокага афрыканца з вострымі скуламі, упрыгожанымі племяннымі шнарамі.

Здаровай рукой штурхнуўшы Кейсу напоўнены куфаль, Рац спытаў:

— Што, прыйшоў па справах?

Кейс пацiснуў плячыма. Дзяўчына каля яго захiхiкала i зьлёгку пiрганула яго локцем.

Усьмешка бармэна зрабiлася шырэйшай. Пра яго выродлiвасьць хадзiлi легенды. У эпоху агульнадаступнай прыгажосьцi ў ёй было штосьцi геральдычнае. Антыкварная рука заскрыпела, калi ён пацягнуўся па наступны куфаль. Гэта быў расейскi вайсковы пратэз, сяміфункцыйны маніпулятар зь сiлавой зваротнай сувязьзю, у нягеглым ружовым пластыкавым кажуху.

— Але ж ты i артыст, гер Кейс, — Рац рохкнуў; гэты гук служыў яму сьмехам. Ён пачухаў ружовай пластыкавай клюшняй абцягнутае белай кашуляй пуза, што перавальвалася цераз пас. — Артыст камiчнага жанру.

— Ага, — адказаў Кейс i сербануў са свайго куфля. — Трэба ж тут камусьцi быць сьмешным. I канечне, гэты чалавек ня ты.

Хiхiканьне шлюхi ўзьнялося на актаву.

— I ня ты, сястра. Так што зьнiкнi, добра? Зоўн — мой блiзкi асабiсты сябра.

Яна глянула Кейсу ў вочы i з амаль нячутным сьвiсьцячым гукам ледзь бачна зварухнула губамi, нiбы зьбiраючыся плюнуць. Але такi сышла.

— Божа, — сказаў Кейс, — што за жудасны прытон ты тут трымаеш? Чалавеку няма як выпiць спакойна.

— Ха! — адказаў Рац, працiраючы анучай падрапаную стойку. — Зоўн плацiць грошы. А табе я дазваляю рабiць тут свае справы чыста за забаву.

Калi Кейс уздымаў свой куфаль, залю раптам ахiнула тая дзiўная мiмалётная цiша, калi ў сотнi нiяк не зьвязаных мiжсобку размоваў нiбыта наступае сынхронная паўза. Тады зноў пачуўся звонкi, трохi гiстэрычны сьмех шлюхi. Рац рохкнуў.

— Анёл праляцеў.

— Кітайцы, — замычэў п’яны аўстраліец. — Гэтыя доўбаныя кітайцы вынайшлі тэхналёгію зрошчваньня нэрваў. Калі ідзецца пра нэрвы — толькі на мацярык. Адрамантуюць на ўсе сто, дружа…

— Толькі гэтага не хапала, — сказаў Кейс свайму куфлю, уся ягоная горыч раптам узьнялася ў ім хваляй жоўці. — Які бзьдзёж!

У нэўрахірургіі японцы ўжо пасьпелі забыць больш, чым кітайцы калі-небудзь ведалі. Падпольныя клінікі Чыбы былі перадавыя, іхнае абсталяваньне цалкам абнаўлялася штомесяц, але і яны не маглі нічога зрабіць з пашкоджаньнямі, якія ён атрымаў у гатэлі «Мэмфіс». Вось ужо год у Чыбе, а ён усё яшчэ марыў пра кібэрпрастору, хоць надзея штоночы чэзла. Колькі б стымулятараў ён ні ўжываў, колькі б ні лётаў у шалёным рытме жыцьця Начнога Гораду, выбіраючы самыя кароткія шляхі, яму ўсё роўна сьнілася матрыца — зіхоткія сеткі лягічных сувязяў, што разгортваюцца ў бясколернай пустэчы… Гігаполіс быў нерэальна далёка, за Ціхім акіянам, і ён ужо ня быў апэратарам, каўбоем кібэрпрасторы — так, яшчэ адзін дробны дзялок, які намагаецца выжыць. Але сны прыходзілі да яго скрозь японскую ноч, як электроннае вуду, і ён плакаў, плакаў у сьне, і прачынаўся ў цемры, самотны, скурчаны ў маленькай капсуле трунагатэлю, учапіўшыся ў пласьціну ложка, і яе тэмпэрлён выбіваўся паміж ягонымі пальцамі, што цягнуліся да няіснай клявіятуры.

— Я бачыў тваю дзяўчыну ўчора ўвечары, — сказаў Рац, падаючы Кейсу другі куфаль «Кірыну».

— У мяне няма дзяўчыны, — сказаў ён і глынуў піва.

— Міс Лінда Лі.

Кейс пакачаў галавой.

— Няма дзяўчыны? Зусім? Толькі біз, дружа артыст?

Прысьвяціў сваё жыцьцё камэрцыі? — карыя вочкі бармэна сядзелі глыбока ў маршчыністай плоці. — Ведаеш, зь ёю ты мне больш падабаўся. Ты больш сьмяяўся. Глядзі, аднойчы вечарам можаш адмачыць свой апошні жарт і скончыць у мэдкантэйнэрах, разабраным на органы.

— Ты разьбіваеш мне сэрца, Рац.

Ён дапіў піва, заплаціў і выйшаў, тулячы вузкія плечы пад вылінялым ад дажджу нэйлёнам вятроўкі колеру хакі. Прапіхваючыся скрозь запруджаную натоўпам вуліцу Нінсэй, ён адчуваў пах уласнага застарэлага поту. Кейсу было 24 гады. У дваццаць два ён быў кібэркаўбоем-хакерам, адным з найлепшых у Гігаполісе. Яго настаўнікамі былі сапраўдныя каралі рамяства — легендарныя Маккой Полі і Бобі Куін. Ён працаваў у амаль пэрманэнтным стане адрэналінавай эўфарыі, што была пабочным прадуктам маладосьці і таленту, падключаны да зробленай на замову кібэрпрасторавай дэкі, якая праецыравала яго вызваленую зь цела сьвядомасьць у калектыўную галюцынацыю, якую станавіла матрыца. Ён быў злодзеем, што працаваў на іншых, заможнейшых злодзеяў, яго наймальнікаў, якія пастачалі экзатычны софт, з дапамогай якога Кейс пранікаў скрозь яркія сьцены карпарацыйных сыстэмаў, праразаючы вокны ў багатыя інфармацыйныя палі. А потым ён зрабіў клясычную памылку, якую — і ён цудоўна гэта ведаў — ніколі нельга рабіць: ён абакраў сваіх наймальнікаў. Ён пакінуў сёе-тое сабе і паспрабаваў збыць скрадзеную інфармацыю праз скупшчыка ў Амстэрдаме. Ён дагэтуль не разумеў, як яго выкрылі, дый гэта ўжо ня мела значэньня. Тады ён чакаў сьмерці, але яны толькі ўсьміхаліся.

Ніякіх праблемаў, сказалі яны, канечне, ён можа пакінуць сабе грошы. Пагатоў, што грошы яму спатрэбяцца. Бо — усьмешкі не сыходзілі зь іх твараў — яны зробяць так, што ён ніколі больш ня зможа працаваць. Яны пашкодзілі яго нэрвовую сыстэму расейскім мікатаксінам часоў вайны. Прывязаны да ложка ў гатэлі «Мэмфіс», ён галюцынаваў на працягу трыццаці гадзінаў, яго талент выгараў мікрон за мікронам. Пашкоджаньне было мінімальнае, амаль незаўважнае, але надзвычай эфэктыўнае. Для Кейса, які жыў дзеля бесьцялеснага экстазу існаваньня ў

кібэрпрасторы, гэта было раўназначна выгнаньню з выраю. Сярод заўсёднікаў бараў, якія ён наведваў, калі яшчэ быў адчайным каўбоем, было прынята ставіцца да плоці з паблажлівай пагардай. Цела было для іх проста мясам. Цяпер Кейс стаўся вязьнем уласнай плоці.

Усё ягонае майно было хутка канвэртаванае ў новыя іены — тоўсты пачак старых папяровых банкнотаў, якія бясконца цыркулявалі ў замкнёным коле сусьветнага чорнага рынку, падобна да морскіх ракавінаў, якімі карысталіся ў якасьці грошай тубыльцы Трабрыяндзкіх выспаў. У Гігаполісе выкарыстоўваць гатоўку для разьлікаў у легальным бізнэсе было складана; у Японіі гэта ўжо было незаконна. Ён адчайна, непахісна верыў, што ў Японіі яго вылекуюць. У Чыбе. Ці то ў легальнай клініцы, ці то ў ценявым сэктары падпольнай мэдыцыны. Чыба, сынонім імплянтацыі, зрошчваньня нэрваў і мікрабіёнікі, была магнітам для тэхнакрымінальных субкультураў Гігаполісу. У Чыбе ягоны пачак новых іенаў растаў на вачах цягам двух месяцаў бясконцых абсьледаваньняў і кансультацыяў. Спэцыялісты падпольных клінік, яго апошняя надзея, захапляліся майстэрствам, зь якім яго зьнявечылі, а тады павольна качалі галовамі. Цяпер ён спаў у найтаньнейшых трунагатэлях, найбліжэйшых да порту, пад кварцава-галягенным сьвятлом, якое ўсю ноч залівала докі, як канцэртную сцэну; зьзяньне тэлевізійнага неба засьціла агні Токіё, адсюль не было відаць нават высачэзнага галяграфічнага лягатыпу «Фуджы-Электрык»; чайкі кружлялі па-над чародамі плястыкавага сьмецьця, што дрэйфавала ў чорнай пустцы Такійскага заліву. За портам ляжаў горад, па-над купаламі заводаў высіліся агромністыя тыпавыя кубы карпарацыйных аркалёгіяў. Порт аддзяляла ад гораду вузкая стужка старых вуліцаў, раён, які ня меў афіцыйнай назвы. Начны Горад, і Нінсэй — яго сэрца. Удзень бары ўздоўж Нінсэй выглядалі невыразна: наглуха закрытыя вокны, мёртвы нэон і нерухомыя галяграмы чакаюць ночы пад атрутным серабрыстым небам.

За два кварталы на захад ад «Чату», у гарбатні пад назваю «Жар дэ Тэ», Кейс запіў двайным эспрэса першую вечаровую пігулку — пляскаты ружовы васьмікутнік моцнага

бразыльскага дэксэдрыну, які Кейс набыў у адной з Зоўнавых дзевак. Сьцены «Жар» аздаблялі люстраныя панэлі, асаджаныя чырвонымі нэонавымі трубкамі. Спачатку, апынуўшыся ў Чыбе ў поўнай самоце, маючы толькі трохі грошай і яшчэ менш надзеі на вылечваньне, ён упаў у стан нейкага гранічнага пераўзбуджэньня, здабываючы новыя грошы з халоднай мэтаскіраванасьцю, якая, здавалася, належыць камусьці іншаму. У першы месяц ён забіў двух мужчынаў і жанчыну за грошы, якія год таму падаліся б яму сьмешнымі. Нінсэй зьнясільвала яго, пакуль сама гэтая вуліца не пачала здавацца яму ўцелаўленьнем жаданьня сьмерці, якім ён быў атручаны, сам таго ня ведаючы. Начны Горад быў падобны да вар'яцкага экспэрымэнту ў галіне сацыяльнага дарвінізму, арганізаванага знуджаным дасьледчыкам, які ўвесь час трымае палец на клявішы хуткай перамоткі ўперад. Варта на хвілю спыніцца, і ты бясьсьледна патонеш, але калі пачнеш рухацца захутка — парушыш далікатнае паверхневае нацяжэньне чорнага рынку і таксама зьнікнеш, і ад цябе нічога не застанецца, акрамя невыразных успамінаў у галаве напаўмэханічнай пачварыны накшталт Раца, хаця тваё сэрца, ці ныркі, ці пячонка, можа, і паслужаць якому-небудзь незнаёмцу, які мае досыць новых іенаў на трансплянтанты. Гудзеньне бізу было тут стала прысутным у падсьвядомасьці, а сьмерць была звыклым пакараньнем за ляноту, нядбайнасьць, недахоп тактоўнасьці ці парушэньне правілаў мудрагелістага пратаколу. Седзячы ў самоце за столікам у «Жар дэ Тэ» — васьмікутнік пачынаў дзейнічаць, на далонях выступілі кроплі поту, і Кейс раптам адчуў трымценьне кожнага валаска на руках і грудзях, — ён ведаў, што ў пэўны момант пачаў гуляць сам з сабою ў гульню, вельмі старажытную гульню бяз назвы, апошні пасьянс. Ён больш не насіў з сабою зброі, забываўся на звычайную перасьцярогу. Ён рабіў найбольш рызыкоўныя гешэфты проста на вуліцы і меў рэпутацыю дзялка, здольнага здабыць усё што заўгодна. Нейкая частка яго ўсьведамляла, што гэтую цягу да самаразбурэньня было выдатна відаць ягоным кліентам, якіх шторaз менела, але гэтая ж яго частка суцяшалася разуменьнем таго, што канец быў толькі пытаньнем часу. І менавіта гэтая частка, што фанабэрыста чакала сьмерці, найбольш ненавідзела думкі пра Лінду Лі. Ён пазнаёміўся зь ёю адной дажджлівай ночы ў аркадзе гульнявых аўтаматаў, пад

яркімі міражамі, што скрозь блакітную смугу цыгарэтнага дыму зьзялі галяграмамі «Замку чарадзея», «Танкавай вайны ў Эўропе», «Неба Нью-Ёрку»… І цяпер ён памятаў яе менавіта такой — заліты няўрымсьлівым лазэрным сьвятлом твар, рысы якога зьведзеныя да коду: скулы загараюцца ярка-чырвоным, калі палае замак Чарадзея, лоб заліты блакітам, калі Мюнхэн падае пад ударамі танкавай армады, вусны кранае золата, калі курсор выбівае іскры са сьценаў каньёну з хмарачосаў. Той ночы ён быў у гуморы: пакунак кетаміну, які ён атрымаў ад Уэйджа, быў на шляху да Ёкагамы, а грошы за тавар — ужо ў ягонай кішэні. Ён увайшоў у аркаду зь цёплага дажджу, што шапацеў па нінсэйскім бруку, і чамусьці адразу вылучыў яе зь дзясяткаў іншых людзей, што стаялі перад аўтаматамі; яна была цалкам захопленая гульнёй. Потым, празь некалькі гадзінаў, яе твар меў такі самы выраз, калі яна спала побач зь ім у труне партовага гатэлю; абрыс яе верхняй губы быў падобны да лініі, якой дзеці малююць птушку ў палёце. Перасякаючы прастору аркады, каб стаць побач зь ёю, усё яшчэ ўзбуджаны посьпехам апошняй зьдзелкі, Кейс заўважыў, што яна кінула на яго кароткі позірк. Яе шэрыя вочы былі неахайна падведзеныя чорным алоўкам. Гэта былі вочы зьвярка, прыкутага да месца сьвятлом фараў машыны, што імкліва набліжаецца. Іх супольная ноч перайшла ў раніцу, у квіткі на карабель на паветранай падушцы і яго першую вандроўку на другі бок заліву. Дождж над Харадзюку не сьціхаў, пакрываючы кропелькамі яе плястыкавы жакет, такійскія дзеці маршыравалі ў сваіх аднолькавых дажджавіках і белых макасінах міма вядомых бутыкаў; а потым яны апынуліся сярод паўночнага бразгату патынка-холу, і Лінда трымала яго за руку, як дзіцё. Гештальту наркотыкаў і напружаньня, у якім ён жыў, спатрэбіўся месяц, каб ператварыць яе вечна спалоханыя вочы ў бяздонныя студні патрэбы. Ён глядзеў, як яе асоба распадалася на кавалкі, раставала, нібы айсбэрг, аскепкі сплывалі прэч, і нарэшце ён убачыў голую патрэбу, галодны шкілет залежнасьці. Ён назіраў, як яна чакае прыходу ад чарговай дозы, з засяроджанасьцю, якая нагадвала яму багамолаў, якіх прадавалі з прылаўкаў на Шыга, побач з блакітнымі карпамі-мутантамі і цвыркунамі ў бамбукавых клетках. Кейс утаропіўся ў чорны круг кававай гушчы на дне філіжанкі. Круг вібраваў у рытме стымулятару, які ён прыняў.

Карычневы лямінат стальніцы быў пакрыты матавай сеткай маленечкіх драпінак. Адчуваючы, як узнімаецца па ягоным хрыбце дэксэдрын, ён уявіў сабе ўсю безьліч выпадковых узьдзеяньняў, што спатрэбіліся, каб стварыць такую паверхню. «Жар» была дэкараваная ў старамодным безыменным стылі зь мінулага стагодзьдзя, нязграбнае спалучэньне традыцыйных японскіх матэрыялаў і бледнага мілянскага пластыку, але ўсё, здавалася, было кранутае ледзьве бачным туманным налётам, быццам бы кепскія нэрвы мільёна кліентаў дзіўным чынам адбіліся на люстрах і некалі бліскучым пластыку, пакінуўшы на ўсім гэты незмывальны налёт. «Эй! Кейс, дружа…» Ён узьняў вочы і сустрэў пагляд шэрых вачэй, абведзеных алоўкам. На ёй быў выцьвілы французскі арбітальны камбінэзон і новыя белыя красоўкі.

— Я цябе шукала, дзядзька.

Яна села насупраць яго, локці паклала на стол. Рукавы яе сіняга камбінэзону былі адрэзаныя па плечы; ён аўтаматычна спраўдзіў, ці ёсьць у яе на руках сьляды дэрмаў[1] або іньекцыяў.

— Хочаш цыгарэту?

[1] Дэрм — налепка на скуру, насычаная лекавым прэпаратам [illegible]

Яна [illegible] і дала яму цыгарэту. Ён узяў, яна дала яму прыпаліць ад чырвонай пластыкавай запальнічкі.

— Ты нармальна сьпіш, Кейс? Ты выглядаеш стомленым.

Яе акцэнт сьведчыў пра паходжаньне з поўдня Гігаполісу, з раёну Атланты. Скура пад яе вачыма была бледная і нездаровая, але цела ўсё яшчэ было гладкае і пругкае. Ёй было дваццаць гадоў. У кутках яе рота, аднак, усё больш бачнымі рабіліся зморшчынкі працяглага пакутлівага напружаньня. Яе цёмныя валасы былі забраныя назад і сьцягнутыя шаўковай стужкай з малюнкам, які адлюстроўваў ці то архітэктуру мікрасхемы, ці то мапу нейкага гораду.

— Толькі калі забываюся прыняць свае таблеткі, — адказаў ён, яго накрыла фізычна адчувальная хваля нясьцерпнага жаданьня, юр і адзінота завібравалі ў ім на амфэтамінавай

частаце. Ён памятаў пах яе скуры ў гарачай цемры гатэльнай труны, яе рукі, самкнёныя на ягонай паясьніцы. Усё гэта мяса, падумаў ён, мясныя жаданьні.

— Уэйдж, — сказала яна, звузіўшы вочы. — Ён хоча бачыць цябе зь дзіркай у галаве.

Яна запаліла цыгарэту.

— Хто гэта сказаў? Рац? Ты размаўляла з Рацам?

— Не. З Монай. Яе новы хахаль — адзін з Уэйджавых хлопцаў.

— Але я ня шмат яму вінны. У кожным разе, калі ён мяне заваліць, то ўвогуле нічога не атрымае, — прамовіў Кейс, сьцепануўшы плячыма.

— Яму цяпер зашмат людзей вінныя, Кейс. Цябе могуць забіць, проста каб папалохаць іншых. Сур'ёзна, лепей будзь пільны.

— Буду. Ну а як ты, Лінда? Табе ёсьць дзе спаць?

— Спаць? — яна пакачала галавой. — Канечне, Кейс.

Яна здрыганулася, падалася да яго па-над сталом. Яе твар быў засланы потам.

— Вось, — сказаў ён і дастаў з кішэні вятроўкі памятую пяцідзясятку. Ён машынальна разгладзіў яе пад сталом, склаў учацьвёра і перадаў ёй.

— Табе яны трэба, любы. Лепш аддай яе Ўэйджу.

У яе шэрых вачах было штосьці такое, чаго ён ня мог прачытаць і чаго ён дагэтуль ніколі ня бачыў.

— Я вінны Ўэйджу нашмат больш за гэта. Вазьмі. У мяне хутка будзе яшчэ, — схлусіў ён, гледзячы, як яго іены маланкава зьнікаюць у кішэні.

— Як атрымаеш грошы, Кейс, адразу знайдзі Ўэйджа.

— Пабачымся, Лінда, — сказаў ён, падымаючыся.

— Канечне, — пад абедзьвюма яе зрэнкамі было відаць мілімэтар бялку. Санпаку[2]. — Будзь асьцярожны, добра?

Ён кіўнуў, сьпяшаючыся сысьці. Ён азірнуўся ў той момант, калі плястыкавыя дзьверы зачыняліся за ім, і ўбачыў, як яна вачэй у чырвонай нэонавай клетцы.

Пятнічная ноч на Нінсэй. Ён прайшоў паўз прылаўкі зь якіторы, масажныя салёны, кавярню сеткі «Прыгожая дзяўчына», паўз электронныя грымоты гульнявой аркады. Зрабіўшы кароткі убок, каб прапусьціць сарарымана[3] ў чорным гарнітуры, ён заўважыў лягатып «Міцубісі-Генэнтэк», вытатуяваны на тыльным баку яго правай далоні. Ці было гэтае татуяваньне сапраўднае? Калі так, падумаў ён, дзядзька шукае праблемаў на сваю галаву. Калі не, так яму і трэба. Службоўцам «М-Г» ад пэўнага ўзроўню імплянтавалі найноўшыя мікрапрацэсары, якія сачылі за ўзроўнем мутагенаў у крыві. Ад такога прыбору цябе б хутка пазбавіў... Начны Горад — адзіны з гіпотэтычных варыянтаў, у якім ніякі кіраўнік карпарацыі ня можа быць упэўнены ў пасьпяховасьці ніякіх натоўп складаўся з гайдзінаў[4]. Групкі маракоў з порту, пэрукаваныя мецэнаты пусты ў пошуках уцехаў, пра якія ня пішуць у турдаведніках, тарчкі з Гігаполісу, што выстаўляюць напаказ свае трансплянтанты ды імплянтанты, і тузін розных гатункаў дзялкоў — усе яны зьліваліся ў заблытаным танцы пажады і камэрцыі на вуліцы Нінсэй. Існавала безьліч тэорыяў, чаму Чыба-Сіці трываў у сабе анкляў Нінсэй, але сам Кейс схіляўся да меркаваньня, што якудза захоўвалі гэтае месца ў якасьці своеасаблівага гістарычнага запаведніка, напаміну аб сваіх сьціплых каранях. Але ён бачыў таксама пэўны рэзон у тэорыі аб тым, што найноўшыя тэхналёгіі мусяць мець нейкі пазазаконны палігон для сваёй абкаткі, што Начны Горад існаваў ня дзеля сваіх жыхароў, а як наўмысна некантраляваная гульнявая пляцоўка для самой тэхналёгіі. Ці мела Лінда рацыю? — думаў ён, пазіраючы на агні гораду. Ці можа Ўэйдж забіць яго проста дзеля застрашэньня іншых? У гэтым не было ніякай лёгікі, але зь іншага боку, Уэйдж займаўся ў асноўным забаронемымі біяпрэпаратамі; кажуць, трэба быць поўным адмарозкам, каб

[2] Санпаку (з японскай мэдыцыны) — стан крайняй фізычнай, псыхічнай і духоўнай спустошанасьці (дасьлоўна: «пры пустыя лёгкія»).

[3] Сарарыман — наёмны работнік японскай карпарацыі, адзін з падобных картонных персанажаў, salaried man.

[4] Гайдзін — чужаземец, неяпонец.

рабіць гэта. Але Лінда сказала, што Ўэйдж хоча бачыць яго мёртвым. Асноўным адкрыццём, якое Кейс зрабіў у галіне вулічнага бізнэсу, было тое, што ні пакупнік, ні прадавец насамрэч ня мелі ў ім патрэбы. Справа пасярэдніка — зрабіцца для сваіх кліентаў неабходным злом. Сумнеўная ніша, якую Кейс прабіў сабе ў крымінальнай экасыстэме Начнога Гораду, была створаная пры дапамозе хлусьні і пашыралася падманам і здрадай. Цяпер, калі ён адчуваў, што сьценкі гэтай нішы пачалі сьціскацца, яго п'яніла нейкая дзіўная эўфарыя. Тыдзень таму ён затрымаў перадачу сынтэтычнага залозавага экстракту, прадаючы яго ўраздроб, каб зарабіць больш, чым звычайна. Ён ведаў, што Ўэйджу гэта не спадабаецца. Уэйдж быў яго галоўным пастаўшчыком. Уэйдж правёў у Чыбе дзевяць гадоў і належаў да тых нешматлікіх дылераў-гайдзінаў, якім удалося завесьці сувязі ў строга герархізаваным крымінальным істэблішмэнце па-за межамі Начнога Гораду. Генэтычныя матэрыялы і гармоны цяклі на Нінсэй па складанай лесьвіцы зь легальных і нелегальных ступеняў. Калісьці Ўэйдж здолеў нейкім чынам прасачыць шлях адной з паставак, цяпер ён меў сталыя сувязі ў дванаццаці гарадах. Абудзіўшыся ад роздумаў, Кейс убачыў, што стаіць, утаропіўшыся ў вітрыну. У гэтай краме маракам прадавалі розныя блішчастыя забаўкі. Гадзіньнікі, спружынныя нажы, запальнічкі, кішэнныя відэамагнітафоны, сымстым-пульты[5], уцяжараныя ланцугі манрыкі[6] і сюрыкены[7]. Яго заўсёды захаплялі сюрыкены, сталёвыя зоркі з вострымі, бы нож, канцамі. Некаторыя зь іх былі храмаваныя, іншыя — чорныя, іншыя мелі вясёлкавую паверхню, колеру аліўкавай плямы на вадзе. Але ягоную ўвагу прыцягвалі хромавыя зоркі. Яны былі замацаваныя на яркачырвонай замшавай паверхні пры дапамозе амаль нябачных прарэшкаў нэйлёнавай рыбалоўнай лёскі, іх цэнтры аздаблялі выявы драконаў ці сымбаляў інь і ян. Яны лавілі і скажалі нэонавае сьвятло вуліцы, і Кейсу прыйшло да галавы, што гэта і ёсьць зоры, пад якімі ён вандруе, ягоны лёс, складзены ў сузор'е таннага хрому.

— Джулі, — сказаў ён сваім зоркам. — Час пабачыць сваіх Джулі. Ён мусіць ведаць.

Джуліюсу Дыну было сто трыццаць пяць гадоў, ягоны

[5] Сымстым-пульт, сымстымавы пульт — [illegible]

мэтабалізм штотыдзень рупліва карэктаваўся сыроватка фірыйная гармонамі на астранамічныя сумы. Яго галоўнай абарону ад старэньня былі штогадовыя пілігрымкі ў Токіё, дзе прыходзя ген-хірургі аднаўлялі код ягонай ДНК — працэдура, не даступная ў Чыбе. Пасьля ён ляцеў у Ганконг, дзе купляў гарнітураў і кашуляў на наступны год. Бясполы і нечакана цярплівы, ён, здавалася, меў у жыцьці адзіную сапраўдную жарсьць — эзатэрычнае адзеньнепаклоньніцтва. Кейс жа бачыў яго двойчы ў адным і тым самым гарнітуры, хаця яго гардэроб цалкам складаўся з дэталёвых рэканструкцый вопраткі мінулага стагодзьдзя. Яго ўлюбёнымі былі ажуляныя танюткай залатой асадзе са шкельцамі з ружовага сынтэтычнага кварцу, падобнымі да люстэркаў у віктарыянскім лялечным дамку. Яго кантора месьцілася ў складзкім будынку за Нінсэем, частка якога была сяк-так абстаўленая ейнымі таму выпадковым зборам эўрапейскай мэблі, нібыта адзін некалі меў намер зрабіць гэтае месца сваім домам. Адзуваючы адной са сьценаў пакою, у якім чакаў Кейс, зьбіралі пыл нэаацтэцкія кніжныя шафы. Пара пузатых лямпаў ушто ён ці дыснэеўскім стылі нязграбна грувасьцілася на сталёвым кававым століку а-ля Кандзінскі, пакрытым пунсовым лятам. На сьцяне паміж кніжнымі шафамі вісеў гадзіньнік у сучасьне Далі, яго скажоны цыфэрблят сьцякаў аж да голай бэтонай падлогі. Галяграфічныя стрэлкі былі скрыўленыя такім чынам, каб, рухаючыся, яны паўтаралі выгіны цыфэрбляту, але яны ніколі не паказвалі дакладнага часу. Пакой быў завалены пустымі шкловалаконнымі пакункамі, якія пахлі кансэрваваным імберцам.

— Здаецца, ты чысты, сыне, — прамовіў бясплотны голас Дына. — Заходзь.

Зьлева ад кніжных шафаў на дзьвярах з імітацыі чырвонага дрэва пстрыкнулі і адчыніліся магнітныя засаўкі. На плястыку красавай надпіс з аблезлых самаклейкіх вялікіх літараў: ДЖУЛІЮС ДЫН ЭКСПАРТ ІМПАРТ. Калі мэбля ў фае нагадвала пра канец мінулага стагодзьдзя, то абстаноўка офісу адсылала да яго пачатку. Гладкі ружовы твар Дына, падобны да маскі, павітаў Кейса з астраўка сьвятла ад старажытнай лятуннай лямпы з прастакутным абажурам зялёнага шкла. Імпартэр быў

[6] Ланцугі ман-рыкі — зброя з арсэналу каратэ, якая складаецца з ланцуга з двума прастакутнымі грузамі на канцах.

[7] Сюрыкен — кідальная зброя з арсэналу ніндзюцу ў выглядзе сталевай зоркі з адвольнай колькасьцю вострa заточаных канцоў (звычайна ня больш за дзевяць).

надзейна забарыкадаваны шырокім пісьмовым сталом з пафарбаванай сталі, аточаным з бакоў высокімі бюро зь нейкага сьветлага дрэва. Як меркаваў Кейс, у такіх бюро калісьці захоўвалі рознага кшталту папяровыя дакумэнты. Стол быў завалены касэтамі, пажаўцелымі скруткамі раздруковак, а таксама дэталямі старажытнай мэханічнай друкаркі, якую Дын усё ніяк ня мог зноўку сабраць.

— Што прывяло цябе сюды, хлопча? — спытаў Дын, працягваючы Кейсу доўгую цукерку ў бела-блакітнай клятчастай абгортцы. — Пакаштуй. «Тынс Тынг Джахэ», найлепшыя.

Кейс адмовіўся ад імбернай цукеркі, сеў на драўляны шрубавы зэдлік і правёў пальцам па шве на сваіх старых чорных джынсах.

— Джулі, я чуў, што Ўэйдж хоча мяне забіць.

— А-а. Тады зразумела. А дзе ты гэта чуў, калі не сакрэт?

— Людзі кажуць.

— Людзі, — прамовіў Дын, жуючы імберную цукерку. — Што за людзі? Сябры?

Кейс кіўнуў.

— Бывае, што цяжка сказаць, хто твае сябры, ці ня так?

— Я вінен яму трохі грошай, Дын. Ён табе пра гэта нічога не казаў?

— Не. Апошнім часам мы не сустракаліся, — ён уздыхнуў. — Натуральна, нават калі б я нешта ведаў, то не абавязкова мог бы табе пра гэта сказаць, такія, разумееш, справы.

— Справы?

— Ён важны партнэр, Кейс.

— Ага. Дык ён хоча мяне забіць, Джулі?

— Калі й так, дык я пра тое ня ведаю, — адказаў Дын, паціснуўшы плячыма. Магло падацца, што яны абмяркоўвалі кошты на імберац. — Калі выявіцца, што гэта беспадстаўныя чуткі, сыне, зойдзеш праз тыдзень, і я дам табе падзарабіць на тавары з Сынгапуру.

— З гатэлю «Нан Хай», вуліца Бэнкулен?

— Але ж у цябе і доўгі язык, сыне!

Дын усьміхнуўся. Сталёвы стол быў завалены абсталяваньнем супраць падслухоўваньня.

— Пабачымся, Джулі. Я перадам прывітаньне Ўэйджу.

Дынавы пальцы ўзьняліся паправіць бездакорны вузел на сьветлым шаўковым гальштуку.

Ён адышоўся ад офісу Дына менш чым на квартал, калі на яго абрынулася раптоўнае адчуваньне, на каморкавым узроўні, што хтосьці сочыць за ім, і амаль усутыч. Пэўную памяркоўную параною Кейс успрымаў як належнае. Штука была ў тым, каб ня даць ёй выйсьці з-пад кантролю. Але пасьля столькіх васьмікутнікаў гэта бывала няпростай справай. Ён перасіліў усплёск адрэналіну і надаў свайму твару выраз знуджанай абыякавасьці, спрабуючы зьліцца з натоўпам. Мінаючы нейкую цёмную вітрыну, ён затрымаўся перад ёй. Гэта быў хірургічны бутык, зачынены на пераабсталяваньне. Ён стаяў перад вітрынаю, сунуўшы рукі ў кішэні вятроўкі, і пазіраў скрозь шыбу на пляскаты блін штучна вырашчанай плоці, якая ляжала на выразаным п'едэстале з сынтэтычнага нэфрыту. Колер скуры нагадаў яму шлюх Лоні Зоўна; у яе быў ужыўлены яркі кампутарны дысплэй, злучаны з падскурнай мікрасхемай. Навошта замарочвацца на імплянтацыю, — нечакана для сябе падумаў Кейс, абліваючыся халодным потам параноі, — калі можна проста насіць прыладу ў кішэні? Не паварочваючы галавы, ён узьняў вочы і пачаў вывучаць адлюстраваньні людзей, што праходзілі міма. Так. Вось. За маракамі ў саколках колеру хакі. Цёмныя валасы, люстраныя акуляры, цёмная вопратка, хударлявы і… І зьнік. Кейс пабег. Нізка

прыгнуўшыся, лявіруючы між целаў.

— Пазычыш мне пісталет, Шын?

Хлопец усьміхнуўся.

— На дзьве гадзіны.

Яны стаялі ў службовым пакойчыку сушы-бару на Шыга, пах сьвежых морапрадуктаў запаўняў паветра.

— Ты вяртацца, дзьве гадзіны.

— Мне трэба зараз. Маеш што-небудзь зараз?

Шын пакорпаўся за пустымі двухлітровымі бляшанкамі з-пад парашковага хрэну. Дастаў доўгую пляскатую скрынку, загорнутую ў шэры цэляфан.

— Тазэр. Адна гадзіна — дваццаць новых. Трыццаць заклад.

— Чорт. Гэта мне ня трэба. Мне трэба пісталет. Магчыма, мне прыйдзецца кагосьці застрэліць, разумееш?

Афіцыянт паціснуў плячыма і паклаў тазэр на месца, за пустыя бляшанкі.

— Дзьве гадзіны.

Кейс увайшоў у краму, нават не зірнуўшы на прылавак зь сюрыкенамі. Ён ні разу ў жыцьці іх не шпурляў. Ён набыў два пачкі «Ехэюань», заплаціўшы чыпам «Міцубісі-банку» на імя Чарлза Дэрэка Мэя. Гэта было нават круцей за Трумана Стара — найлепшае, што яму прыйшло да галавы для пашпарта. Японка за касай, выглядала, пражыла на пару гадоў больш за Дына без аніякай дапамогі дабротаў навукі. Ён дастаў з кішэні танюткі пачак новых іенаў і паказаў ёй.

— Я хачу набыць зброю.

Яна махнула рукой у бок скрыні, напоўненай нажамі.

— Не, — сказаў Кейс. — Мне не падабаюцца нажы.

Тады яна дастала з-пад прылаўку прадаўгаватую скрыню. На вечку з жоўтага кардону была груба намаляваная кобра з надзьмутым клабуком. У скрыні было восем аднолькавых цыліндраў, загорнутых у паперу. Ён назіраў за тым, як карычневыя, у пігмэнтавых плямах пальцы разгортваюць адзін з цыліндраў. Яна падняла цыліндар, каб Кейс мог яго добра разгледзець — шэрая сталёвая трубка са скураным пасам з аднаго канца і бронзавай пірамідкай з другога. Яна схапіла трубку адной рукой, трымаючы пірамідку паміж вялікім і ўказальным пальцамі другой рукі, і пацягнула за пас. Тры праалееныя тэлескапічныя сэгмэнты тугой кальцавой спружыны высьлізнулі з трубкі і зафіксаваліся.

— Кобра, — сказала яна.

Неба па-над нэонавым трымценьнем Нінсэй было агіднага шэрага колеру. Паветра пагоршала; дыхаць стала цяжэй, палова людзей у натоўпе былі ў рэсьпіратарах. Кейс правёў дзесяць хвілінаў у сарціры, спрабуючы зручна схаваць кобру; нарэшце ён вырашыў уваткнуць рукаятку кобры за пояс джынсаў, трубка наўскось прылягала да жывата. Пірамідальны наканечнік пагойдваўся паміж яго рэбрамі і падкладкай вятроўкі. Гэтая фіговіна магла бразнуцца на тратуар пры кожным яго кроку, але зь ёй ён пачуваўся лепей. «Чат» ня быў сапраўды дылерскім барам, але ў будныя вечары ўсё ж зьбіраў адпаведную кліентуру. Іначай было ў суботы й нядзелі. Заўсёднікі збольшага былі на сваіх месцах, але яны губляліся ў натоўпе матросаў і прафэсіяналаў, што палявалі на іх. Праціснуўшыся празь дзьверы, Кейс пашукаў вачыма Раца, але за стойкай яго не было. Лоні Зоўн, сутэнэр, што стала атабарыўся ў «Чатсуба», зь лянівай бацькоўскай цікавасьцю назіраў, як адна зь ягоных дзяўчат апрацоўвала маладзенькага матроса. Зоўн сядзеў на гіпнотыку, які японцы называлі «Танец у аблоках». Злавіўшы позірк сутэнэра, Кейс паклікаў яго да барнай стойкі. Зоўн павольна падплыў да яго скрозь натоўп, яго доўгі твар быў млявы і мірны.

— Бачыў сёньня Ўэйджа, Лоні?

Зоўн павітаў яго са сваім звычайным спакоем. Кіўнуў галавой.

— Ты ўпэўнены, дзядзька?

— Здаецца, у «Намбане». Гадзіны дзьве таму.

— Зь ім былі ягоныя людзі? Адзін такі худы, зь цёмнымі валасамі, магчыма, у чорнай куртцы?

— Не, — нарэшце адказаў Зоўн, ягоны звычайна гладкі лоб быў зморшчаны, што паказвала, якіх высілкаў яму каштавала прыгадаць столькі нікчэмных дэталяў. «Бамбізы. З нарошчанымі цягліцамі». У вачах Зоўна амаль не было бялку, і яшчэ менш райку; пад абвіслымі павекамі было відаць толькі аграмадныя расшыраныя зрэнкі. Ён доўга разглядаў Кейсаў твар, пасьля перавёў позірк уніз. Убачыў выпукласьць сталёвай трубкі.

— Кобра, — сказаў ён і прыўзьняў брыво. — Хочаш кагосьці ўздручыць?

— Убачымся, Лоні.

Кейс выйшаў з бару.

«Хвост» вярнуўся. Ён быў у гэтым упэўнены. Ён адчуў выбух эўфарыі ад васьмікутнікаў і адрэналіну і чагосьці яшчэ. «Ты ад гэтага прэсься, — падумаў ён. — Ты вар'ят». У гэтым было нейкае вычварнае і вельмі прыблізнае падабенства да рэйду ў матрыцу. Дастаткова дайсьці да зьнямогі, апынуцца ў безнадзейным, неверагодным пераплёце, каб убачыць Нінсэй як поле дадзеных; так матрыца калісьці нагадвала яму пратэіны, што злучаюцца ў ланцугі, вызначаючы спэцыялізацыю каморак. І тады можна кінуцца ў хуткасны дрэйф, і сьлізгацець, будучы адначасова цалкам уцягненым і ў той жа час адмежаваным ад усяго гэтага, і ўсё наўкола цябе — танец бізу, інтэрактыўны інфармацыйны абмен, уцелаўленьне дадзеных у лябірынтах чорнага рынку… Давай, Кейс, сказаў ён сабе. Абдуры іх. Гэтага яны чакаюць менш за ўсё. Ён быў за паўкварталу ад аркады, дзе ўпершыню сустрэў Лінду Лі. Ён пранёсься празь Нінсэй,

раскідаўшы групку матросаў, што прагульваліся; адзін з матросаў зароў на яго па-гішпанску. Ён уляцеў у аркаду, гукі якой адразу накрылі яго хваляй электроннага прыбою, інфрагук завібраваў у ягоных вантробах. Хтосьці ўзарваў дзесяцімэгатоньнік у «Танкавай вайне», сымуляцыя ўдарнай хвалі заліла аркаду белым гукам, па-над галовамі гульцоў разрасталася злавесная галяграма ядравага грыба. Ён збочыў направа і адным скачком пераадолеў пралёт лесьвіцы зь нефарбаваных ДСП. Аднойчы ён заходзіў сюды з Уэйджам, каб абмеркаваць зьдзелку па забароненых гарманальных трыгерах з чалавекам, якога звалі Мацуга. Ён памятаў гэты калідор, заплямленыя цыноўкі на падлозе і шэраг аднолькавых дзьвярэй, якія вялі ў маленечкія офісныя кабінкі. Адны дзьверы былі адчыненыя. Японка ў чорнай безрукаўцы падняла позірк ад манітора. Сьцяну над яе галавой упрыгожваў турыстычны постэр з краявідамі Грэцыі, блакіт Эгейскага мора стракацеў зграбнымі ідэаграмамі.

— Пакліч сюды ахову, — сказаў ёй Кейс і кінуўся далей па калідоры, прэч зь яе вачэй. Апошнія двое дзьвярэй былі зачыненыя і, як ён меркаваў, замкнёныя. Ён падскочыў і з усёй моцы садануў падэшвай свайго нэйлёнавага спартовага чаравіка ў пакрытыя блакітным лякам дзьверы ў канцы калідора. Дзьверы разьляцеліся з трэскам, сэгмэнты таннай панэлі павывальваліся з раструшчанай рамы. У каморцы было цёмна, відаць было толькі белы выгін кампутарнага манітора. Тады ён кінуўся да дзьвярэй, што былі справа ад яго, схапіўся за празрыстую шарападобную ручку і налёг на яе ўсёй вагой. Нешта пстрыкнула, і ён апынуўся ўнутры. Менавіта тут яны з Уэйджам сустракаліся з Мацугам. Ліпавая кампанія, ад імя якой дзейнічаў Мацуга, ужо даўно тут ня месьцілася. Ні кампутара, ні офіснага абсталяваньня. Скрозь закуранае пластыкавае акно прасочвалася сьвятло з вуліцы за аркадай. Ён разгледзеў абарваны оптавалаконны кабэль, што зьмяіўся з гнязда ў сьцяне, пустыя кантэйнэры з-пад ежы на падлозе і гандолу электрычнага вэнтылятара бяз лопасьцяў. Аконная шыба была з таннага пластыку. Ён скінуў з плячэй вятроўку, абматаў ёй руку і ўдарыў. Шыба трэснула, але спатрэбілася яшчэ два ўдары, каб цалкам высадзіць яе з рамы. Па-над прыглушаным гармідарам гульнявых аўтаматаў пачала

пульсаваць сырэна трывогі, якую ўключыла ці то разьбітае акно, ці то дзяўчына з турыстычнага офісу. Кейс абярнуўся, апрануў вятроўку і выхваснуў кобру на поўную даўжыню. Дзьверы пакойчыку былі зачыненыя, і ён разьлічваў, што «хвост» спачатку кінецца па яго ў тыя дзьверы, якія ён напалову выбіў з вушака. Бронзавы наканечнік кобры пачаў павольна пагойдвацца, амплітуда ваганьняў павялічвалася спружынным сьцяблом. Нічога не адбывалася. Чуваць было толькі гук сырэны трывогі, грукат аўтаматаў і цяжкія ўдары Кейсавага сэрца. Калі прыйшоў страх, Кейс пазнаў яго, як напаўзабытага старога сябра. Гэта быў не халодны хуткасны мэханізм дэксэдрынавай параноі, але просты жывёльны страх. Кейс так доўга жыў у стане несупыннага нэрвовага напружаньня, што забыўся, якім ёсьць сапраўдны страх. Людзі ўжо паміралі ў гэтым пакойчыку. Ён можа памерці тут. У іх могуць быць пісталеты… З далёкага канца калідору пачуўся грукат. Потым мужчынскі голас нешта закрычаў па-японску. Лямант, пранізьлівы жах. Зноў грукат. І нясьпешныя крокі, што набліжаюцца. Мінаюць ягоныя зачыненыя дзьверы. Паўза даўжынёю тры ўдары сэрца. Крокі вяртаюцца. Адзін. Два. Тры. Абцас драпануў цыноўку. Рэшткі дэксэдрынавай бравады выпарыліся. Ён зашчоўкнуў кобру ў рукаятку і рвануўся да акна, асьлеплены жахам, ягоныя нэрвы крычалі. Уверх, вонкі, падзеньне, яго сьвядомасьць не пасьпявала за тым, што ён рабіў. Прызямленьне на тратуар увагнала штыр тупога болю ў ягоныя галёнкі. Вузкі клін сьвятла з прачыненых службовых дзьвярэй асьвятляў абрыўкі оптавалаконных кабэляў і парэшткі сьпісанага гульнявога аўтамата. Ён упаў тварам уніз на кавалак прамоклай ДСП, адкаціўся ў цень разламанага корпусу аўтамата. Выбітае ім акно выглядала квадратам цьмянага сьвятла. Усё яшчэ чуўся пульсоўны гук сырэны трывогі. Тут яна гучэла мацней, бо сьцяна заглушала роў аўтаматаў. У акне зьявілася галава, асьветленая ззаду сьвятлом з калідору, потым зьнікла. Зноў зьявілася, але ён усё ніяк ня мог разгледзець твар. Яе вочы бліснулі срэбрам.

— Чорт! — сказаў жаночы голас, з вымовай ураджэнкі паўночнага Гігаполісу. Галава зьнікла. Лежачы пад корпусам аўтамата, Кейс павольна палічыў да дваццаці, потым падняўся. Сталёвая кобра ўсё яшчэ была ў ягонай руцэ, і яму спатрэбілася

некалькі сэкундаў, каб прыгадаць, што гэта. Ён пакульгаў вуліцаю прэч ад аркады, прыпадаючы на левую нагу.

Пісталет, які даў яму Шын, быў пяцідзесяцігадовай даўніны віетнамскай імітацыяй укарочанага паліцыйнага вальтэра, дакладней, яго лацінаамэрыканскай копіі, з самаўзьвядзеньнем па першым стрэле і вельмі тугім курком. Ён быў расьсьвідраваны пад стрэльбавыя кулі 22-га калібру. Кейс, канечне, лепей бы ўзяў разрыўныя кулі з азідам сьвінца, чымся звычайныя кітайскія патроны з полымі наканечнікамі, якія прадаў яму Шын. Тым ня менш, цяпер у яго быў пісталет і дзевяць абоймаў да яго. Ідучы па Шыга з сушы-бару, дзе працаваў Шын, Кейс пяшчотна гушкаў зброю ў кішэні вятроўкі. Рукаятка пісталета была адлітая зь ярка-чырвонага пластыку і мела форму ўздыбленага дракона, у цемры курок было лёгка знайсьці навобмацак. Ён выкінуў кобру ў кантэйнэр для сьмецьця і сухама праглынуў чарговы васьмікутнік. Пігулка ўключыла яго нэўронныя ланцугі, і ён пасьпяшаўся па Шыга да Нінсэй і далей на Баіцу. «Хвост», праўдападобна, зьнік, і гэта было цудоўна. Ён мусіў зрабіць колькі званкоў, правесьці пару зьдзелак — біз ня мог чакаць. Праз квартал у бок порту на Баіцу стаяў бязьлікі дзесяціпавярховы будынак з агіднай жоўтай цэглы. У гэты час ягоныя вокны былі цёмныя, але, задраўшы галаву, можна было ўбачыць слабае сьвятло з даху. Каля галоўнага ўваходу вісела незапаленая нэонавая шыльда з надпісам «ТАННЫ ГАТЭЛЬ» па-ангельску пад гронкай герогліфаў. Калі гэтае месца і мела якую іншую назву, Кейс яе ня ведаў: усе называлі яго «Танным гатэлем». Будынак гэты стаяў трохі ўбаку ад Баіцу, да галоўнага ўваходу вяла дарожка. Ліфт чакаў наведнікаў на дне празрыстага калодзежу. Як і назва «Танны гатэль», ліфт зьявіўся пазьней, ліфтавая шахта была прымацаваная да сьцяны будынку бамбукам ды эпаксыдкай. Кейс залез у пластыкавую скрыню ліфта і актываваў яе сваім ключом, цьвёрдай магнітнай палоскай безь якой-колечы маркіроўкі. Кейс здымаў тут труну з таго часу, як трапіў у Чыбу, плацячы штотыднёва, але ён ніколі не начаваў у «Танным гатэлі». Ён начаваў у таньнейшых месцах. У ліфце пахла парфумай і цыгарэтамі; сьценкі кабіны былі падрапаныя, пакрытыя бруднымі сьлядамі пальцаў. Калі ліфт мінуў пяты

паверх, Кейс убачыў агні Нінсэй. Ён сьціснуў пальцамі рукаятку пісталета, калі кабіна пачала з шыпеньнем запавольвацца. Як звычайна, яна спынілася з гвалтоўным штуршком, але ён быў да гэтага гатовы. Ён выйшаў у двор, які служыў заразом фае і лужком. Пасярэдзіне квадратнага дывана зь зялёнага пластыкавага дзірвана за паўкруглай стойкай сядзеў падлетак-японец і чытаў падручнік. Белыя труны з шкловалакна мацаваліся на каркасе з прамысловых рыштаваньняў. Шэсьць ярусаў трунаў, па дзесяць трунаў з кожнага боку.

Кейс павітаў хлопца кіўком і пакульгаў па пластыкавым дыване да найбліжэйшых драбінаў. Дах будынку быў пакрыты таннымі пластыкавымі плітамі, якія грукаталі пры ветраным надвор'і і працякалі, калі ішоў дождж, але труны было даволі цяжка ўскрыць без ключа. Масток з мэталёвых кратаў хістаўся пад ягонай вагою, калі ён прабіраўся ўздоўж шэрагу трунаў да нумару 92. Кожная труна была 3 мэтры даўжынёй і мела авальны люк шырынёй адзін мэтар і вышынёй прыблізна паўтара мэтра. Ён уставіў свой ключ у шчыліну электроннага замка і пачакаў на пацьверджаньне ад гатэльнага кампутара. Магнітныя засаўкі гасьцінна пстрыкнулі, і люк з рыпеньнем спружынаў адышоў уверх. Калі Кейс запоўз усярэдзіну, уключыліся флюарэсцэнтныя лямпы. Ён зачыніў за сабой люк і ляпнуў па панэлі, якая ўключала ручны замок. Усё мэбляваньне нумару 92 складалі стандартны пэрсанальны кампутар фірмы «Хітачы» і белая пластыкавая лядоўня. У лядоўні знаходзіліся рэшткі трох дзесяцікіляграмовых плітаў сухога лёду, загорнутых у паперу, каб прадухіліць выпарэньне, і алюміневая лябараторная прабірка з шрубавым коркам. Прысеўшы на кукішкі на тэмпэрлёнавы мат, які быў і падлогай, і ложкам, Кейс дастаў з кішэні пазычаны ў Шына пісталет і паклаў яго на лядоўню. Затым ён зьняў сваю вятроўку. Тэрмінал кампутара труны быў умантаваны ва ўвагнутую сьцяну, побач зь ім была шыльда з правіламі гатэлю на сямі мовах. Кейс зьняў зь дзяржаньня ружовую слухаўку радыётэлефона і па памяці набраў ганконгаўскі нумар. Ён пачакаў пяць гудкоў, тады павесіў слухаўку. Пакупнік, якога ён знайшоў для трох мэгабайтаў гарачай інфармацыі ў «Хітачы», не адказваў. Ён набраў такійскі нумар, раён Сындзюку. Жаночы

голас адказаў па-японску.

— Зьмей ёсьць?

— Рады цябе чуць, — сказаў Зьмей, уступаючы ў размову з паралельнага тэлефона, — я чакаў твайго званка.

— Я знайшоў музыку, якую вы хацелі, — сказаў Кейс, зірнуўшы на лядоўню.

— Вельмі прыемна гэта чуць. Але ў нас праблемы з гатоўкай. Можаш пачакаць на грошы?

— Слухай, мне проста неадкладна патрэбныя грошы…

Зьмей паклаў тэлефон.

— Гаўнюк, — сказаў Кейс у слухаўку, зь якой чуўся сыгнал адбою. Ён утаропіўся ў маленькі танны пісталет. — Вельмі сумнеўна, — сказаў ён. — Гэтым вечарам усё выглядае вельмі сумнеўна.

Кейс увайшоў у «Чат» за гадзіну да золку, абедзьве рукі ў кішэнях вятроўкі, у адной — узяты напракат пісталет, у другой — алюміневая прабірка. Рац сядзеў за далёкім столікам і піў мінэралку «Апалянарыс» зь піўнога куфля, падпіраючы сьцяну сто дваццацьцю кіляграмамі свайго рыхлага цела. Бразыльскі хлопчык Курт абслугоўваў кліентаў за стойкай. Наведнікаў было мала — у асноўным ціхія «хроны». Пластыкавая рука Раца гудзела, калі ён падносіў куфаль зь мінэралкай да рота. Яго голеная галава была пакрытая потам.

— Блага выглядаеш, дружа артыст, — сказаў ён, бліснуўшы мокрымі руінамі зубоў.

— У мяне ўсё файна, — сказаў Кейс з усьмешкай чэрапа. — Проста цудоўна.

Ён плюхнуўся на крэсла насупраць Раца, не вымаючы рук з кішэняў.

— Усё бадзяесься па сваім партатыўным бамбасховішчы з бухла ды стымулятараў, пэўна. Надзейная абарона ад мацнейшых эмоцыяў, га?

— Чаму б табе не пакінуць мяне ў спакоі, Рац? Ты бачыў Уэйджа?

— Абарона ад страху і адзіноты, — працягваў Рац. — Прыслухайся да страху. Можа, ён твой сябар.

— Ці ты чуў што-небудзь пра бойку ў аркадзе ўчора вечарам? Каго-небудзь паранілі?

— Нейкі вар'ят парэзаў ахоўніка, — ён паціснуў плячыма. — Кажуць, жанчына.

— Мне трэба паразмаўляць з Уэйджам, Рац, я…

— А! — рот Раца звузіўся, сьціснуўся ў адну лінію. Ён глядзеў паўз Кейса на ўваход. — Здаецца, зараз ты зь ім паразмаўляеш.

Перад вачамі Кейса зноў бліснулі сюрыкены зь вітрыны. Дэксэдрын засьпяваў у ягонай галаве. Пісталет у ягонай руцэ зрабіўся сьлізкім ад поту.

— Гер Уэйдж, — прамовіў Рац, павольна выпрастваючы свой ружовы маніпулятар, нібыта чакаючы, што яго паціснуць. — Як прыемна. Вы так рэдка ганаруеце нас сваім візытам.

Кейс павярнуў галаву і паглядзеў Уэйджу ў твар. Незапамінальная загарэлая маска. Вочы — лябараторна вырашчаныя ніканаўскія трансплянтанты колеру морскай хвалі. На Ўэйджу быў сталёвага колеру гарнітур, на абодвух запясьцях — па простым плятынавым бранзалеце. Абапал яго стаялі ягоныя бамбізы, двое амаль аднолькавых маладзёнаў са штучна нарошчанымі цягліцамі на руках і плячах.

— Як маесься, Кейс?

— Джэнтэльмэны, — сказаў Рац, узяўшы сваім маніпулятарам забітую недакуркамі попельніцу, што стаяла на стале. — Мне

ня трэба тут праблемаў.

На попельніцы, зробленай з тоўстага нябіткага пластыку, была рэкляма піва «Цінгтао». Рац раструшчыў яе плаўным рухам, недакуркі і аскепкі зялёнага пластыку дажджом пасыпаліся на стол.

— Зразумела?

— Эй, любы, — сказаў адзін з бамбізаў, — паспрабуеш зрабіць гэта са мной?

— Не бяры да галавы, Курт, можаш ня цэліцца ў ногі, — будзённым тонам прамовіў Рац.

Кейс зірнуў у бок барнай стойкі і ўбачыў, што бармэн-бразылец навёў на трыё сьміт-энд-вэсан для разгону бунтаў. Ствол гэтага монстра, зроблены са сплаву таўшчынёй з паперу і пакрыты кілямэтрам шкловалаконнай абмоткі, быў дыямэтрам з добры кулак. У шкілетным магазіне было відаць пяць тоўстых аранжавых патронаў, інфрагукавыя зарады з жэлепадобным зярністым начыньнем.

— Тэарэтычна не сьмяротна, — сказаў Рац.

— Эй, Рац, — сказаў Кейс, — зь мяне піва.

Уладальнік бару паціснуў плячыма.

— Ты мне нічога ня вінны. Гэтыя, — ён сярдзіта зірнуў на Ўэйджа і яго хлопцаў, — мусілі б ведаць: ніякай макрухі ў «Чатсуба».

Уэйдж кашлянуў:

— Хіба хтосьці кажа пра макруху? Мы проста хочам абмеркаваць справы. Мы з Кейсам працуем разам.

Кейс выцягнуў з кішэні свой пісталет і нацэліў яго Ўэйджу ў пахвіну.

— А я чуў, ты хочаш мяне заваліць.

Ружовая клюшня Раца сашчапілася на пісталеце, і рука Кейса абмякла.

— Слухай, Кейс, скажы мне, што, чорт пабірай, з табой робіцца, ты зусім ашалеў ці што? Што за глупства — я зьбіраюся цябе заваліць?

Уэйдж павярнуўся да хлопца зьлева.

— Вы двое, вяртайцеся ў Намбан. Чакайце мяне.

Кейс праводзіў іх вачыма да выхаду з бару, які цяпер быў цалкам пусты, за выняткам бразыльца і п'янага матроса ў хакі, які скурчыўся пад барным зэдлікам. Ствол сьміт-энд-вэсана, правёўшы бамбізаў да дзьвярэй, зноў утаропіўся ва Ўэйджа. Магазін зь пісталета Кейса бразнуўся на стол. Рац трымаў пісталет у сваёй клюшні, выкалупваючы патрон, які ўжо быў у патроньніку.

— Хто табе сказаў, што я зьбіраюся цябе валіць, Кейс? — спытаў Уэйдж. — Хто табе сказаў, дружа? Хтосьці спрабуе цябе падставіць?

Матрос пад барнай стойкай застагнаў і гучна званітаваў.

— Выкінь яго адсюль, — загадаў Рац Курту, які цяпер сядзеў на краі стойкі са стрэльбай на каленях, запальваючы цыгарэту.

Кейс адчуў, як на яго абрынуўся ўвесь цяжар бяссоннай ночы, нібы яму за каўнер высыпалі мех мокрага пяску. Ён дастаў з кішэні прабірку і працягнуў яе Ўэйджу.

— Усё, што маю. Гіпофізы. Атрымаеш паўтысячы, калі загоніш іх хутка. Меў яшчэ атрымаць бабкі за сёе-тое з кампа, але справа абламалася.

— З табой усё нармальна?

Прабірка ўжо зьнікла за штрыфэлем сталёвага пінжака.

— Я маю на ўвазе, файна, гэта мяне задавальняе, але ты дрэнна выглядаеш. Як тоўчанае гаўно. Табе лепей пайсьці

куды-небудзь выспацца.

— Ага.

Ён узьняўся з крэсла і адчуў, што «Чат» гойдаецца пад ягонымі нагамі.

— У мяне яшчэ была пяцідзясятка, але я яе камусьці аддаў.

Ён хіхікнуў, узяў са стала магазін і патрон, які ляжаў асобна, і кінуў іх у кішэню, потым паклаў сам пісталет у другую.

— Мне трэба пабачыць Шына, забраць заклад.

— Ідзі дамоў, — сказаў Рац зь нейкай зьбянтэжанасьцю ў голасе, пагойдваючыся на рыпучым крэсьле. — Артыст. Ідзі дамоў.

Ён адчуваў іх позіркі, ідучы да выхаду і адчыняючы плячом пластыкавыя дзьверы на двор.

— Сука, — сказаў ён ружоваму золку па-над Шыга. Галяграмы над Нінсэй раставалі, як прывіды, і бальшыня нэонавых шыльдаў ужо былі шэрыя, халодныя і мёртвыя. Ён пацягваў з маленькага пенапластавага кубка густую чорную каву з вулічнага аўтамата і глядзеў на ўзыход сонца.

— Ляці адсюль, любая. Гарады накшталт гэтага — для людзей, што выбіраюць шлях уніз.

Але ня ў гэтым была справа, і яму ўсё цяжэй было падтрымліваць у сабе пачуцьце здраджанасьці. Яна проста хацела квіток дамоў, і за інфу зь ягонага «Хітачы» яна яго купіць, калі здолее знайсьці патрэбнага скупшчыка крадзенага. А што да той пяцідзясяткі, дык яна спачатку і не хацела яе браць, ведаючы, што пазбавіць яго апошніх грошай. Калі ён выйшаў з гатэльнага ліфта, за стойкай у холе сядзеў той самы хлопчык. Зь іншым падручнікам.

— Дружа, — гукнуў Кейс праз хол з пластыкавым дываном, — можаш мне нічога не казаць. Я ўжо ведаю. Да мяне прыходзіла

прыгожая лэдзі, сказала, што мае ключ. Пакінула табе добры гасьцінец, скажам, пяцьдзясят новых?

Хлопец узьняў позірк ад кнігі.

— Жанчына, — сказаў Кейс і правёў вялікім пальцам лінію ўпоперак свайго лба. — Шоўк, — ён шырока ўсьміхнуўся.

Хлопец усьміхнуўся ў адказ.

— Дзякуй, дупа, — сказаў Кейс. Стоячы на мастку, ён доўга ня мог адчыніць замок. Яна сапсавала яго, калі спрабавала ўскрыць, падумаў ён. Няўмека. Ён ведаў, дзе можна было ўзяць напракат чорную скрыню, якая б адкрыла ў «Танным гатэлі» ўсё што заўгодна. Лямпы запаліліся, калі ён улез унутр.

— Зачыні люк, вельмі павольна, дружа. Пісталет, што ты ўзяў у афіцыянта, яшчэ ў цябе?

Яна сядзела сьпінаю да сьцяны, у дальнім канцы труны, запясьці абапертыя на паднятыя калені. Зь яе рук на Кейса глядзела падобная да перачніцы руля пісталета-флечэра.

— Гэта ты была ў аркадзе?

Ён зачыніў люк.

— Дзе Лінда?

— Уключы замок.

Ён уключыў.

— Гэта твая дзяўчына? Лінда?

Ён кіўнуў.

— Яна сышла. Забрала твой «Хітачы». Вельмі нэрвовае дзіця. Дык што зь пісталетам, дзядзька?

Яна насіла люстраныя акуляры і была апранутая ва ўсё чорнае, абцасы чорных ботаў ванзаліся глыбока ў тэмпэрлёнавы мат.

— Я аднёс яго назад да Шына, забраў заклад і прадаў яму ягоныя патроны за палову таго, што быў заплаціў. Табе трэба грошы?

— Не.

— Хочаш сухога лёду? Тут усё, што я маю.

— Што за трасца найшла на цябе ўчора вечарам? Навошта ты ўзьняў гэты вэрхал у аркадзе? Прыйшлося аддубасіць ахоўніка, што кінуўся на мяне з нунчакамі.

— Лінда сказала, што ты зьбіраесься мяне забіць.

— Лінда сказала? Я ніколі яе ня бачыла да таго, як прыйшла сюды.

— Ты працуеш не на Ўэйджа?

Яна пакруціла галавой. Ён зразумеў, што акуляры былі хірургічна імплянтаваныя і гермэтычна запячатвалі вачніцы. Яе срэбныя лінзы, здавалася, расьлі з гладкай бледнай скуры над скуламі, асаджаныя пасмамі груба пастрыжаных чорных валасоў. Пальцы, што трымалі флечэр, былі далікатныя, белыя, з крывава-чырвонымі пазногцямі, якія выглядалі штучнымі.

— Падобна, ты зусім заблытаўся, Кейс. Я зьявілася, і ты проста ўсунуў мяне ў сваю карціну рэчаіснасьці.

— Дык што вам трэба, лэдзі?

Ён прыхінуўся сьпінай да люка.

— Ты. Адно жывое цела з амаль цэлымі мазгамі. Молі. Маё імя Молі. Я мушу даставіць цябе чалавеку, на якога я працую. Ён хоча з табой паразмаўляць. Нічога больш. Ніхто не зьбіраецца табе шкодзіць.

— Гэта добра.

— Хоць часам я сапраўды раблю людзям балюча, Кейс. Думаю, я проста створаная для гэтага.

На ёй былі аблеглыя чорныя скураныя джынсы і грубасткая чорная куртка, пашытая зь нейкай матавай тканіны, якая, здавалася, убірае ў сябе сьвятло.

— Калі я схаваю пісталет, ты будзеш добра сябе паводзіць, Кейс? Выглядае, ты любіш бязглуздую рызыку.

— Эй, я вельмі спакойны. Я сама лагоднасьць. Няма праблемаў.

— Цудоўна, дзядзька.

Флечэр зьнік у чорнай куртцы.

— Таму што калі ты паспрабуеш са мной гарэзіць, гэта будзе самая няўдалая спроба ў тваім жыцьці.

Яна выпрастала свае рукі далонямі ўверх, трохі рассунушы пальцы, і дзесяць двувострых чатырохсантымэтровых лёзаў зь ледзь чутным шчаўчком выскачылі з похваў пад яе крывавымі пазногцямі. Яна ўсьміхнулася. Кіпцюры павольна вярнуліся назад.

Пасьля году трунаў пакой на дваццаць пятым паверсе гатэлю «Чыба Гілтан» здаваўся аграмадным — дзесяць на восем мэтраў, палова нумару люкс. Белая кавaварка «Браўн» каляхавала на нізкім століку, што стаяў пры рассоўных шкляных панэлях, якія вялі на балькон.

— Залі ў сябе трохі кавы. Здаецца, табе гэта трэба.

Яна зьняла куртку, флечэр вісеў у чорнай нэйлёнавай кабуры пад пахай. На ёй быў шэры пуловэр без рукавоў, з простымі сталёвымі маланкамі на кожным плячы. «Куленепрабівальны», — падумаў Кейс, наліваючы каву ў ярка-чырвоную філіжанку. Ягоныя рукі і ногі здаваліся драўлянымі.

— Кейс.

Ён узьняў позірк і ўбачыў незнаёмага мужчыну.

— Маё імя Армітаж.

Ягоны цёмны халат быў расхінуты да пасу, адкрываючы шырокія мускулістыя безвалосыя грудзі і пляскаты цьвёрды жывот. Блакітныя вочы былі такія бледыя, што Кейс падумаў пра адбельвальнік.

— Сонца ўзышло, Кейс. Сёньня твой шчасьлівы дзень, хлопча.

Кейс наўскось махнуў рукой зь філіжанкай, але мужчына лёгка ўхіліўся ад гарачай кавы. Па шпалерах пад рысавую паперу сьцякала карычневая пляма. Кейс убачыў у мочцы левага вуха мужчыны вуглаватую залатую завушніцу. Спэцыяльныя войскі. Армітаж усьміхнуўся.

— Пі сваю каву, Кейс, — сказала Молі. — Усё нармальна, але ты нікуды адсюль ня пойдзеш, пакуль Армітаж ня скажа табе, чаго ён хоча.

Яна сядзела на шоўкавым матрацы, склаўшы накрыж ногі, і ўсьляпую разьбірала флечэр. Пара люстэрак сачыла за рухамі Кейса, калі ён пайшоў да століка, каб нанова напоўніць сваю філіжанку.

— Ты занадта малады, каб памятаць вайну, ці ня так, Кейс?

Армітаж запусьціў вялізную руку ў свае каротка пастрыжаныя каштанавыя валасы. На ягоным запясьці бліснуў цяжкі залаты бранзалет.

— Ленінград, Кіеў, Сібір. Мы вынайшлі цябе ў Сібіры, Кейс.

— Што гэта мае значыць?

— «Кулак крыку», Кейс. Ты чуў гэтую назву.

— Нейкая апэрацыя, так? Спроба спаліць расейскую сетку віруснымі праграмамі. Ага, я пра тое чуў. І ніхто не вярнуўся.

Ён адчуў раптоўнае напружаньне. Армітаж падышоў да акна і паглядзеў на Такійскі заліў.

— Гэта ня так, Кейс. Адна група дацягнула да Хэльсынкі.

Кейс паціснуў плячыма і адпіў са сваёй філіжанкі.

— Ты кібэркаўбой. Прататыпы праграмаў, якія ты выкарыстоўваеш для ўзлому карпаратыўных базаў зьвестак, былі распрацаваныя для «Кулака крыку». Для атакі на Кірэнскую кампутарную сетку. Базавы модуль складаўся з матыля «Крылы ночы», пілёта, дэкі для працы ў матрыцы і кібэржакея. Мы выкарыстоўвалі вірус пад назваю «Крот». Сэрыя «Крот» была першым пакаленьнем сапраўдных штурмавых праграмаў.

— Ледабураў, — прамовіў Кейс над краем чырвонай філіжанкі.

— Лёд[8], як ICE — скарот ад «intrusion countermeasures electronics», электронная абарона ад уварваньняў.

— Рэч у тым, містэр, што я больш не каўбой, так што лёд мне пайду…

— Я быў там, Кейс; я быў там, калі яны вынайшлі такіх, як ты.

— Ты губляеш час, важдаючыся са мною ці такімі, як я. У цябе хапае грошай наймаць дарагіх дзяўчат з кіпцюрамі-лёзамі, каб прыцягнуць сюды маю сраку, і ўсё. Я ніколі больш ня сяду за дэку, ні для цябе, ні для каго-кольвек іншага, — ён падышоў да акна і паглядзеў уніз. — Вось дзе я цяпер жыву.

— Наша дасье на цябе кажа, што ты намагаесься справакаваць вуліцу, падсьвядома хочаш, каб цябе забілі.

— Дасье?

— Мы сканструявалі дэталёвую мадэль. Купілі інфу пра ўсе твае ідэнтычнасьці і прагналі здымак праз вайсковы аналітычны софт. Ты схільны да самагубства, Кейс. На вуліцы мадэль дае табе яшчэ месяц. А наш мэдычны прагноз кажа, што табе спатрэбіцца новая падстраўнікавая залоза не пазьней, чымся праз год.

— Мы, — Кейс зірнуў у сьветла-блакітныя вочы. — Хто мы?

— Што б ты сказаў, калі б мы прапанавалі ліквідаваць

[8] Лёд — праграмы абароны ад вірусаў і ўварваньняў.

пашкоджаньні тваёй нэрвовай сыстэмы, Кейс?

Армітаж раптам падаўся Кейсу нібыта выразаным з цэльнага блёку мэталу — нерухомай, неверагодна цяжкай статуяй. Цяпер ён ведаў, што гэта сон і што ён хутка прачнецца. Армітаж больш нічога ня скажа. Кейсавы сны заўжды завяршаліся такімі стоп-кадрамі.

— Ну, што б ты сказаў, Кейс?

Кейс паглядзеў на заліў і здрыгануўся.

— Я б сказаў, што вы гаўнюкі.

Армітаж кіўнуў.

— Тады я б спытаў пра вашы ўмовы.

— Яны ня надта розьняцца ад звычайных умоваў тваёй працы, Кейс.

— Няхай хлопец пасьпіць, Армітаж, — прамовіла Молі са свайго матраца, на якім былі раскладзеныя дэталі флечэра, нібы дарагая галаваломка. — Ён развальваецца па швах.

— Умовы, — сказаў Кейс, — умовы, і цяпер. Цяпер жа.

Ён усё яшчэ дрыжэў. Ён ня мог даць рады дрыжыкам.

Клініка была безыменнай, але выглядала шыкоўна, купка прылізаных карпусоў, аддзеленых адзін ад аднаго маленькімі акуратнымі садкамі. Ён памятаў гэтае месца зь першага месяца ў Чыбе, калі абышоў усе клінікі.

— Ты баісься, Кейс. Ты сапраўды баісься.

Была нядзеля папоўдні, ён стаяў з Молі ў нейкім унутраным дворыку. Белыя камяні, купка зялёнага бамбука, чорны пясок, укладзены роўнымі хвалямі. Садоўнік, падобны да вялікага мэталёвага краба, даглядаў бамбук.

— Усё будзе добра, Кейс. Ты нават не ўяўляеш, якія магчымасьці ў Армітажа. За тваё лячэньне ён заплаціць гэтым нэрваправам праграмай, якую ім дасьць, каб яны цябе вылечылі, там інфармацыя пра тое, як гэта зрабіць. Яны на тры гады апярэдзяць канкурэнтаў. Ты хоць уяўляеш сабе, колькі гэта каштуе?

Яна ўсунула вялікія пальцы ў петлі сваіх скураных джынсаў і калыхнулася назад на лякаваных абцасах каўбойскіх ботаў вішнёвага колеру. Вострыя насы яе ботаў былі абабітыя блішчастым мэксыканскім срэбрам. Пустыя ртутна-серабрыстыя лінзы разглядалі яго зь бясстраснасьцю казурак.

— Ты — вулічны самурай, — сказаў ён. — Як даўно ты на яго працуеш?

— Пару месяцаў.

— А перад тым?

— Рабіла на іншага. Працоўная дзяўчына, разумееш?

Ён кіўнуў.

— Забаўна, Кейс.

— Што забаўна?

— Мне здаецца, што я цябе добра ведаю. Гэтае ягонае дасье. Я ведаю, з чаго ты зроблены.

— Ты ня ведаеш мяне, сястра.

— Ты нармальны хлопец, Кейс. Тое, што з табою здарылася — гэта проста няфарт.

— А як наконт яго? Ён нармальны?

Робат-краб рухаўся ў іх бок, асьцярожна ступаючы па пясочных хвалях. Ягоны бронзавы панцыр мог мець і тысячу гадоў. Апынуўшыся на адлегласьці мэтра ад яе ботаў, ён стрэліў промнем сьвятла і замер, аналізуючы атрыманую інфармацыю.

— Перш за ўсё, Кейс, я заўсёды думаю пра сваю ўласную любую задніцу.

Краб зьмяніў курс, каб абмінуць яе, але яна дала яму высьпятка з дасканалай дакладнасьцю, срэбная набойка бота дзынькнула аб панцыр. Машына перакулілася на сьпіну, але хутка зноў стала на свае бронзавыя лапы. Кейс сядзеў на адным з камянёў, бурачы насамі ботаў сымэтрыю пясочных хваляў. Ён пачаў абшоргваць кішэні ў пошуках цыгарэтаў.

— У тваёй кашулі, — сказала яна.

— Дык ты адкажаш на маё пытаньне?

Ён выцягнуў пакамечаную «Ехэюань» з пачка, і яна падпаліла яе нямецкай сталёвай запальнічкай, якая выглядала, як хірургічны інструмэнт.

— Ну што я магу табе сказаць. Дзядзька пэўна натрапіў на штосьці. У яго вялікія грошы, а дагэтуль у яго ніколі іх не было, і ён увесь час бярэ дзесьці яшчэ.

Кейс заўважыў пэўнае напяцьце вакол яе вуснаў.

— Ці можа, можа, штосьці натрапіла на яго…

Яна паціснула плячыма.

— Што ты хочаш гэтым сказаць?

— Я ня ведаю дакладна. Я ведаю адно — што я ня ведаю, на каго ці на што мы на самай справе працуем.

Ён утаропіўся ў пару люстэрак. Пакінуўшы «Гілтан» суботнім ранкам, ён вярнуўся ў «Танны гатэль» і праспаў там дзесяць гадзінаў. Потым доўга бязмэтна шпацыраваў уздоўж ахоўнага пэрымэтру порту, назіраючы за чайкамі, што кружлялі за дротавай агароджай. Калі яна за ім сачыла, то рабіла гэта вельмі прафэсійна. Ён не хадзіў у Начны Горад, чакаючы ў сваёй труне званка ад Армітажа. Цяпер гэты ўнутраны дворык, нядзеля папоўдні, гэтая дзяўчына зь целам гімнасткі і рукамі штукара.

— Калі вы будзеце ўвайсьці цяпер, сэр, анэстэзіёляг чакае вас прыняць.

Тэхнік пакланіўся і зноў увайшоў у дзьверы клінікі, не азіраючыся, каб спраўдзіць, ці ідзе Кейс сьледам за ім.

Халодны сталёвы пах. Лёд лашчыць хрыбет. Згублены, такі маленькі ў цемры, рукі халаднеюць, вобраз уласнага цела растае ў калідорах тэлевізійнага неба. Галасы. Потым чорнае полымя ахапіла разгалінаваныя нэрвовыя канчаткі, і — боль, мацнейшы за ўсё, што калі-кольвек называлі болем…

Ляжы спакойна. Не варушыся. Тут былі і Рац, і Лінда Лі, Уэйдж і Лоні Зоўн, сотня твараў з нэонавага лесу, і матросы, і дзялкі, і шлюхі, неба — атручанае срэбра, па-над дротавай агароджай і турмой чэрапа. Не варушыся, чорт цябе дзяры! Там, дзе ў небе шыпеньне тэлевізійных перашкодаў пераходзіла ў бясколернасьць матрыцы, ён краем вока заўважыў зіхоткія сюрыкены, ягоныя зоры.

— Ціха, Кейс, мне трэба знайсьці тваю вену!

Яна сядзела вярхом на ягоных грудзях, трымаючы ў адной руцэ тонкі плястыкавы шпрыц.

— Калі ня будзеш ляжаць спакойна, я перарэжу тваё доўбанае горла. Ты яшчэ напампаваны эндарфінавымі інгібітарамі.

Ён прачнуўся і ўбачыў, што яна ляжыць побач зь ім. Было цёмна. Шыя здавалася крохкай, нібы зробленай з сухіх галінак. Трохі вышэй за паясьніцу адчуваўся бесьперапынны пульсоўны боль у хрыбце. Вобразы зьяўляліся і мянялі форму: мігатлівы калейдаскоп вежаў Гігаполісу і няроўных Фулеравых купалоў, цьмяныя фігуры рухаюцца яму насустрач у цяні ці то моста, ці то эстакады…

— Кейс? Сёньня серада, Кейс.

Яна заварушылася, пераварочваючыся. Грудзі кранулі ягоную

руку каля пляча. Ён пачуў, як яна зьдзірае алюміневую накрыўку з бутэлькі вады, п’е.

— Трымай, — яна ўклала бутэльку ў ягоную руку. — Я магу бачыць у цемры, Кейс. У мае акуляры ўбудаваныя мікраканальныя ўзмацняльнікі відарысу.

— Мне сьпіна баліць.

— Гэта там, дзе табе мянялі сьпіннамазгавую вадкасьць. Кроў таксама замянілі. Кроў — таму што табе таксама паставілі новую падстраўнікавую залозу. А яшчэ яны зрабілі латку з новай тканкі на тваёй пячонцы. Што рабілі з нэрвамі — ня ведаю. Шмат іньекцыяў. Яны не абавязаныя былі распавядаць пра дэталі працы.

Яна села побач зь ім.

— Цяпер 2:43:12 ночы, Кейс. У маю аптычную нэрву ўжыўлены лічыльнік.

Ён сеў і паспрабаваў адпіць з бутэлькі. Папярхнуўся, закашляўся, цеплаватая вада запырскала ягоныя грудзі.

— Мне трэба дэка, — пачуў ён уласны голас. Ён пачаў намацваць у цемры сваё адзеньне. — Я хачу ўпэўніцца…

Яна засьмяялася. Маленькія моцныя рукі схапілі яго за плечы і прыціснулі долу.

— Выбачай, герой. Прыйдзецца пачакаць восем дзён. Твая нэрвовая сыстэма вываліцца на падлогу, калі ты падключысься зараз. Загад лекараў. Апроч таго, яны кажуць, што апэрацыя прайшла пасьпяхова. Празь дзень ці два цябе яшчэ раз абсьледуюць.

Ён зноўку лёг.

— Дзе мы?

— Дома. У «Танным гатэлі».

— А дзе Армітаж?

— У «Гілтане». Прадае пацеркі тубыльцам ці штосьці накшталт гэтага. Мы хутка адсюль зьедзем. Амстэрдам, Парыж, а потым дахаты — у Гігаполіс.

Яна дакранулася да ягонага пляча.

— Перавярніся. Я раблю добры масаж.

Ён лёг на жывот, кончыкі пальцаў ягоных выпрастаных рук краналіся сьцяны труны. Яна села вярхом на ягоную паясьніцу, абапіраючыся каленямі на тэмпэрлён. Скура яе джынсаў халадзіла яму сьпіну. Яе пальцы пагладжвалі яго шыю.

— А чаму ты ня ў «Гілтане»?

Замест адказу яна адхілілася назад, сунула руку яму паміж ног і пяшчотна абхапіла ягоную машонку ўказальным і вялікім пальцамі. Хвіліну яна калыхалася па-над ім у цемры, трымаючы другую руку на яго шыі. Скура яе джынсаў мякка парыпвала ў такт рухам. Кейс заёрзаў, адчуваючы, як упіраецца ў тэмпэрлён ягоны ацьвярдзелы чэлес. У галаве пульсаваў боль, але ломкасьць у шыі, здавалася, адступіла. Ён прыўзьняўся на адным локці, перавярнуўся, зноў апусьціўся на тэмпэрлён, пацягнуўшы яе за сабою, ліжучы яе грудзі. Вільготныя смочкі, маленькія і цьвёрдыя, сьлізгалі па ягонай шчацэ. Ён намацаў маланку скураных джынсаў і пацягнуў замок уніз.

— Ня трэба, — сказала яна, — я добра бачу.

Гук сьцягваньня джынсаў. Па кароткім змаганьні яна вылезла зь іх. Закінула на яго нагу, ён дакрануўся да яе твару. Нечаканая цьвёрдасьць імплянтаваных лінзаў.

— Ня трэба, — сказала яна, — застануцца адбіткі.

Зноў асядлаўшы яго, яна ўзяла ягоную руку, завяла сабе за сьпіну і паклала так, што яго вялікі палец апынуўся між яе клубоў, астатнія накрылі похву. Калі яна пачала апускацца, пульсоўныя вобразы вярнуліся, твары, фрагмэнты нэонавых

шыльдаў зьяўляліся і адступалі. Яна сьлізганула ўніз, ён у ёй, і яго сьпіна канвульсіўна выгнулася. Яна скакала, працінаючы сябе ім, сасьлізгваючы ўніз і ўзьнімаючыся, пакуль абое ня скончылі, яго аргазм блакітным сполахам у бясчасавай прасторы, у абшары, бязьмежным, як матрыца, дзе твары рассыпаліся, зьніклі, зьнесеныя ўраганам прэч па зьвілістых калідорах, і яе сьцёгны, моцныя і мокрыя, сьціскалі яго цела.

На Нінсэй радзейшая, будзённая вэрсія натоўпу рухалася ў рытме свайго звыклага танцу. Грымотныя хвалі выплюхваліся з гульнявых аркадаў і патынка-холаў. Кейс зазірнуў у «Чатсуба» і ўбачыў Зоўна, які назіраў за сваімі дзяўчатамі ў цёплым піўным паўзмроку. Рац быў за стойкай.

— Бачыў Уэйджа, Рац?

— Сёньня — не.

Заўважыўшы Молі, Рац узьняў брыво.

— Убачыш яго, скажы, што ў мяне ёсьць грошы.

— Лёс мяняецца, артыст?

— Пакуль рана казаць.

— Мне трэба пабачыць гэтага чалавека, — сказаў Кейс, гледзячы на сваё адлюстраваньне ў яе акулярах. — Я мушу згарнуць біз.

— Армітажу не спадабаецца, калі я выпушчу цябе з поля зроку.

Яна стаяла пад Дынавым цякучым гадзіньнікам, рукі ў бакі.

— Ён ня будзе са мною размаўляць у тваёй прысутнасьці. На Дына мне пляваць, ён сам пра сябе клапоціцца. Але ёсьць людзі, якія папросту зьнікнуць, калі я проста так зьеду з Чыбы. Гэта мае людзі, разумееш?

Яе губы напяліся. Яна пакруціла галавой.

— У мяне ёсьць людзі ў Сынгапуры, сувязі ў Сындзюку і Асакуза ў Токіё, і ў іх могуць быць вялікія непрыемнасьці, разумееш? — схлусіў ён, паклаўшы руку на абцягнутае чорнай курткай плячо. — Пяць. Пяць хвілінаў. Па тваім гадзіньніку, добра?

— Мне плацяць не за гэта.

— Тое, за што табе плацяць — гэта адно, а тое, што праз надта літаральнае выкананьне тваіх інструкцыяў могуць загінуць мае блізкія сябры — гэта зусім іншае.

— Лухта. Твой самы блізкі сябар — твая срака. Ты ідзеш да гэтага кантрабандыста, каб даведацца пра нас з Армітажам.

Яна паставіла нагу ў каўбойскім боце на запылены кававы столік а-ля Кандзінскі.

— А, Кейс, хлопча! Твая спадарожніца, праўдападобна, узброеная, ня кажучы пра ладную колькасьць крэмнію ў яе галаве. Можаш мне патлумачыць, што тут адбываецца?

Прывідны кашаль Дына нібыта павіс між імі ў паветры.

— Пачакай, Джулі. Так ці іначай, увайду я адзін.

— Можаш у гэтым не сумнявацца, інакш і не атрымаецца, сынку.

— Добра, — сказала яна. — Ідзі. Але толькі пяць хвілінаў. Хоць трохі забавісься — я зайду і супакою твайго блізкага сябра назаўсёды. І паспрабуй штосьці ўведаць, пакуль ты там.

— Што?

— Чаму я раблю табе гэтую ласку.

Яна павярнулася і выйшла, мінаючы стосы белых пакункаў з-пад кансэрваванага імберца.

— Трапіў у яшчэ дзіўнейшую кампанію, чым звычайна, Кейс? —

спытаў Джулі.

— Джулі, яна пайшла. Пусьціш мяне? Калі ласка, Джулі?

Засаўкі адамкнуліся.

— Паволі, Кейс, — прамовіў голас.

— Уключы сваю апаратуру, Джулі, усё, што ў цябе на стале, — сказаў Кейс, займаючы сваё месца на шрубавым зэдліку.

— Яна ўвесь час уключаная, — мяккім голасам адказаў Дын, акуратна нацэльваючы на Кейса пісталет, які ляжаў сярод дэталяў старой мэханічнай друкаркі. Гэта быў рэвальвэр тыпу «магнум» з амаль цалкам сьпілаванаю руляй. Гарда курка таксама была абрэзаная, а рукаятка абматаная ізастужкай. У наманікюранай ружовай руцэ Дына гэтая зброя падалася Кейсу вельмі недарэчнай.

— Проста перасьцярога, ты ж разумееш. Нічога асабістага. Цяпер скажы мне, чаго ты хочаш.

— Мне патрэбны ўрок гісторыі, Джулі. І зьвесткі пра аднаго чалавека.

— У чым справа, сынку?

На Дыну была баваўняная кашуля ў каляровыя палоскі, яе каўнер быў белы і цьвёрды, як парцаляна.

— Ува мне, Джулі. Я зьяжджаю. Назаўсёды. Але зрабі мне ласку, добра?

— Пра каго табе трэба зьвесткі, сыне?

— Гайдзін па імені Армітаж, нумар люкс у «Гілтане».

Дын апусьціў пісталет.

— Сядзі спакойна, Кейс.

Ён нешта набраў на клявіятуры, што ляжала ў яго на каленях.

— Здаецца, мая сетка ведае ня больш за цябе, Кейс. Гэты джэнтэльмэн, падобна, мае часовую дамову зь якудза, а сыны нэонавай хрызантэмы ўмеюць хаваць сваіх саюзьнікаў ад тыпаў накшталт мяне. Лепей і я не зрабіў бы. Цяпер гісторыя. Ты сказаў гісторыя, — ён зноў узьняў пісталет, але ўжо ня цэлячы ў Кейса. — Якая гісторыя?

— Вайна. Што ты ведаеш пра вайну, Джулі?

— Вайна? А што пра яе ведаць? Доўжылася тры тыдні.

— «Кулак крыку».

— Вядомая рэч. Хіба цябе не вучылі гісторыі? Вялікі брудны пасьляваенны палітычны футбол, вось што гэта было. Сьпярша разьдзьмулі цэлы Ўотэргейт, пасьля замялі. Вашыя ваякі, Кейс, найвышэйшае кіраўніцтва Гігаполісу ў… дзе ж гэта было, у Макліне? Сядзелі па бункерах… вялікі скандал. Загубілі нямала маладога патрыятычнага мяса, каб праверыць якуюсьці новую тэхналёгію. Яны ведалі пра расейскую абарону, як высьветлілася пазьней. Ведалі пра ЭМІ, электрамагнітныя імпульсныя гарматы. Усё адно паслалі гэтых хлопцаў, проста дзеля экспэрымэнту, — Дын паціснуў плячыма. — Іваны пастралялі іх, як курапатак.

— Хто-небудзь выбраўся?

— Божа Хрысьце! — сказаў Дын. — Столькі гадоў мінула… Хаця, здаецца, колькі хлопцаў выратаваліся. Адна з камандаў. Захапілі савецкі баявы шрубалёт. Даляцелі на ім да Фінляндыі. Памежных пароляў яны, натуральна, ня ведалі і, пакуль перабраліся, дужа патрапалі фінскую абарону. Галаварэзы са спэцыяльных войскаў.

Дын чмыхнуў носам.

— Крывавая лазьня.

Кейс кіўнуў. Пах кансэрваванага імберцу быў усёпранікальны.

— Падчас вайны я быў у Лісабоне, — сказаў Дын, паклаўшы

пісталет на стол. — Мілае месца, Лісабон.

— У войску, Дын?

— Не зусім. Але тыя падзеі паўзь мяне не прайшлі, — Дын усьміхнуўся сваёй ружовай усьмешкай. — Проста цуд, што вайна можа рабіць з рынкам.

— Дзякуй, Джулі. Я твой даўжнік.

— Няма за што, Кейс. І бывай.

А потым ён успомніць, што тым вечарам у «Саміс» яго ад самага пачатку перасьледавала дрэннае прадчуваньне, што нават калі ён ішоў за Молі тым калідорам, шоргаючы нагамі па ўтаптаным дыване з квітковых карэньчыкаў і пластыкавых кубкаў, ён ужо адчуваў яе. Сьмерць, што стаілася ў чаканьні Лінды…

Пасьля візыту да Дына яны пайшлі ў «Намбан», дзе ён канчаткова разьлічыўся з Уэйджам стосам новых іенаў, якія яму даў Армітаж. Уэйджу гэта, натуральна, спадабалася, ягоным хлопцам гэта спадабалася менш, і Молі, стоячы побач з Кейсам, драпежна ўсьміхалася, усёй сваёй істотаю спадзеючыся, што хто-небудзь зь іх зробіць неабачлівы рух. Потым яны вярнуліся ў «Чат» выпіць.

— Марнуеш час, каўбой, — сказала Молі, калі Кейс дастаў з кішэні курткі васьмікутнік.

— Ты пра што? Таксама хочаш?

Ён працягнуў ёй таблетку.

— Твая новая падстраўнікавая залоза і латка на тваёй пячонцы. На замову Армітажа іх зрабілі так, каб твой арганізм ігнараваў гэтае гаўно.

Яна пастукала па васьмікутніку крывавым пазногцем.

— Ты цяпер біяхімічна няздольны атрымліваць прыход ад амфу ці какаіну.

— Чорт, — сказаў ён, паглядзеў на васьмікутнік, тады на яе.

— Праглыні яго. Праглыні дзясятак. Нічога ня будзе.

Ён праглынуў. Нічога не адбылося. Пасьля трэцяга піва яна стала пытаць Раца пра баі.

— «Саміс», — сказаў Рац.

— Я не хачу туды, — сказаў Кейс.

— Я чуў, што яны там забіваюць адно аднаго.

Яшчэ праз гадзіну яна ўжо купляла квіткі ў хударлявага тайца ў белай саколцы і механатых шортах для рэгбі. «Саміс» уяўляў сабой надзіманы купал за адным з партовых складоў, туга нацягнуты шэры матэрыял купалу быў узмоцнены сеткай з тонкіх сталёвых кабэляў. Калідор зь дзьвярыма ў абодвух канцах служыў прымітыўным паветраным шлюзам, што захоўваў перапад ціску, дзякуючы якому трымаўся купал. Да фанэрнай столі на аднолькавай адлегласьці адно ад аднаго былі прымацаваныя флюарэсцэнтныя кругі, але большасьць зь іх была разьбітая. Паветра было вільготнае і цяжкае ад паху поту і бэтону. Усё гэта яшчэ больш выводзіла Кейса з раўнавагі перад тым, што мусіла адбыцца — натоўп, напружанае маўчаньне, высачэзныя галяграфічныя фігуры пад стольлю купала. Бэтонныя рады для гледачоў спускаліся да пляцоўкі ў цэнтры, круглага ўзвышэньня ў гушчары міргаў праекцыйнай апаратуры. Ніякага сьвятла, апроч галяграмаў, якія мігцелі над рынгам, паўтараючы рухі двух мужчынаў на арэне. Пласты цыгарэтнага дыму ўздымаліся па-над бэтоннымі ўступамі і плылі ўгару, пакуль не разьбіваліся плынямі паветра з помпаў, што падтрымлівалі купал. Ніякага гуку, апроч прыглушанага бурчаньня помпаў і ўзмоцненага дыханьня байцоў. Мужчыны кружылі па арэне; каляровыя водбліскі іх галяграмаў струменіліся ў акулярах Молі. Галяграмы былі дзесяцікратнымі павелічэньнямі; у дзесяцікратным павелічэньні нажы, якія яны трымалі, былі амаль мэтар даўжынёй. Наколькі памятаў Кейс,

хват байца на нажах такі самы, як у фэхтавальшчыка: усе пальцы, акрамя вялікага, моцна абдымаюць рукаятку, вялікі палец на адной лініі зь лязом. Нажы, здавалася, рухаліся самі па сабе, з рытуальнай нясьпешнасьцю вырысоўваючы дугі і пасы свайго танцу, вастрыё мінала вастрыё, пакуль байцы чакалі, калі хто-небудзь зь іх адкрыецца. Прыўзьняты твар Молі быў гладкім і спакойным. Яна назірала.

— Пайду куплю чаго пад'есьці, — сказаў Кейс. Яна кіўнула, цалкам захопленая танцам. Яму не падабалася гэтае месца. Ён павярнуўся і пайшоў у цень. Занадта цёмна. Занадта ціха. Натоўп, як ён заўважыў, складаўся галоўным чынам зь японцаў. Натоўп не зусім тыповы для Начнога Гораду. Тэхнікі з карпарацыйных аркалёгіяў. Хутчэй за ўсё, гэта значыла, што арэна існавала са згоды якога-небудзь карпарацыйнага камітэту адпачынку. Цікава, мімаходзь падумаў Кейс, як гэта — усё жыцьцё працаваць на адну зайбацу. Карпарацыйнае жытло, карпарацыйны гімн, карпарацыйныя хаўтуры… Ён зрабіў амаль поўны круг вакол купалу, пакуль знайшоў прылаўкі зь ежай. Ён купіў якіторы на пожагах і дзьве высокія вошчаныя кардонкі піва. Зірнуўшы на галяграмы, ён убачыў, што па грудзях аднаго з байцоў сьцякае струменьчык крыві. Тлусты карычневы соўс сьцякаў па пожагах на ягоныя пальцы. Празь сем дзён ён зноў падлучыцца. Калі зараз заплюшчыць вочы, ён убачыць матрыцу. Цені скакалі па сьценах у рытме танцу галяграмаў. Вузел страху пачаў сьцягвацца між ягонымі лапаткамі. Цуркі халоднага поту сьцякалі па ягоных рэбрах. Апэрацыя не спрацавала. Ён усё яшчэ тут, ён усё яшчэ мяса, і ніякая Молі не чакае яго, не адрываючы вачэй ад мільганьня нажоў, ніякі Армітаж не чакае ў «Гілтане» з квіткамі, новым пашпартам і грашыма. Усё гэта было сном, нейкай недарэчнай фантазіяй… Гарачыя сьлёзы засьцілі зрок. Кроў пырснула зь ярэмнай вены аднаго з байцоў згусткам чырвонага сьвятла. Натоўп зароў, завішчэў, узьняўся са сваіх месцаў — адна зь фігураў сагнулася, яе галяграма пачала раставаць, мільгацець… Да яго горла падкаціліваніты. Ён заплюшчыў вочы, зрабіў глыбокі ўдых, расплюшчыў іх і ўбачыў, як проста міма яго прайшла Лінда Лі, сьляпы страх у яе шэрых вачах. На ёй быў той самы французскі камбінэзон.

І зьнікла. У цень. Чыста рэфлекторна, не разважаючы, ён кінуў долу піва і курыныя шашлыкі і пабег за ёю. Здаецца, ён крыкнуў яе імя, але ён ня быў упэўнены ў гэтым. Сьлед тонкага, як валасок, промня чырвонага сьвятла на рагавіцы. Сухі бэтон пад тонкімі падэшвамі ягоных чаравікаў. Белыя плямы яе красовак мільгаюць каля выгнутай сьцяны купала, і зноў уваччу адбітак прывіднай ніткі лазэру, якую на бягу злавіў ягоны зрок. Нехта зрабіў яму падножку. Бэтон разадраў яму далоні, ён пакаціўся, згубіўшы арыентацыю, паспрабаваў ударыць нагой. Над ім схіліўся танклявы хлопец, вясёлкавы німб вакол асьветленых ззаду калкоў бялявых валасоў. Над арэнай пад дзікі роў натоўпу ўзьняла нож галяграма пераможцы. Хлопец усьміхнуўся і выцягнуў нешта з рукава. Брытва, кранутая чырваньню трэцяга лазэрнага промня, што бліснуў скрозь цемру. Кейс глядзеў, як лязо апускаецца да ягонага горла, нібы рагулька лозашукальніка. Твар хлопца зьнік у гулкім воблаку мікраскапічных выбухаў. Стрэлкі зь пісталета Молі выляталі з хуткасьцю дваццаць залпаў за сэкунду. Хлопец канвульсіўна кашлянуў і зваліўся Кейсу на ногі.

Кейс рушыў у кірунку харчовых прылаўкаў, у цень. Паглядзеў уніз, чакаючы ўбачыць рубінавую голку лазэру, якая выходзіць зь яго грудзей. Нічога. Ён знайшоў яе. Яна ляжала каля бэтоннай калёны з заплюшчанымі вачыма. Пахла палёным мясам. Натоўп напеўна скандаваў імя пераможцы. Прадавач піва выціраў свае краны цёмнай анучай. Адзін белы красовак зьляцеў зь яе нагі пры падзеньні і ляжаў цяпер каля яе галавы. Ісьці ўздоўж сьцяны. Бэтонны выгін. Рукі ў кішэнях. Ісьці і не спыняцца. Міма невідушчых твараў, вачэй, прыкутых да галяграмы пераможцы. Нейкі эўрапейскі твар заскакаў у водбліскаў запалкі, вусны самкнёныя вакол кароткага чаранка мэталёвай трубкі. Пах гашышу. Кейс пацягнуўся далей, не адчуваючы нічога.

— Кейс, — яе люстэркі праступілі зь цемры, — усё нармальна?

Штосьці енчыла і булькатала ў цяні за ейнай сьпінай. Ён кіўнуў.

— Бой скончаны, Кейс. Час ісьці дамоў.

Ён паспрабаваў прайсьці міма яе, назад у цемру, дзе штосьці паміралa. Яна спыніла яго, паклаўшы далонь яму на грудзі.

— Сябры твайго блізкага сябра. Забілі тваю дзяўчыну. Відаць, ня надта ты ладзіў зь сябрамі ў гэтым горадзе. Мы сабралі кароткае дасье на гэтага старога выродка, калі займаліся табой, дружа. Ён каго заўгодна засмажыць за некалькі новых. Той тып ззаду сказаў, што яны выйшлі на яе, калі яна спрабавала сьпіхнуць інфу з твайго кампа. Для іх проста таньней было забіць яе і забраць чып. Ашчадзіць трохі грошай… Я прымусіла чувака з лазэрам расказаць пра ўсё. Тое, што мы апынуліся тут адначасова зь імі — выпадак, але я мусіла ўпэўніцца.

Яе рот быў напяты, вусны сьціснутыя ў тонкую рысу. Кейсу здавалася, нібыта хтосьці сьціскаў ягоныя мазгі.

— Хто, — спытаў ён, — хто іх паслаў?

Яна працягнула яму заплямлены крывёю пакунак кансэрваванага імберца. Ён убачыў, што яе рукі былі ў крыві. За яе сьпінаю, у цяні, хтосьці выдаў цяжкі хрып і памёр.

Пасьля заключнага абсьледаваньня ў клініцы Молі адвезла яго ў порт. Там іх чакаў Армітаж. Ён замовіў карабель на паветранай падушцы. Цёмныя вуглы аркалёгіяў былі апошнім, што мог разгледзець Кейс, пакідаючы Чыбу. Потым усё праглынуў туман, што слаўся па-над чорнай вадой, пакрытай чародамі сьмецьця.

ЧАСТКА ДРУГАЯ
ПАХОД ПА КРАМАХ

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2007/03/03**
[image]

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 12 (52) - 2006**
[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]
[image] [image] [image]2006
[image] [image] [image]
[image] [image] [image]
[image] [image] [image]

— Мне трэба зьняць бараду, — кажу.
— Не! — вішчыць Джоэл, мой чатырохгадовы сын.
— Па мне ўжо высыпка пайшла.
— Санта, застанься са мной, калі ласка, — просіць Джоэл.
Звоніць тэлефон.
— Не адказвай! — патрабуе Джоэл.
Я чую, як уключаецца аўтаадказчык.
Першапачатковы плян — я прыдумаў яго, калі мы сьнедалі, падчас хвіліннай паўзы ў размове — быў такі: пераапрануты Сантам, я падкрадаюся да Джоэла і кажу басам: «Хо! Хо! Хо!» Мы павесялімся, а потым я здыму бараду і ўсё будзе як звычайна. Але атрымалася інакш. Джоэл ведаў, што гэта я, але яму так спадабалася мець уласнага Санту, што ён ну ніяк не хацеў выходзіць з гульні. Тры гадзіны таму ён прашаптаў: «Санта, ты застанесься са мной назаўжды?»
— Так, — адказаў я. — Застануся. Назаўжды…
Цяпер я кажу:
— Здаецца, у мяне алергія на гэтую бараду.
— Не, Санта! — просіць Джоэл. — Не сыходзь!
Я з мальбой гляджу на жонку. Элейн паціскае плячыма і ідзе на кухню. Яна лічыць, што я сам вінаваты.
— Напэўна, у мяне крапіўніца, — кажу я. — А яшчэ пачынаецца кляўстрафобія.
— Не, Санта, не! — крычыць Джоэл.
— Мне не хапае паветра, — хрыплю я, — я задыхаюся.
Мяне ахоплівае паніка.
— А цяпер — спакойна: я здымаю бараду! — кажу я. І здымаю.
Джоэл з плачам выбягае з пакою. Я іду наверх, каб запаліць цыгарэту.
У кабінэце я заходжу ў Інтэрнэт на сайт «Сустрэчы старых сяброў». Апошнім часам я лажу туды даволі часта. Некалькі тыдняў таму я вырашыў знайсьці электронныя адрасы хлопцаў, якія ўзімку 1983 году кінулі мяне ў возера Роўт-парк у Кардыфе. Мне тады было шаснаццаць. Неяк у нядзелю апоўначы я зразумеў, што ўсе яшчэ злуюся і не магу ім гэтага дараваць. Я знайшоў аднаго нягодніка і даслаў яму ліст, дзе напісаў, што цяпер я папулярны аўтар бэстсэлераў.
Празь некалькі гадзінаў ён адказаў. Напісаў, што яны кінулі мяне тады ў возера, бо я быў выключным засранцам, а з тону майго ліста вынікае, што ім і застаўся. І што найлепшым

адказам на такі ліст было б кінуць мяне ў возера яшчэ раз.
Я напісаў, што ён — паводле ягонай анкеты — усяго толькі страхавы агент, і я напэўна зарабляю больш.
Ён не адказаў.
Touche!
— Санта! — кліча зьнізу Джоэл.
— Іду! — крычу я.
Паведамленьне на аўтаадказчыку — ад маці.
Яна з бацькам, маім братам і ягонай жонкай запраўляе гатэлем «Нант Ду» ў гарах Брэкан Бэканз, што ў цэнтральнай Валіі. Я прыяжджаю дадому на кожнае Раство і ў пэўны момант заўсёды кажу, што для мяне гэта самы сапраўдны гатэль. Пасьля маіх словаў усе кожны раз сьмяюцца.
Часам у гатэлі спыняюцца знакамітасьці. Тады маці заўсёды тэлефануе мне. Калі ў гатэль прыехаў Джон Коўл, журналіст зь Бі-Бі-Сі, яна патэлефанавала і сказала: «Здагадайся, хто ў нас спыніўся? Джон Коўл. І ён пра цябе ня ведае». Некалькі гадоў таму ў гатэль на ланч заехаў Джон Бэрт, тагачасны генэральны дырэктар Бі-Бі-Сі. Бацька падышоў да ягонага століка.
— Вы Джон Бэрт? — запытаўся ён.
— Так, — адказаў Джон Бэрт.
— Ці не маглі б вы нам дапамагчы? — спытаў бацька. — У гэтым раёне вельмі кепска ідзе тэлевізар: заўсёдны трэск і карцінка плыве. Ці можна што-небудзь зрабіць?
Думаю, бацька чакаў, што Джон Бэрт залезе на дах і адрамантуе антэну.
— Пра што мы толькі ні гутарылі, — расказваў мне потым па телефоне бацька. — Ён ня мог паверыць, што мая машына была ў рамонце ўжо шэсьць разоў.
— І ён пра цябе ня ведае, — дадала маці з паралельнага апарата.
Нядаўна збылася мара маіх сямейнікаў: яны перамаглі ў конкурсе «Валійскі гатэль году». Гэта было вельмі пачэсна, і родныя захацелі неяк адзначыць посьпех. Яны вырашылі замовіць мастаку партрэт, каб увекавечыць сям'ю Ронсанаў.
— Гэта будзе сямейны партрэт, — паведаміла па тэлефоне маці. — Партрэт сям'і Ронсанаў. Мы павесім яго ў бары. Ты зможаш пазаваць?
— Вядома, — адказаў я. — А хто будзе маляваць?
— Вельмі таленавіты тутэйшы мастак, хоць яму і нялёгка

даводзіцца. Ён расьпісваў сьцены новага кінатэатру ў Кардыфе. Напэўна, ты чуў пра яго.
— Не, — адказаў я.
— Перастань, — сказала маці. — Усе газэты пра гэта пісалі. Высьветлілася, што ў дадатак да асноўнай спэцыяльнасьці мастак займаецца маляваньнем партрэтаў знакамітасьцяў у клясычным рэнэсансным інтэр'еры: скажам, Клінт Іствуд, які ўзносіцца ў нябёсы ў атачэньні анёлаў. Любоўна ўвасобленыя вобразы зорак навялі маіх бацькоў на думку: у гатэлі спыняецца шмат вядомых людзей. А што калі і іх уключыць у сямейны партрэт?
— Ты толькі паслухай! — тэлефанавала на наступны дзень маці. — Мы, Ронсаны, стаім на лужайцы перад гатэлем у атачэньні вядомых людзей.
— Якіх канкрэтна? — пацікавіўся я. — Тых, хто спыняўся ў гатэлі?
— Зусім неабавязкова, — сказала маці. — Любых знакамітых асобаў. Назаві да пятніцы сваіх трох. У нас вельмі мала часу. Дашлі мастаку сваю фатаграфію і хутчэй выбірай знакамітасьцяў, жывых ці памерлых. Комікі, палітыкі, акторы — усё роўна.
— Пачакай, я ня ўсё зразумеў…
— Няма чаго разумець, — сказала маці.
— Табе не здаецца, што будзе крыху нясьціпла? — запытаўся я.
— Я выбрала прэзыдэнтаў Кенэдзі, Гандзі і Чэрчыля. Паведамленьне на маім аўтаадказчыку — акурат з гэтай нагоды. Ці склаў я ўжо сьпіс сваіх знакамітасьцяў?
У мяне няма часу на такія забаўкі. Я стварaю для Джоэла найлепшае ў сьвеце Раство. Гэта частка майго генэральнага пляну па забесьпячэньні яму абсалютна казачнага дзяцінства. Не хачу сьпяваць сабе дыфірамбы, але, здаецца, ніхто з маіх продкаў не дарыў дзецям столькі чароўных хвілінаў, колькі я Джоэлу. Я амаль не спыняюся — можа, толькі каб падняцца ў кабінэт па цыгарэты. Гэтае Раство павінна стаць вяршыняй няспыннай складанай працы.
Шмат разоў за гэты месяц, чакаючы за школьнай брамай Джоэла, я размаўляў зь іншымі бацькамі пра тое, як яны зьбіраюцца арганізаваць для сваіх дзяцей найлепшае ў сьвеце Раство. Цікава, ці сустрэну я кагосьці зь іх у Ляпляндыі? Сёньня адна мама відавочна нэрвавалася. Яна расказала, што ўчора яе

чатырохгадовы сын запытаўся, ці памрэ ён.
— І што вы адказалі? — спытаўся я.
— Я, — уздыхнула яна, — адказала, што ён ніколі не памрэ. «А вы з татам? — пытаецца ён. — Ці памраце вы?» «Не, — кажу, — і мы ніколі не памром. Ніхто з нас не памрэ».
Яна занепакоена паглядае на мяне.
— Вы слушна зрабілі, — сказаў я.
Часам мне здаецца, што мы як рота сапэраў-аматараў, якія заўсёды пераразаюць ня той дрот.
У брашурцы пра Ляпляндыю сьцьвярджаецца, што Джоэл будзе катацца на сабаках, на паўночных аленях, на аэрасанках, на звычайных санках і — урэшце — сустрэнецца з самім Сантам у сьнегавым доме ў густым хваёвым лесе. І я не аплачваю падарожжа. Я пішу пра яго і здаю артыкул у «Гардыян». Гэта значыць, што я абсалютна бясплатна забясьпечваю Джоэлу казачнае, незабыўнае Раство, да таго ж ён атрымлівае ад мяне адзіны ў сваім родзе падарунак — славу. Рэч у тым, што «Гардыян» дасылае ў Ляпляндыю фатографа Бэры Льюіса, які будзе здымаць Джоэла (Джоэл гуляе ў сьнежкі, Джоэл катаецца на аленях, Джоэл з Сантам і г. д. і да т. п.). Здымкі зьявяцца на вокладцы каляднага нумару «Ўік-энд» — дадатку да «Гардыян». Мы захаваем гэты нумар, і калі — праз гады — Джоэл будзе праглядаць яго, ён ацэніць, што калісьці ягоны бацька змог зьмясьціць фатаграфію сына на вокладцы.
Да Ляпляндыі застаецца два дні. Я падумваю, а ці не звазіць Джоэла спачатку ў Каралеўства Санты ва Ўэмблі. У рэклямцы яно выглядае бы ў казцы — засьнежаная вёсачка, як з каробкі шакалядных цукерак, разьмешчаная ў выставачных залях нумар 1 і 2 Уэмблі. На афіцыйным сайце ёсьць урывак зь дзёньніка сямігадовай наведніцы Мэры Т. Мур. Яна піша: «12 сьнежня 2002 г. Мы зарэгістраваліся, і нам выдалі бранзалеткі цудоўнага ярка-блакітнага колеру. Вуліца Эльфаў — проста супэр! Санта абсалютна такі, як на здымках, і ён сапраўды багата есьць шакаляду. Мы гулялі ў Алеі сьнежак, а мама хадзіла па крамах».
Хаця гэты запіс датаваўся 12 сьнежня, на сайце ён зьявіўся 29 лістапада. Мяне гэта насьцярожвае. А ці была ўвогуле Мэры Т. Мур? Маркетынгавыя хітрыкі — нармальная рэч у штодзённым дарослым жыцьці, але я ствараю ідэальнае Раство для чатырохгадовага дзіцяці, і мне зусім ня хочацца, каб мяне

ашукалі. Рэальных ворагаў, ад якіх я мог бы абараняць свайго сына, няма, але я заўсёды баюся, што нейкі прыхадзень можа неабачліва зьнішчыць тую атмасфэру казкі, якую я ствараю вакол яго. Я вырашаю ня ехаць у Каралеўства Санты.
Тэлефануе бацька.
— Ты каго выбраў са знакамітасьцяў? — пытаюся я.
— Гары Плэера, Арнолда Палмэра і Джэка Ніклаўса, — кажа ён.
— Усе — гульцы ў гольф? — удакладняю я.
— А ты каго выбраў? — пытаецца маці з паралельнага тэлефона.
Мне нічога не прыходзіць да галавы. Я пачынаю панікаваць. Я ўяўляю, як — праз стагодзьдзі — аўтарытэтныя гісторыкі мастацтва зьбіраюцца каля карціны і абменьваюцца саркастычнымі заўвагамі. Мне зусім не падабаецца задума маіх бацькоў, таму я і не сьпяшаюся з выбарам.
— Няхай гэтымі няшчаснымі будуць «Beverly Sisters», — кажу я. Насамрэч мяне не цікавяць дзявочыя музычныя гурты 1950-х, але я дакладна ведаю, што ўсе «сястрычкі» выглядаюць абсалютна аднолькава. І я выбіраю іх, каб мастацтвазнаўцы ў далёкай будучыні зразумелі, што гэта мой іранічны маўклівы пратэст.
— «Beverly Sisters» ня пойдуць, — маці адразу раскусіла мой плян: яна ўсё ж крыху мяне ведае.
— А «Sister Sledge»?
— Ты хочаш усё сапсаваць? — пытаецца маці.
Я саступаю і называю свайго сапраўднага куміра.
— Рэндзі Ньюман, — кажу я.
— Рэндзі Ньюмана ніхто ня ведае, — укалола мяне маці.
Нарэшце мы прыходзім да кампрамісу. У вечнасьці я застануся ў кампаніі з Айкам і Тынай Тэрнэр ды Барысам Ельцыным.
Я вырашаю не гаварыць Джоэлу, што мы едзем у Ляпляндыю. Няхай гэта будзе для яго чароўнае казачнае падарожжа. У таксі па дарозе ў аэрапорт Джоэл літаральна засыпае мяне пытаньнямі, каб дазнацца, куды мы едзем.
— Гэта «Музэй чалавека»? Ура! Нарэшце мы ідзём у «Музэй чалавека»!
«Музэй чалавека» — гэта выстава забальзамаваных чалавечых парэшткаў.
— Не, — адказваю я.

Джоэлаў тварык пахмурнее.
— Я хачу ў «Музэй чалавека»! — хныкае ён.
— Паслухай, — строга кажу я, — калі ты будзеш кепска сябе паводзіць, мы вернемся і зноў будзем глядзець «Стомп».
— Не! — крычыць Джоэл. — Ён глыбока ўстрывожаны такой пэрспэктывай. — Толькі ня «Стомп»! Калі ласка, толькі ня «Стомп»!
Пагроза дзейнічае некалькі хвілінаў. Потым ён пачынае зноў.
— Калі мы ня пойдзем у «Музэй чалавека», — паведамляе Джоэл, — я буду ўвесь час казаць «ідзі ты ў дупу».
— Джоэл, мы ня пойдзем у «Музэй чалавека».
— Ты горшы за Джонатана Кінга! — вішчыць Джоэл.
Таксіст падазрона косіцца на нас у люстэрка. Я праклінаю той дзень, калі растлумачыў Джоэлу, што Джонатан Кінг — а сыну страшэнна падабаецца яго музыка — у турме за тое, што крыўдзіў хлопчыкаў.
— Ідзі ты ў дупу! — крычыць Джоэл.
Я вымаю апошні козыр, аргумэнт, які заўсёды спрацоўвае.
— *Ісус* ніколі б не сказаў «ідзі ты ў дупу», і *Ісус* не прасіўся б у «Музэй чалавека», — кажу я.
Джоэл любіць Ісуса. Я ня ведаю, адкуль гэта ўзялося, — падазраю, што з рэклямнага роліку да мульціку «Ягнё Божае» на касэце са «Скубі Ду і Прывід Вядзьмаркі». Сям'я ў нас не рэлігійная. Як і многія людзі, я рашуча адмовіўся амаль ад усяго, што заходнеэўрапейцы называюць «быць часткай чагосьці большага за сябе». Я не належу ні да адной арганізацыі. Не наведваю сынагогу. Адзіныя клюбы, куды я ўваходжу, — гэта спартзаля, дзе я ні з кім не размаўляю, і фан-клюб Рэндзі Ньюмана, на сайт якога я зрэдку залажу. Калі я быў малы, у бацькі, як і ў большасьці людзей ягонага пакаленьня, хапала энэргіі на разнастайныя клюбы: крыху энэргіі на гольф-клюб, крыху — на брыдж-клюб, крыху — для дому і сям'і. Я ж сканцэнтраваў усю сваю энэргію на Джоэлу.
Поўнач Фінляндыі. Ляпляндыя. Нядзеля. Вечар. Нас усяго пяцёра — своеасаблівая арктычная міні-экспэдыцыя: Сэмі, тутэйшы гід і кіроўца, Бэры Льюіс, фатограф з «Гардыян», адказны за дасканалы здымак Джоэла з Сантам для вокладкі, мая жонка Элейн, Джоэл і я. Палова на восьмую. Сэмі толькі што забраў нас з аэрапорту Куусама. Мы яшчэ не даехалі да бервяной хаткі паблізу Руку, якая на найбліжэйшыя тры ночы

стане нашым домам. Замест гэтага Сэмі адвёз нас у салён пракату — будан у лесе, — дзе мы бяром зімовую адзежу. Мы крыху пабегалі па лесе і пагуляліся ў сьнежкі. Джоэл ніколі яшчэ не дакранаўся да сапраўднага сьнегу, ён у захапленьні. Але сем гадзінаў падарожжа зь перасадкай у хэльсынскім аэрапорце (дзьве гадзіны чаканьня) даліся ў знакі: ён зусім стомлены.

— Можна, я пайду спаць? — пытаецца ён у дарослых.

Сэмі загадкава ўсьміхаецца.

— А магчыма, сёньня цябе чакае штосьці цікавейшае за сон. Напрыклад, неймаверныя калядныя прыгоды.

— Спачатку — неймаверныя прыгоды ў сьне, — весела адказвае Джоэл, — а калядныя прыгоды наяве пакінем на заўтра.

— А вось і не, — сьмяецца Сэмі, — а вось, можа, прыгоды пачнуцца сёньня.

Я адводжу Сэмі ў бок.

— Што адбываецца? — пытаюся.

— Джоэл павінен сустрэцца з Сантам менавіта сёньня! — нэрвова шэпча ён. — Каля дому ўжо чакаюць конныя санкі. Яны вас адвязуць да іншай хаткі — там ужо схаваўся Санта, чакае Джоэла.

— Хай яно лясьне! — лаюся я.

Джоэл пазяхае, не падазраючы, што набліжаюцца непрыемнасьці.

Элейн учула сёе-тое з нашай размовы і цяпер з жахам глядзіць на мяне, просіць, каб я, дзеля ўсяго сьвятога, угаварыў іх адкласьці сустрэчу з Сантам.

— Джоэл вельмі стаміўся, — кажу я. — Няўжо нельга сустрэцца з Сантам раніцай? Мы выбіліся са звыклага рытму, нам трэба распакаваць рэчы, акліматызавацца.

— Гэта немагчыма, — адказвае Сэмі зь дзівоснай рашучасьцю. Маўчаньне.

— Быць можа, убачыўшы каня і санкі, Джоэл узбадзёрыцца, — кажу я.

Упяцярых мы загружаемся ў мікрааўтобус і едзем праз засьнежаны лес. Нарэшце кіроўца паварочвае, і ад зьдзіўленьня ў нас ва ўсіх перахоплівае дыханьне. Блішчаць пад сьнегам хвоі, а пасярод іх — наша хатка пад вялізнай пухнатай шапкай сьнегу. Да яе вядзе дарога, абапал якой палаюць сьвечкі. Перад

дамком чакаюць конныя санкі са званочкамі. Знутры яны высланы аленевымі скурамі. Я ніколі ў жыцьці ня бачыў нічога больш чароўнага.
— У ложак! — крычыць Джоэл. Ён выскоквае зь мікрааўтобуса і, не зьвяртаючы ніякай увагі на санкі і каня, наўпрост ляціць у цёплую хатку. Я іду за ім. Ён ужо знайшоў ложак, ускочыў у яго і па самыя вушы схаваўся пад пуховай коўдрай.
— Вельмі добры ложак, — пазяхае ён. — Дабранач.
— Па-мойму, — кажу, — з табою вельмі хоча пазнаёміцца нехта незвычайны. Акурат цяпер, перад сном.
Джоэл хвілінку думае.
— Не, — адказвае ён.
Я шпарка выходжу.
— Сэмі, — кажу я, — у нас сур'ёзная праблема. Джоэл ужо амаль сьпіць. Яму толькі чатыры гады.
— Праблема сапраўды сур'ёзная, — адказвае Сэмі, — бо Санта заплянаваны толькі на сёньня, яго немагчыма адкласьці.
За Джоэла заступаецца фатограф Бэры.
— Вам патрэбны здымкі напалоханага, стомленага і заплаканага дзіцяці? — пытаецца ён.
— Не, — адказвае Сэмі. — Але мы ня можам зьмяніць графік.
У цемры за домам я заўважаю нейкія цьмяныя постаці. Я ня ведаю, хто гэта, — магчыма, маленькія шрубкі вялікага мэханізму, які відавочна даў збой. Я кідаюся да Элейн.
— Яны не адступяцца! — шапчу я.
— О Божа! — кажа яна.
— Я нікуды не пайду! — крычыць Джоэл з акна.
Я бягу ў дом.
— Конік плача, — кажу я, — бо ён страшэнна хоча з табой пазнаёміцца. Чуеш, як плача?
Звонку абсалютна ціха.
— Добра, — згаджаецца Джоэл, — я пазнаёмлюся з канём, і ўсё. А потым — адразу ў ложак.
Мы з Джоэлам выходзім.
— Здароў, косю, — велікадушна зьвяртаецца ён да каня.
— Джоэл, — кажа Сэмі, — а ты ня хочаш пасядзець у санках, пакуль будзеш размаўляць з канём?
Джоэл недаверліва глядзіць на Сэмі, аднак залазіць у санкі. Я хуценька ўскокваю сьледам і захутваю Джоэла ў аленевую скуру. Элейн і Бэры залазяць за намі.

— Ну! — сыкаю я. — Паехалі!
Фурман пстрыкае пугай, і конь нясьпешліва трушком бяжыць па засьнежанай сьцяжынцы да Санты. Апускаецца чароўная цішыня. З кожным крокам каня чароўна заліваюцца званочкі. Загадкава пабліскваюць хвоі, а над намі бязгучна мігціць паўночнае зьзяньне. Джоэл весялее і пачынае напяваць сабе пад нос песеньку «Званочкі зьвіняць».
— Як прыгожа! Праўда, Джоэл? — зьвяртаюся я да сына.
Джоэл не адказвае.
Элейн і Бэры за маёй сьпінай увесь час наракаюць.
— Няўжо так цяжка было дамовіцца на зручны час? — бурчыць Бэры.
— Жудасьць! — згаджаецца Элейн.
Тут, пасярод казачнага хваёвага лесу, яны накручваюць сябе ледзь не да шаленства.
— Сюды прывозяць сьмяротна хворых дзяцей, — кажа Элейн.
— Як можна прымушаць сьмяротна хворае дзіця сустракацца з Сантам?
— Маеце рацыю, — пацьвярджае Бэры.
Мы спыняемся перад хаткай. Унутры нас чакае сьвяточна ўбраны стол, а на ім — столькі смакоцьця… Джоэл абвёў поглядам вяндліну, прысмакі, сокі, ласасіну і разрыдаўся.
— Вы мяне падманулі! — крычыць ён, кідаецца пад лаўку і скручваецца там у позе эмбрыёна.
Звычайна ў такіх сытуацыях, каб палепшыць Джоэлу настрой, я пачынаю са скуры вылузвацца, як клоўн, бо галоўнае для мяне — захаваць для Джоэла атмасфэру казкі. За рэквізыт пойдзе ўсё, што трапіць пад руку, і ў сваю прымітыўную буфанаду я ўстаўляю падбадзёрваньні тыпу «Ты надзвычай таленавіты, Джоэл!», «Цябе чакае бліскучая будучыня!».
Цяпер жа я шапчу Сэмі:
— Калі Санта зьявіцца менавіта цяпер, усё яшчэ можа абысьціся.
Мы выбягаем з хаткі, каб знайсьці добрага старога Санту. Ён сядзіць у прыпаркаванай за дрэвам машыне і пацірае рукі, каб сагрэцца.
— Добры вечар! — басам гундосіць ён.
— Твой выхад, Санта, — кажу я.
— Няма праблемаў, — згаджаецца той.
Я бегма вяртаюся ў хатку. Праз момант рэзка расчыняюцца

дзьверы. Джоэл заўважае, што ёсьць шанец уцячы, выкараскваецца з-пад лаўкі і кідаецца да дзьвярэй. Акурат у гэты момант у іх зьяўляецца Санта. Ад нечаканасьці Джоэл, пасьлізнуўшыся, ледзь ня падае.
— Хо-хо-хо! — кажа Санта.
— Пастаў іх побач, — упрошвае Бэры. — Я не магу іх разам злавіць у кадар.
Санта робіць крок да Джоэла. Джоэл спалохана адступае.
— Ён так стаміўся, што ўжо нічога не разумее, — праз зубы шэпча Элейн.
— Лепшага за Санту нікога няма! — крычу я як мага гучней, каб настроіць усіх толькі на добрае.
— Яны быццам у розных пакоях, — роспачна шэпча Бэры. — Джоэл! А можа, у барадзе ў Санты жыве мышка? Ня хочаш яе пашукаць?
— Я не магу на гэта глядзець, — кажа Элейн.
— Я так стаміўся, Санта, — Джоэл умольна глядзіць на яго, спадзеючыся, што ўжо хто-хто, але Санта можа спыніць гэтае вар'яцтва.
— Мы цябе любім, Санта! — верашчу я.
Аднойчы Рэндзі Ньюмана папрасілі расказаць пра ягоную песьню «Я люблю глядзець на тваю ўсьмешку» — гукавую дарожку да фільму «Бацькі».
— Яна прынесла мне найбольшы прыбытак, — сказаў ён. — Я змог наняць сваім дзецям няньку. Такім чынам, фільм пра тое, як быць добрымі бацькамі, яшчэ больш аддаліў мяне ад дзяцей.
З гэткімі думкамі ў галаве я спрабую прымусіць ушчэнт змучанага Джоэла падысьці да Санты, каб у Бэры атрымаўся добры здымак для майго артыкулу і я змог заплаціць няньцы Джоэла за наступныя два месяцы. Потым я паціскаю плячыма — цяпер позна што-кольвек мяняць — і прапаную Джоэлу знайсьці ў барадзе Санты мышку.
— Нарэшце спакой і цішыня! — кажа Джоэл, кладучыся ў ложак у нашай драўлянай хатцы.
— Цудоўны быў Санта, праўда? — пытаюся я, спрабуючы ацаніць сур'ёзнасьць эмацыйнай траўмы, нанесенай Джоэлу за апошнюю гадзіну. Санта насамрэч быў цудоўны: не зьбянтэжыўся ў агульным хаосе і ідэальна справіўся з роляй. Неўзабаве Джоэл ужо тлумачыў Санту, што ў ягонай спальні два постэры з Гары Потэрам, і Санта лёгка зразумее, дзе

пакінуць падарункі. Але цяпер, перад сном, Джоэл думае пра іншае. Ён успамінае аднаклясьніка, забіяку і задзіру. За два дні да нашага ад'езду той пакрыўдзіў Джоэла. Джоэл раптам садзіцца ў ложку і кажа:
— Мяне чакае жудаснае жыцьцё.
У мяне перахоплівае дыханьне.
— Не, — супакойваю яго я. — У цябе будзе жыцьцё бы ў казцы. Ведаеш чаму?
— Чаму?
— Таму што ты разумны і вясёлы. А ў разумных і вясёлых людзей жыцьцё заўжды бы ў казцы.
Джоэл нясьмела, але з надзеяй усьміхаецца. Да дзьвярэй нячутна падыходзіць Элейн.
— А ведаеш, — дадаю я, акрылены посьпехам, — каго чакае жудаснае жыцьцё? Кепскіх хлопчыкаў! Гэта ў іх пасьля школы будзе жудаснае жыцьцё, а ў такіх мілых і добрых людзей, як ты, яно будзе казачнае і шчасьлівае. І ў ім ніколі ня здарыцца нічога дрэннага.
— Праўда? — пытаецца Джоэл.
— Так, — адказваю я. — Усё дрэннае здараецца з кепскімі хлопчыкамі.
— Ніколі ў жыцьці ня чула больш ідыёцкага ўроку жыцьцёвай мудрасьці! — разьюшана крычала пазьней Элейн.
— А што такога?
— Па-першае, Джоэл не атрымае жыцьцё бы ў казцы аўтаматычна. А магчыма, яно будзе толькі горшае праз твае пустыя абяцанкі!
— О божа! — кажу я, няжартам спужаўшыся. — Але ён забудзе мае словы, праўда?
— А кепскія хлопчыкі не атрымліваюць аўтаматычна жудаснае жыцьцё, — дадае Элейн. — Ты прышчапляеш Джоэлу скажоныя ўяўленьні пра сьвет, а гэта можа толькі павялічыць ягоныя расчараваньні! Ты вучыш яго хаваць галаву ў пясок!
Да нараджэньня Джоэла я меў пэўнае ўяўленьне пра бацькоўства: мы з сынам едзем па трасе на машыне, паглядаем адзін на аднаго і ўсьміхаемся. І ўсё. Цяпер я заўважаю, што ў гэтым вобразе бракуе дыялёгу. Я ня меў ніякага ўяўленьня, пра што мы маглі б гутарыць. У маім бачаньні ніводзін з нас не казаў і не рабіў нічога, баючыся сапсаваць настрой іншаму. Джоэл такі ўзрушаны, што ня можа заснуць. Мы з Элейн і Бэры

сядзім перад камінам, п'ём каньяк. Джоэл скача вакол нас.
— Ідзі ў дупу, — пяе ён хрыпатым голасам.
— Пітэр, С'юзан, Эдмунд і Люсі ў Нарніі не гаварылі «ідзі ў дупу», — кажу я.
— З гумарам у цябе парадак, — адзначае Бэры, бацька чацьвярых дзяцей, — а вось з падтрыманьнем дысцыпліны праблемы.
— Ты праўда лічыш, што ў мяне добрае пачуцьцё гумару? — я не хаваю задавальненьня.
— Так, — пацьвярджае ён.
— Ты так кажаш, нібы добрае пачуцьцё гумару — гэта вельмі мала.
Бэры глядзіць на мяне, каб пераканацца, што я жартую. Калі ж ён разумее, што я ўсур'ёз, у ягоных вачах зьяўляецца шкадаваньне, і Бэры больш не заводзіць гутарку пра мае бацькоўскія здольнасьці.
Наступнага дня мне на мабільны тэлефануе маці. Яна пытаецца, ці падабаецца нам у Ляпляндыі, і паведамляе, што яны вырашылі чарговы раз зьмяніць канцэпцыю карціны і ўжо дамовіліся з мастаком. Замест таго каб гутарыць са знакамітасьцямі, Ронсаны будуць разносіць ім напоі. Гэта ўсё-такі гатэль.
— Такім чынам, я застыну ў часе ў пачцівым паклоне перад Барысам Ельцыным?
— І столькі пакутаў — усяго празь нейкую карціну, ліха на цябе! — кажа маці.
Ці можна сказаць пра карціну «нейкая»? Карціны, як і фатаграфіі, застаюцца і пачынаюць жыць уласным жыцьцём. Людзі, увасобленыя на іх, больш сабе не належаць. Яны становяцца такімі, якімі іх бачаць мастак, фатограф ці глядач. Я кажу маці, што мы пагаворым пра гэта дома, і вешаю слухаўку.
Каля стала Бэры гатуе каву. Ён занепакоена бурчыць, што ў яго няма ніводнага добрага кадра Джоэла з Сантам. Калі па нас прыяжджае Сэмі, Бэры цікавіцца, ці кампанія можа зладзіць для нас яшчэ адну сустрэчу з Сантам, гэтым разам больш прадуманую.
Сэмі заклапочана моршчыць лоб.
— Але гэта ўжо ня будзе сапраўдны Санта, — кажа ён.
— А то… — пачынаю я.

— Добра, добра, — Сэмі абрывае маё наступнае пытаньне. Ён неахвотна згаджаецца знайсьці Санту і арганізаваць сустрэчу зь ім заўтра на аленевай фэрме.
Наступныя дваццаць чатыры гадзіны мы правялі цудоўна: каталіся на сабаках, пілі аленевы булён у лясной хатцы. Дзень завяршыўся паездкай на сьнегаходзе праз замерзлае возера. Джоэл сядзіць разам з Сэмі — за гэты дзень Сэмі проста прычараваў сына. Раніцай Сэмі адводзіць нас на аленевую фэрму. Мы з Джоэлам садзімся ў санкі, і алень нясецца па полі. Сьнег з-пад капытоў ляціць Джоэлу ў твар.
— Хо-піць! — Джоэл люта глядзіць на нас з аленем, нібы хоча сказаць, што мы гэта знарок супраць яго змовіліся.
Я выціраю сьнег з тварыка Джоэла.
— Мяне чакае жудаснае жыцьцё, — кажа Джоэл.
Сын фэрмэра, які крыху размаўляе па-ангельску, падчас ланчу зьнікае. Хутка ён вяртаецца — пераапрануты Сантам. Санта атрымаўся высокі, худы і пахмурны.
— Глядзі, Джоэл! — кажа Бэры і ўзьнімае камэру. — Во хто прыйшоў! Што скажаш?
— Дабрыдзень ізноў, Санта! — радасна сьмяецца Джоэл. — Я ня ведаў, што ты яшчэ да мяне прыйдзеш.
Санта раздражнёна хітае галавой.
— Цікава, а ці бегае ў Сантавай барадзе мышка? — пытаецца Бэры.
— Я такі рады бачыць цябе! — кажа Джоэл.
Санта маўкліва складае рукі на грудзях і няўпэўнена паляпвае рукавіцамі па сваім футры.
— Санта, — устрывожана пытаецца Джоэл, — у цябе нешта здарылася?
— Санта перажывае за сваіх аленяў, — кажу я. — Праўда, Санта? Ты прыйшоў наведаць аленяў, бо яны прастудзіліся, і ты непакоісься.
Санта штосьці буркае. Бэры атрымлівае выдатны здымак Джоэла з Сантам.
Праз суткі мы вярнуліся ў Лёндан. Франчэлі, Джоэлава нянька, карміла ката. Джоэл забег у дом.
— У нашай хатцы ў лесе, — закрычаў ён ад дзьвярэй — было аж два туалеты!
— Праўда? — зьдзіўляецца Франчэлі.
— Цэлых два! — задаволена пацьвердзіў Джоэл.

Праходзіць месяц за месяцам. Раз-пораз бацька тэлефануе мастаку, каб пацікавіцца, як там наш сямейны партрэт і калі прыкладна мастак скончыць працу. Часьцей за ўсё мастак увогуле не здымае слухаўку, а калі адказвае, то ляканічна і нездаволена:
— Ужо амаль гатовы.
— Як вы адчуваеце — атрымліваецца? — пытаецца бацька.
— Не хвалюйцеся, — адказвае мастак.
Бацька пачынае хвалявацца.
Канцэпцыя карціны зноў зьмянілася. Маці вырашыла, што напояў мы разносіць ня будзем. Мы будзем гаварыць, а знакамітасьці — слухаць. Усё ж Ронсаны — гаспадары гатэлю.
— То бок ты будзеш штосьці расказваць, — удакладняю я, — а Кенэдзі, Чэрчыль і Гандзі — слухаць?
— А што?
— Нічога, — кажу. — Мне толькі здаецца, што нас могуць ня так зразумець. Нібы мы ставім сябе вышэй за Кенэдзі і…
— Што ты маеш на ўвазе?
— Ды так… Што ты будзеш расказваць Кенэдзі, Гандзі і Чэрчылю?
— Што ў цябе за пытаньні? Нічога. Я нічога ня буду ім расказваць. Гэта карціна.
— Мабыць, бацька будзе казаць сваім гальфістам, колькі разоў ягоная машына была ў рамонце, — дзялюся я сваімі думкамі.
Дзень урачыстай прэзэнтацыі мастацкага шэдэўру надыходзіць нечакана. Аднойчы ўранку зьяўляецца мастак, несучы карціну, захутаную ў белую прасьціну. Ён прытуляе яе да стойкі бару. Мае сямейнікі зьбіраюцца каля карціны і ўсхвалявана чакаюць. Усе глядзяць то на закрытае палатно, то на мастака, спрабуючы штосьці прачытаць на ягоным твары. Ён… як бы гэта сказаць… занепакоены.
— Мушу адразу папярэдзіць, што я цяпер праходжу праз складаны творчы пэрыяд і мае творы ня ўсе разумеюць.
Навісае напружанае маўчаньне.
— Я хацеў сказаць, — тлумачыць ён, — што, магчыма, карціна вам не спадабаецца.
Ронсаны занепакоена пераглядваюцца. Мастак шырокім жэстам здымае прасьціну.
— Вось і партрэт, — кажа ён.
Некаторы час Ронсаны проста моўчкі глядзяць. Потым маці

шэпча: «О божа!» У яе вырываецца прыдушаны стогн, і яна вылятае з пакою. Брат з жонкай на знак салідарнасьці выбягаюць за ёй, ляснуўшы дзьвярыма.
У пакоі застаюцца мастак і бацька. Яны пазьбягаюць глядзець адзін аднаму ў вочы, стаяць, утаропіўшыся ў карціну. Знакамітасьці на ёй выпісаны ўважліва, з душою. Праўда, сярод іх Клінт Іствуд, Роўэн Аткінсан і Джэніфэр Сондэрс, якіх ніхто не замаўляў. Затое няма шмат каго з замоўленых.
Але гэта яшчэ кветачкі. Галоўны сюрпрыз у тым, што сярод старанна ўвасобленых знакамітасьцяў Ронсаны выглядаюць як пародыя на чалавека, агідныя карыкатурныя монстры. Брат нагадвае Франкенштайна. З шыі ў яго тырчыць шруба. Нельга не абурыцца. Бацькоў мастак сьпехам накідаў падобнымі да наркаманаў падчас курсу лячэньня. Я ўвасоблены нязграбным прышчаватым падлеткам у ідыёцкай позе. Але, прынамсі, гэты падлетак хаця б крыху падобны на мяне, чаго ня скажаш пра выявы астатніх Ронсанаў. Да таго ж Ронсаны як карлікі перад знакамітасьцямі: мой брат — Франкенштайн у мініятуры — выглядае з-за пляча Клінта Іствуда. Здаецца, мастак усе гэтыя месяцы ўдасканальваў партрэты знакамітасьцяў, а потым хуценька накідаў Ронсанаў, быццам раптоўна, у ноч перад здачай, яму прыйшла ідэя, як нам адпомсьціць.
— Даруйце, — кажа мастак, гледзячы ў падлогу.
— Мы не зьбіраемся за гэта плаціць, — адказвае бацька.
Павісае доўгае маўчаньне.
— Яна проста ня вельмі рэалістычная, — прымірэнча кажа бацька. Быццам папярэдні варыянт з Ронсанамі, якія падносяць мятны кактэйль Джону Ф. Кенэдзі і Робэрту Мітчэлу, быў больш рэалістычны. Бацька распараджаецца, каб мастак замаляваў Ронсанаў, і пасьля працяглых перамоваў той згаджаецца. Маці ён перамалёўвае ў Вудзі Алена. Вось дзе сапраўдная зьнявага: лёгкі ўзмах пэндзля — і вось вам Вудзі Ален! Бацька стаў Джымі Картэрам. Мне падаецца, што мастак выбраў Джымі Картэра, славутага міратворцу, каб аддаць належнае бацькавай дыпляматыі — ён адзіны з Ронсанаў ня вылецеў з пакою. Брат ператварыўся ў Дэвіда Ракфэлера, ягоная жонка — у Гэнры Кісынджэра, што я асабіста расцэньваю як помсту. Адзіны Ронсан, што застаўся на партрэце, як ні дзіўна, — я.
Карціна цяпер вісіць у пакоі для адпачынку побач з кавярняй у

бацькоўскім гатэлі і нязьменна прыцягвае ўвагу наведнікаў. Яны зьбіраюцца каля карціны і адгадваюць, хто ёсьць хто.
— А вось Кенэдзі!
— Глядзі, Джэніфэр Сондэрз!
Ніхто не пазнае Дэвіда Ракфэлера. І я заўсёды падказваю: «Гэта Дэвід Ракфэлер».
— А, Дэвід Ракфэлер, — паўтараюць яны.
На маё падабенства яны глядзяць у поўнай разгубленасьці, часам хвілінамі, і намагаюцца здагадацца, хто ж я такі.
— Пісьменьнік, — кажу я.
Але яны толькі паціскаюць плячыма.
Законы фізыкі сьцьвярджаюць, што трэба быць вельмі асьцярожным, набліжаючыся да зоркі. Калі траекторыя і хуткасьць такія, як трэба, трапляеш на арбіту, цэлы і здаровы, і грэесься ў цудоўным зоркавым сьвятле. Калі ж хоць адна памылка — у кірунку ці хуткасьці, — налятаеш наўпрост на зорку і выпарваесься. Застаецца толькі зорка.
Я захаваў нумар зь ляпляндзкай фатаграфіяй Джоэла на вокладцы. На выпадак, калі Джоэл раптам праз шмат гадоў захоча на яе паглядзець. Калі я пільна ўзіраюся ў здымак, мне здаецца, што вочы Джоэла, хоць ён і ўсьміхаецца, блукаюць недзе далёка-далёка. Я гляджу на карціну ў гатэлі, на фатаграфію са сьнежнай Ляпляндыі — і разумею, што больш ніколі не змагу напісаць пра Джоэла.
Пераклала з ангельскай Кацярына Ермакова
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2007/03/03
[image]

[image] [image] [image]

ЮРЫ ЧАВУСАЎ

Юры Чавусаў Раяль у кустах культурнай дыпляматыі

сучасны брытанскі пісьменьнік, журналіст і сцэнарыст. Жыве ў Лёндане.

Polska i Białoruś po rozszerzeniu Unii Europejskiej — Беларусь і Польшча пасля пашырэння Еўрапейскага Саюза / Pod redakcją Macieja Krzysztofowicza. — Warszawa: Polski Instytut Spraw Międzynarodowych, 2005. — 234 s.

Колькасьць навуковых публікацыяў, прысьвечаных беларускай замежнай палітыцы, пакуль надзіва невялікая для незалежнай краіны, што прэтэндуе на ўласную актыўную пазыцыю на сусьветнай арэне. Застаюцца адзінкавымі нават дасьледаваньні двухбаковых стасункаў з найбліжэйшымі суседзямі. Недастатковае асьвятленьне беларускай замежнай палітыкі тлумачыцца і тым, што сама яна вельмі доўга была ў летаргічным сьне.

Але пры ўсёй беднасьці беларускага дыпляматычнага жыцьця краіна мусіць шукаць адказы на пэўныя пытаньні замежнай палітыкі. Сярод іх — пашырэньне Эўразьвязу і стасункі з найбліжэйшымі суседзямі ў гэтым кантэксьце. Згаданай праблеме і прысьвечаны зборнік «Polska i Białoruś po rozszerzeniu Unii Europejskiej — Беларусь і Польшча пасьля пашырэньня Эўрапейскага Саюзу». У апублікаваных артыкулах пераважна дасьледуецца дынаміка беларуска-польскіх стасункаў у сьвятле далучэньня Польшчы да Эўразьвязу і

актыўная палітыка польскага боку ў пытаньні дачыненьняў паміж Рэспублікай Беларусь і Эўразьвязам. Экспэрты з абедзьвюх краінаў дасьледуюць сродкі ўзьдзеяньня на Беларусь у арсэнале эўрапейскай палітыкі. Таксама пільная ўвага надаецца інтэграцыі Беларусі з Расейскай Фэдэрацыяй: ці можна гэты працэс параўнаць з інтэграцыяй у Эўразьвязе, і якое значэньне мае для Беларусі партнэрства паміж Эўразьвязам і Расейскай Фэдэрацыяй?

Выданьне сталася прамежкавым вынікам рэгулярнай сумеснай працы Польскага інстытуту міжнародных справаў і Цэнтру міжнародных дасьледаваньняў Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. У ім падсумаваныя матэрыялы двухбаковай навуковай канфэрэнцыі, што адбылася ў чэрвені 2004 г. у Камянецкім раёне. Зборнік зьявіўся ў час, калі Польшча ўжо ўвайшла ў Эўразьвяз і праводзіць у ягоных межах адмысловую палітыку ў дачыненьні да Беларусі, а таксама прымае надзвычай актыўны ўдзел у вайсковых місіях НАТО.

Хоць канфэрэнцыя адбылася толькі празь месяц па ўступленьні Польшчы ў Эўразьвяз, у артыкулах зборніка ўлічваецца пазьнейшы ўплыў сяброўства Польшчы ў Эўразьвязе на беларуска-польскія стасункі — большасьць аўтараў апэруюць зьвесткамі за другую палову 2004 г. Такім чынам, канфэрэнцыя была толькі зыходным пунктам для досьледаў.

Аўтары належаць выключна да беларускай і польскай акадэмічнай супольнасьці. Аднак падаецца, што надалей не пашкодзіла б пашырыць поле дасьледаваньняў і прыцягнуць да сумеснай працы прадстаўнікоў іншых экспэртных асяродкаў, а магчыма, і дасьледчыкаў зь іншых краінаў — менш ангажаваныя, яны маглі б разгледзець тэму ў іншым ракурсе.

Адзначым удала абраны моўны фармат выданьняў. Абсалютна ўсе тэксты пададзеныя ў двух варыянтах — па-польску і па-беларуску. Аднак моўнае самавызначэньне яшчэ не азначае ўсьведамленьня ўласнай суб'ектнасьці. Як сувэрэнны суб'ект са сваімі інтарэсамі і дактрынай Рэспубліка Беларусь у гэтым зборніку амаль не фігуруе. Большасьць прапанаваных дасьледаваньняў яднае тое, што Беларусь «зьмяшчаецца ў кантэкст», разглядаецца як аб'ект узьдзеяньня вонкавых

чыньнікаў (пераважна — эўрапейскіх і расейскіх). Гэта лёгка патлумачыць «летаргічнай» пазыцыяй краіны на міжнароднай арэне. Але патлумачыць — ня значыць дараваць хібнасьць падобнага стану, хібнасьць ня столькі дасьледчыкаў, колькі саміх дзейных асобаў, што выступаюць ад імя Беларусі ў сьвеце. Як бы там ні было, але цяпер беларуская дзяржава — самастойны, сувэрэнны суб'ект міжнародных дачыненьняў, і яе палітыка на міжнароднай арэне вызначаецца ня толькі *фактарамі*, але і *інтарэсамі*.

У прынцыпе, кніга магла б называцца «Беларусь і Польшча пасьля пашырэньня Эўрапейскага Саюзу… у цяні Расеі» — надзвычай шмат увагі надаецца расейскаму фактару. Зразумела, для польскіх дасьледчыкаў ён значна больш інтрыгоўны і відавочна цікавейшы з навуковага гледзішча. Але ж беларускія аўтары трактуюць яго як вонкавы, што пацьвярджае іх беларускае самавызначэньне.

Надзвычай цікава аналізуюцца ўнутраныя беларускія і вонкавыя перадумовы беларуска-польскіх дачыненьняў. Пры гэтым, на жаль, па-за ўвагай аўтараў застаўся ўплыў унутрыпольскай палітыкі на дачыненьні зь Беларусьсю. А ў гэтай сфэры можна знайсьці шмат цікавага. Варта было б згадаць асаблівае стаўленьне Анджэя Лепэра да Лукашэнкі і стварэньне вобразу Лукашэнкі на старонках польскай прэсы. Заслугоўваў бы на ўвагу і выхад беларускай праблематыкі на адно зь першых месцаў у польскай унутранай палітыцы, асабліва падчас выбарчых кампаніяў 2005 г. у Польшчы (адначасова з канфліктам вакол Саюзу палякаў у Беларусі). Застаецца толькі здагадвацца, ці то дасьледчыкі не заўважылі актуальнасьці беларускага пытаньня, ці, наадварот, заўважылі і паспрабавалі не закранаць занадта вострай і гарачай праблемы.

Недастаткова раскрытая і роля польскай палітычнай эліты ў выпрацоўцы пазыцыі Эўразьвязу па Беларусі. А менавіта польскім палітыкам разам зь нямецкімі і літоўскімі цяпер належыць надзвычай важнае месца ў гэтай галіне. Вельмі цікава было б дасьледаваць польскі ўплыў на палітыку Эўразьвязу па Беларусі ў кантэксьце яго сутыкненьня зь

нямецка-расейскім праектам (шмат у якіх кірунках ён і цяпер дамінуе ў Брусэлі). Роля эўрапейскіх праектаў у разьвіцьці дэмакратыі і грамадзянскай супольнасьці, візавыя абмежаваньні і пагрозы эканамічных санкцыяў таксама засталіся на пэрыфэрыі ўвагі дасьледчыкаў.

Тэрміны кшталту «міжнародная ізаляцыя Беларусі» ўжываюцца пераважна польскімі ўдзельнікамі — беларускія аўтары больш асьцярожныя ў выбары азначэньняў і ўвогуле схільныя абмінаць вострыя тэмы. Але падобная абачлівасьць кампэнсуецца тым, што ўкладальнікі імкнуліся разгледзець праблемы зь дзьвюх пазыцыяў — беларускай і польскай. Асабліва цікавыя акурат паралельныя дасьледаваньні абраных тэмаў экспэртамі з абедзьвюх краінаў: пра сыстэмныя перадумовы дапамогі ЭЗ для Беларусі, плян дзеяньняў Эўразьвязу для Беларусі, беларуска-польскае памежжа, беларускую меншасьць у Польшчы.

У зборніку «Беларусь і Польшча пасьля пашырэньня Эўрапейскага Саюзу» прапанаваныя некалькі вялікіх тэматычных блёкаў. Але адкрывае яго праграмны артыкул Адама Эбэргарта. У ім дасьледуюцца чыньнікі, што ўплываюць на пазыцыю Беларусі ў агульнаэўрапейскай палітыцы. Аўтар адзначае, што за апошнія гады самаізаляцыя Беларусі ў эўрапейскай прасторы ўзмацнілася пад уплывам як вонкавых, гэтак і ўнутраных фактараў. Сярод першых — далучэньне суседзяў Беларусі да Эўразьвязу і выпрацоўка асноваў эўрапейскай палітыкі добрасуседзтва, а таксама аслабленьне беларуска-расейскай інтэграцыі і зьмяншэньне значэньня Беларусі для расейскай палітыкі за прэзыдэнтам У. Пуціным. Да другіх можна аднесьці далейшы рух палітычнай сыстэмы Беларусі да аўтарытарызму і макраэканамічную палітыку ўладаў. А. Эбэргарт сьвядома не адзначае сярод вонкавых фактараў уплыву Злучаных Штатаў. Беларусь цяпер ня толькі не выконвае ролі пасярэдніка паміж Эўразьвязам і Расейскай Фэдэрацыяй, але нават практычна ня ўдзельнічае ў міжнародных справах кантынэнту. У заключэньні А. Эбэргарт засьведчыў працяглы крызіс у замежнай палітыцы рэжыму А. Лукашэнкі і спрагназаваў узмацненьне санкцыяў з боку Эўразьвязу і Злучаных Штатаў. Аўтар тлумачыць гэта

захаваньнем аўтарытарнай сыстэмы, а таксама архаічнай, адрознай ад іншых краінаў кантынэнту, эканамічнай мадэлі. А. Эбэргарт робіць выснову, што дэмакратычныя і рынкавыя пераўтварэньні ў Беларусі непазьбежныя, бо краіна ня можа доўга заставацца ў баку ад працэсаў супрацоўніцтва і інтэграцыі ў Эўропе.

У працяг зададзенай А. Эбэргартам тэмы чыньнікі, што абумоўліваюць беларускую замежную палітыку, дасьледуюцца ў артыкулах пра трохкутнік ЭЗ—РФ—РБ. А. Ціхаміраў робіць агляд сучасных беларуска-расейскіх дачыненьняў, асабліва ў эканамічнай галіне, а таксама ў вайсковай і культурна-інфармацыйнай. Аўтар скептычна ставіцца да пэрспэктываў беларуска-расейскай інтэграцыі і прагназуе ўмацаваньне сувэрэнітэту бакоў. Ён адзначае, што Польшча цяпер мае шанец стаць экспэртам у беларускім пытаньні ў Эўразьвязе і мяркуе, што разьвіцьцё сувязяў з Польшчай дапаможа нашай краіне захаваць свой дзяржаўны сувэрэнітэт. У. Снапкоўскі ўсьлед за А. Эбэргартам дасьледуе чыньнікі, што ўплываюць на разьвіцьцё стасункаў Беларусі з Расеяй і Эўразьвязам. Ён заўважае, што хоць пазыцыі Расеі і Эўразьвязу ў беларускім пытаньні зьбліжаюцца, але сапраўднай праверкай для пазыцыі Расеі ёсьць стаўленьне да палітычных кампаніяў у Беларусі.

Асобным блёкам падаюцца тэксты, прысьвечаныя пляну дзеяньняў для Беларусі, эўрапейскай палітыцы добрасуседзтва датычна Беларусі і сыстэмным перадумовам дапамогі Эўразьвязу Беларусі. Э. Выцішкевіч і У. Улаховіч прапаноўваюць надзвычай цікавы матэрыял пра эфэктыўнасьць палітычных сродкаў узьдзеяньня на Беларусь з боку Эўропы. Аўтары характарызуюць канцэпцыю Вялікай Эўропы і пляны дзеяньняў у яе межах, а таксама падсумоўваюць падставы эўрапейскай палітыкі добрасуседзтва. Пры гэтым месца беларускай дзяржавы ў плянах ЭЗ фактычна выглядае вакантным: без рэформы беларускай палітычнай сыстэмы эўрапейскія структуры будуць мець дачыненьне з *адміністрацыяй тэрыторыі*, а не зь *дзяржаўнай уладай* — роўнабаковых стасункаў тут не прадугледжваецца. Доўгатэрміновая мэта Эўразьвязу датычна Беларусі — зьмяніць гэты ненармальны статус і ператварыць нашу краіну ў

дэмакратычнага, стабільнага і раўнапраўнага партнэра, зь якім Эўразьвяз будзе мець ня толькі супольную мяжу, але і супольную праграму дзеяньняў, заснаваную на супольных каштоўнасьцях. Э. Выцішкевіч пераканаўча тлумачыць, што ў найбліжэйшыя гады наўрад ці зьявіцца адмысловы плян дзеяньняў для Беларусі, і тлумачыць гэта пераважна пазыцыяй беларускага рэжыму. Дасьледчык чакае ад Эўразьвязу не пашыраных эканамічных абмежаваньняў альбо скарачэньня і без таго мізэрнай дапамогі, а г. зв. мэтавых санкцыяў (*targeted sanctions*). У. Улаховіч прымярае для Беларусі розныя сцэнары і мадэлі дзеяньняў у межах эўрапейскай палітыкі добрасуседзтва, аналізуючы іхны магчымы ўплыў у розных грамадзкіх сфэрах.

Артыкулы М. Часноўскага і асабліва М. Крыштафовіча пра сыстэмныя перадумовы дапамогі Эўразьвязу Беларусі надзвычай цікавыя для беларускага чытача. Яны аналізуюць прынцыповыя падыходы эўрапейскіх структураў менавіта да беларускага пытаньня — з адказам на іх афіцыйнага Менску. Артыкул М. Часноўскага вельмі карысны тым, што ў ім выкладаецца афіцыйная палітыка беларускага МЗС што да пазыцыі Эўразьвязу, нават праз такі выкшталцоны аксюмаран, як «сёньняшняя геапалітычная ўнікальнасьць Беларусі — зьява часовая» (нонсэнс з пункту гледжаньня клясычнай геапалітыкі). Некаторыя выказваньні аўтара зробленыя дакладна паводле шаблёну афіцыйных заяваў беларускага лідэра: «Ва ўзаемаадносінах з Эўрапейскім Саюзам Беларусь гатовая ісьці так далёка, наколькі ЭС у стане рухацца насустрач» (цікава, а як гэта сумяшчаецца з аналягічнай тэзай прэзыдэнта датычна Расейскай Фэдэрацыі?). М. Часноўскі крытыкуе Брусэль за палітызацыю эканамічнага супрацоўніцтва зь Беларусьсю і скарачэньне тэхнічнай дапамогі па лініі праграмы TACIS. Варта адзначыць, што прагноз аўтара наконт нармалізацыі стусункаў з Эўропай празь беларуска-польскае супрацоўніцтва аказаўся памылковым.

Артыкул М. Кшыштафовіча важны і карысны тым, што прапаноўвае аб’ектыўную ацэнку вопыту эўрапейскай тэхнічнай дапамогі ў пэрыяд да 2003 г. Аўтар адзначае малаэфэктыўнасьць гэтай праграмы ў постсавецкіх краінах

увогуле і ў Беларусі ў прыватнасьці. (Аднак заўважым, што з 2003 г. сытуацыя істотна пагоршылася: зьявіліся крымінальныя справы паводле фактаў выкарыстаньня грошай з праграмы тэхнічнага супрацоўніцтва TACIS, на чатыры няўрадавыя арганізацыі, што працавалі ў межах праграмы, накладзеныя эканамічныя санкцыі за нявыплату падаткаў з атрыманых ад Эўракамісіі сродкаў.) Дасьледчык перакананы, што дапамога Эўразьвязу — толькі адзін са складнікаў праграмы супрацоўніцтва і добрасуседзтва. І калі няма самога добрасуседзтва — ніякая дапамога ня будзе мець істотнага значэньня для дэмакратызацыі і рэформаў.

Непасрэдна двухбаковыя стасункі Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Польшча ў зборніку займаюць невялікае месца. Асабліва цікавыя ў гэтым блёку дасьледаваньні А. Скарупскай і М. Масюкова пра стан беларускай меншасьці ў Польшчы. Але чамусьці не зьвяртаецца ўвага на польскую меньшасьць у Беларусі. Аднак канфлікт беларускіх уладаў з новым кіраўніцтвам Саюзу палякаў і наступнае «прызначэньне» новага старшыні гэтай арганізацыі — гэта «раяль», які цяжка схаваць у кустах «культурнай дыпляматыі».

Эўразьвяз хоць марудна і непасьлядоўна, без стратэгічнага пляну, але ўсё ж рэалізуе хоць нейкую палітыку ў дачыненьні да Беларусі. Аднак для беларускай адміністрацыі Эўразьвяз застаецца толькі рынкам, на якім нашыя нафтаперапрацоўчыя заводы прадаюць паліва. Зь іншага боку, для Эўразьвязу цяпер беларуская праблема трывала ўвайшла ў парадак дня. Для беларускай жа дзяржавы адсутнасьць выразнай актыўнай, адпаведнай нацыянальным інтарэсам пазыцыі ў дачыненьні да Эўразьвязу і нашых найбліжэйшых суседзяў папросту ганебная. Эўразьвяз, насуперак сьцьверджаньням аднаго з артыкулаў зборніка, застаецца і для Беларусі, і для беларусаў усяго толькі абстракцыяй. Эўразьвяз — суб'ект, які можа мець палітыку ў дачыненьні да Беларусі, але якая яна будзе — залежыць ад самой Беларусі.
[image]
[image]

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2007/03/03
[image]